Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 15 лістапада 1985 г. № 46 (3300) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.



Забяспечваць усямернае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, паўсюднае прымяненне яго вынікаў у вытворчасці і кіраванні, сферы абслугоўвання і ў быце.

(З праекта Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года).

Эканамічны эфект ад укаранення навуковых распрацовак НДІ Беларускага рэспубліканскага навукова-вытворчага аб'яднання парашковай металургіі склаў у 11-й пяцігодцы некалькі дзесяткаў мільёнаў рублёў.

Ідзе эксперымент. Яго праводзяць старшы інжынер В. САФРОНАЎ і загадчык аддзела У. ЧАКАН.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ІДЭІ І ПЛАНЫ ПАРТЫІ — У МАСЫ

З вялікім натхненнем сустрэлі савецкія людзі адобраныя на кастрычніцкім Пленуме ЦК КПСС і вынесеныя на ўсенароднае абмеркаванне дакументы гістарычнай важнасці — праекты новай рэдакцыі Праграмы КПСС, змяненняў у Статуце КПСС, Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.

Па рашэнню ЦК Кампартыі Беларусі ў раёны рэспублікі накіроўваюцца дакладчыкі і прапагандысцкія групы ЦК КПБ, якія выступяць перад ідэалагічным актывам, у працоўных калектывах з лекцыямі і дакладамі па гэтых важных дакументах.

У Цэнтральным Камітэце Кампартыі Беларусі 13 лістапада адбылася інструктыўная нарада дакладчыкаў і членаў прапагандысцкіх груп. Яны праслухалі лекцыі: «Праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС — творчае развіццё марксізму-ленінізму», «Эканамічная стратэгія партыі на сучасным этапе», «Пытанні знешняй палітыкі ў праекце новай рэдакцыі Праграмы КПСС». Лекцыі прачыталі—загадчык сектара Міжнароднага аддзела ЦК КПСС Д. А. Лісаволік, доктар гістарычных навук, прафесар АГН пры ЦК КПСС Г. В. Петракоў, галоўны спецыяліст Дзяржаўнага камітэта СССР па навуцы і тэхніцы Л. І. Пятрэнка. На нарадзе выступіў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

БЕЛТА.

ДНІ САВЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

У Чэхаславакіі пачаліся Дні савецкай культуры. Гэта свята мастацтва СССР прысвечана 40-годдзю Перамогі над фашызмам і 68-й гадавіне Вялікага Кастрычніка.

На ўрачыстым адкрыцці Дзён культуры СССР прысутнічалі Генеральны сакратар ЦК КПЧ, прэзідэнт ЧССР Г. Гусак, член Прэзідыума ЦК КПЧ, Старшыня ўрада ЧССР Л. Штроугал, іншыя чэхаславацкія кіраўнікі, афіцыяльная савецкая дэлегацыя на чале з кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, міністрам культуры СССР П. Н. Дземічазым.

Пасланцоў Краіны Саветаў сардэчна вітаў сакратар ЦК КПЧ Й. Гаўлін які падкрэсліў сусветна-гістарычнае значэнне перамогі Савецкага Саюза над гітлераўскім фашызмам, мацнеючай дружбы і брацтва паміж народамі СССР і ЧССР.

У слове ў адказ П. Н. Дземічаў падкрэсліў, што савецкія людзі даражаць дружбай з брацкім чэхаславацкім народам. З году ў год, сказаў ён, шырацца і ўмацоўваюцца нашы сувязі і абмен плённым вопытам ва ўсіх сферах: партыйным і дзяржаўным будаўніцтве, палітыцы і ідэалогіі, эканоміцы, навуцы і культуры. Савецка-чэхаславацкае супрацоўніцтва з'яўляецца сапраўдным узорам і прыкладам ноўзага тыпу міждзяржаўных адносін. Трывалы фундамент нашай дружбы — ідэйна-палітычнае адзінства камуністычных партый Савецкага Саюза і Чэхаславакіі, прынцыпы марксізму-ленінізму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

Праграму Дзён савецкай культуры адкрыла балетная трупа Вялікага тэатра Саюза ССР спектаклем «Залаты век» на музыку Д. Шастаковіча.

ТАСС.

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА «СЛОВУ»

Неўміручым помнікам старажытнарускай літаратуры, сведчаннем высокай культуры юнай Русі па праву называюць «Слова аб палку Ігаравым». Восем стагоддзяў прайшло з часу яго напісання, далёкім мінулым сталі дзеянні яго герояў, але па-ранейшаму знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў высокая паэтычная энергія «Слова», яго патрыятызм і гуманізм. Гэты геніяльны твор меў велізарнае значэнне для ўсіх славянскіх літаратур, у тым ліку і беларускай. Аб гэтым гаварылі ўдзельнікі навуковай канферэнцыі аддзялення грамадскіх навук АН БССР, прысвечанай 800-годдзю «Слова аб палку Ігаравым». Яна адбылася 12 лістапада ў Мінску.

Адкрыў канферэнцыю віцэ-прэзідэнт АН БССР акадэмік І. Я. Навуменка. Аб ролі і месцы «Слова» ў гісторыі сусветнай культуры, яго моўных асаблівасцях, уплыве на славянскае вершаскладанне, вобразны лад паэзіі гаварылі на канферэнцыі доктар філалагічных навук М. Г. Булахаў, член-карэспандэнт АН БССР А. І. Жураўскі, іншыя вучоныя.

БЕЛТА.

СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ

Ужо стала традыцыяй у жыцці Мінска пачынаць кожную паэтычную вясну каля помніка народнаму песняру Янку Купалу. На сустрэчы з пісьменнікамі прыходзяць тысячы аматараў кнігі. Гучыць паэтычнае слова таксама ў парках імя Горкага, Чалюскінцаў, на тэматычных вечарах у клубах, літаратурна-музычных гасціных, на занятках ва універсітэтах культуры. І не выпадкова — Мінская гарадская арганізацыя таварыства аматараў кнігі аб'ядноўвае некалькі тысяч членаў. Многія зарэкамендавалі сябе рупнымі прапагандыстамі кнігі.

Як зрабіць гэты важны напрамак ідэалагічнай дзейнасці яшчэ больш эфектыўным, адпавядаючым новым патрабаванням часу — аб гэтым ішла гутарка за «круглым сталом» у Літаратурным музеі Янкі Купалы. У ёй прынялі ўдзел намеснік старшыні рэспубліканскага таварыства аматараў кнігі П. Вераб'ёў, намеснік дырэктара музея Ж. Дапкюнас, загадчыкі сектараў літаратурна-метадычнай і масавай работы Н. Цвірка, М. Чабатарэвіч, сакратары праўленняў раённых арганізацый аматараў кнігі беларускай сталіцы.

Супрацоўнікі музея арганізавалі паказ экспазіцый аб жыцці і дзейнасці народнага песняра, перакананўча раскрылі тыя вялікія магчымасці, якія трэба больш актыўна выкарыстоўваць у прапагандысцкай рабоце з чытачом, далучаючы яго да ідэйна-мастацкіх каштоўнасцей не толькі нацыянальнай літаратуры, але і літаратур братніх рэспублік. Гэта жыццёва абумоўлена таксама стварэннем у г. Мінску аб'яднання музеяў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, П. Броўкі.

П. Вераб'ёў, Ж. Дапкюнас падкрэслілі неабходнасць сумеснага планавання работы арганізацый кнігалюбаў і літаратурных музеяў, каардынацыі іх дзейнасці. На іх думку, мэтазгодна арганізаваць выпуск сумесных метадычных распрацовак аб каштоўнасцях літаратурнай спадчыны, формах прапагандысцкай работы з ёй у шматлікіх чытацкіх аўдыторыях.

Больш ініцыятывы і настойлівасці патрабуе выкарыстанне перасоўных фондаў музеяў, асабліва ў сельскіх раёнах, у рабоце школ, дамоў культуры, клубаў, бібліятэк.

Сакратары праўленняў кнігалюбаў Фрунзенскага раёна А. Верабей, Заводскага — Н. Барысавец, Маскоўскага — Н. Істоміна і іншыя гаварылі аб неабходнасці павышаць творчы ўзровень сумеснай работы на базе літаратурных музеяў.

В. ЗАДАРОЖНЫ.

МАШТАБНАСЦЬ ПЛАНАЎ, ВЕЛІЧ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

УПЭЎНЕНЫ КРОК

Праекты новай рэдакцыі Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года — дакументы велізарнай важнасці, у якіх, між іншым, падкрэсліваецца, што ў сучасных унутраных і міжнародных умовах усебаковы прагрэс савецкага грамадства можа быць забяспечаны шляхам паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэта — стратэгічны курс партыі, накіраваны на якаснае пераўтварэнне ўсіх бакоў жыцця савецкага грамадства, карэннае абнаўленне яго матэрыяльна-тэхнічнай базы на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, удасканалення грамадскіх адносін, глыбокіх перамен у змесце і характары працы.

Новае не вырастае само сабой. Яно вырастае на аснове дасягнутага. Навукова-тэхнічны прагрэс прабівае сабе дарогу ва ўсіх галінах вытворчасці.

У гэтым годзе мне давялося пабываць на многіх прадпрыемствах Мінска і Мінскай вобласці. Многае тут уразіла. Некалькі год назад мы, напрыклад, мелі толькі цьмянае ўяўленне аб парашковай металургіі. Гэта новая прагрэсіўная галіна вытворчасці, за ёй вялікая будучыня. Ужо чатыры гады працуе Беларускае рэспубліканскае навукова-вытворчае аб'яднанне парашковай металургіі. У Маладзечне пабудавана яго вытворчая база. Самыя складаныя вырабы дае гэтае аб'яднанне па ўдасканаленай тэхналогіі. А пачалося ўсё з лабараторных доследаў... Эканомія матэрыялаў і беражлівасць, безадыходная вытворчасць ляжаць у аснове самых складаных вырабаў з металу гэтага вытворчага аб'яднання.

Перакінемся цяпер у другі куток вобласці — Смалявіцкі раён, у Жодзіна, дзе знаходзіцца вядомы на ўсю краіну Беларускі аўтамабільны завод — БелАЗ. Ужо на канвеер пастаўлены 180-тонныя гіганты. Але тэхнічная думка не стаіць на месцы: ідзе распрацоўка 240-тонных БелАЗаў.

А вось яшчэ прыклад. У Пухавіцкім раёне непадалёку ад Рудзенска распачата будаўніцтва першай у Беларусі атамнай ЦЭЦ. На мемарыяльнай дошцы ў цэнтры гэтага прамысловага комплексу так і занатавана: «Тут будзе пабудавана першая ў Беларусі атамная ЦЭЦ». Гэта памятка для нашчадкаў. Успомнім, чым была адметная некалі мясцовасць паміж Рудзенскам і Дукорай? Балоты і пералескі, адвечная багна, дзе і паселішчаў амаль не сустракалася. Гразь, балота і пясок. Усё гэта, кажу, было ў мінулым. Нямала ў савецкі час тут вырасла добраўпарадкаваных вёсак і пасёлкаў, выдатных гаспадарак. А ў дванаццатай пяцігодцы тут стане новы горад. К 2000 году Мінская атамная забяспечыць цяплом і святлом увесь Мінск. А пакуль размова ідзе аб першай чарзе, якая ўступіць у строй у 1989 годзе з магутнасцю ў мільён кілават-гадзін электраэнергіі.

Вось такія крокі нашай эпохі, такія перад намі адкрываюцца далягляды.

Усё, што робіцца сёння ў нашай рэспубліцы, накіравана на ажыццяўленне асноўнага пункту Праграмы: на няўхільнае паляпшэнне ўмоў жыцця і працы савецкіх людзей.

Рыгор НЯХАЙ.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

У творчым аб'яднанні «Летапіс» зняты тры новыя дакументальныя і навукова-папулярныя стужкі «Я іду шукаць», «Эксперымент. Пошукі і праблемы», «У коле Задыяка», прэм'ера якіх адбылася ў Доме кіно. Фільм «Я іду шукаць» пераносіць гледача ў адзін з дамоў па вуліцы Кашавога ў Мінску, дзе ўжо 13 гадоў працуе дзіцячы клуб «Равеснік». Дзеці ахвотна прыходзяць сюды і кожны знаходзіць справу па душы. Адны з іх сталі юнымі сябрамі міліцыі, другія займаюцца ў фотастудыі, трэція — у гуртку «Умелыя рукі». Фільм паставіў па сваім сцэнарыі рэжысёр С. Лук'янчыкаў.

Навукова-папулярная стужка «У коле Задыяка» — своеасаблівы экранізаваны ўрок увядзення ў астраномію, пастаўлены па сцэнарыі І. Яфрэмавай рэжысёрам А. Чакмянёвым. У ім у вясёлай, даступнай дзецям форме пры дапамозе іграўных сюжэтаў і мультыплікацыі (мастакі-мультыплікатары В. Голікаў, В. Дангулава, Н. Іванова) расказваецца пра ўплыў сузор'яў Задыяка на змену пораў года на планеце.

Вялікую цікавасць выклікала стужка «Эксперымент. Пошукі і праблемы» рэжысёра М. Жданоўскага, пастаўленая ім па сцэнарыі, напісаным у саўтарстве з В. Хацяноўскім. Яна працягвае цыкл «Сцяганосцы славы працоўнай», над якім ужо шмат гадоў працуюць беларускія кінапубліцысты.

Кінааператары А. Сіманаў, Ю. Гарулёў і В. Купрыянаў летась вялі назіранне ў цэхах Мінскага камвольнага камбіната, паколькі прадпрыемства ўдзельнічала ў буйнамаштабным эканамічным эксперыменце па ўдасканаленні гаспадарчага механізму.

У дзень прэм'ер адбылася сустрэча гледачоў са стваральнікамі фільмаў. Яны расказалі аб рабоце над стужкамі, падзяліліся творчымі планамі.

І. КРУПЕНЯ.

ПРЭМ'ЕРЫ

Сцэна са спектакля «Фізікі».

Трагікамедыя Ф. Дзюрэнмата «Фізікі» атрымала сцэнічнае ўвасабленне ў Дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга рускім драматычным тэатры імя М. Горкага.

Рэжысёр спектакля — В. Арлоўскі, мастак — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ю. Тур.

Леанард Брайзіл — С. Журавель, Рэкс — А. Шароў.

П'еса англійскага драматурга С. Палякова «Дыск-жакей» («Любімец публікі») пастаўлена ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі.

Рэжысёр спектакля — У. Караткевіч, мастакі — С. Антонаў і Л. Рулёва, кампазітар — С. Бельцюкоў. Пераклад з англійскай мовы А. Асташонка. Ролі выконваюць лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі С. Журавель, А. Шароў, А. Суцкавер і іншыя.

Тэкст і фота Ул. КРУКА.

ВЕДЫ Ў СПАЛУЧЭННІ З ПРАКТЫКАЙ

Чацвёрты год працуе рэспубліканская школа метадыстаў прафсаюзных бібліятэк Беларусі. За гэты час тут прайшлі навучанне дзесяткі маладых спецыялістаў, многія практыкі. Чарговыя заняткі школы адбыліся ў Магілёве на базе бібліятэкі прафкома вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Прапагандысты кнігі праслухалі лекцыі «Магілёў: гісторыя і сучаснасць», «Міжнароднае становішча», «Задачы бібліятэк рэспублікі насустрач XXVII з'езду КПСС і на XII пяцігодку, па прапагандзе і растлумачэнні праектаў новай рэдакцыі Праграмы КПСС, змен у Статуце партыі і Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года».

Аб практыцы работы прафсаюзных бібліятэк Літоўскай ССР па дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС расказвала загадчыца метадычнага аддзела рэспубліканскай базавай бібліятэкі Літсаўпрофа Е. Іванова. З паведамленнямі аб дзейнасці прафсаюзных бібліятэк па маральным, прававым выхаванні працоўных у святле пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму», аб ажыццяўленні «Палажэння аб бібліятэчнай справе ў СССР» выступілі дырэктар базавай бібліятэкі Гомельскага аблсаўпрофа Г. Патапава і намеснік дырэктара базавай бібліятэкі Гродзенскага аблсаўпрофа І. Курылава.

Цікава прайшоў абмен вопытам па прапагандзе Закона аб школьнай рэформе і бібліятэчным абслугоўванні дзяцей, аб практыцы работы бібліятэк па аказанні дапамогі школам камуністычнай працы, у дапамогу працоўным калектывам па пытаннях пасканарэння інтэнсіфікацыі вытворчасці, аб прапагандзе кнігі сярод навучэнцаў ПТВ і інжынерна-педагагічнага складу вучылішчаў.

Слухачы школы зрабілі экскурсію па горадзе на тэму «Магілёў — горад-воін, горад-працаўнік», наведалі і пазнаёміліся з практыкай работы лепшых прафсаюзных бібліятэк магілёўскіх прадпрыемстваў.

М. РОЗУМ.

ВАСІЛЬ БЫКАЎ У БУДАПЕШЦЕ

Творчасць народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава карыстаецца вялікай папулярнасцю ў чытачоў Венгерскай Народнай Рэспублікі. Яны маюць магчымасць пазнаёміцца на роднай мове з такімі яго творамі, як «Альпійская балада», «Круглянскі мост», «Воўчая зграя», «Яго батальён», «Пайсці і не вярнуцца» і іншымі. Аб неаслабнай цікавасці да творчасці В. Быкава сведчаць і інтэрв'ю з ім, надрукаваныя ў час знаходжання пісьменніка ў Будапешце на Культурным форуме дзяржаў — удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Гэтыя інтэрв'ю з'явіліся ў вядучых газетах ВНР — цэнтральным органе Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі «Непсабадшаг», а таксама ў органе Саюза венгерскіх пісьменнікаў штотыднёвіку «Элет эш ірадалом».

Ва ўступе да інтэрв'ю «Непсабадшаг» піша: «Выдатнага прадстаўніка беларускай савецкай літаратуры Васіля Быкава добра ведае венгерская чытацкая публіка... Быкаў прадстаўляе тое пісьменніцкае пакаленне, якое пайшло на фронт са школьнай лаўкі, у якога набытыя на фронце ўспаміны і сфарміраваныя там маральныя прынцыпы вызначаюць увесь творчы шлях». Не выпадкова гэтае інтэрв'ю так і называецца: «Успаміны павінны жыць». Тут жа апублікаваны партрэт В. Быкава.

Красамоўная і назва дыялогу ў газеце «Элет аш ірадалом»: «З таго часу ўпершыню». Яна робіцца зразумелай з першых слоў размовы. На пытанне «Калі вы былі ў Венгрыі ў апошні раз?» наследаваў адказ: «Больш за сорак гадоў таму назад...» Як вядома, В. Быкаў удзельнічаў у вызваленні Венгрыі і вось з таго часу ўпершыню наведаў краіну, якая стала дружалюбнай, сацыялістычнай, і краінай правядзення важнай міжнароднай падзеі — Культурнага форуму.

Адказваючы на пытанні абедзвюх газет, В. Быкаў расказаў пра тыя крыніцы, якія сілкуюць яго творчасць, пра адказнасць пісьменніка перад сваім народам, перад часам і будучым усяго чалавецтва, падзяліўся ўспамінамі аб сваім першым знаходжанні ў Венгрыі.

Абедзве газеты паведамляюць, што ў бліжэйшы час у выдавецтве імя Зрыні выходзіць на венгерскай мове аповесць В. Быкава «Знак бяды».

Ю. ШКРАБЫНЕЦ.

НА РАМОНЦЕ... СЯРЭДНЕВЕЧЧА

Дзесяць гадоў вялі археолагі раскопкі, вызваляючы з-пад шматметровага пласта зямлі сярэдневяковы горад Бярэсце. Феномен кансерванта, створанага тут самой прыродай з глебы, дазволіў адшукаць больш за 40 тысяч знаходак з жалеза, бронзы, шкла, скуры, кераміки — прадметаў малавывучанай культуры ўсходніх славян XI—XIII стст. Есць сярод іх сапраўды унікальныя: самшытавы грэбень з разнымі літарамі кірыліцы, старажытныя пер'і-пісалы, драўляныя дэталі, выробленыя на такарным станку, пячатка тураўскага князя Ізяслава Яраслававіча. Сярод многіх сюрпрызаў Бярэсця — дэталі, якія выкарыстоўваліся ў такарнай і мукамольнай справе, іншыя механічныя прыстасаванні і механізмы.

Але самым каштоўным было тое, што зберагліся зрубы дамоў рамесленай слабады вышынёй у 9—12 вянцоў, драўляныя маставыя вуліц. Прапітаныя спецыяльнымі смоламі, выробленымі супрацоўнікамі лабараторыі Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава і закрытыя ад атмасферных асадкаў павільёнам са шкла і бетону, яны ствараюць непаўторную атмасферу старажытнаславянскага паселішча. Для таго, каб зберагчы ніжнія вянцы зрубаў ад зямной вільгаці, пачата іх гідраізаляцыя, а таксама дадатковая прапітка. Цяпер жытло берасцейскіх рамеснікаў будзе стаяць на бярвеннях, якія не баяцца вільгаці. На вуліцах, як і некалі ў далёкія часы, з'явіцца драўлянае пакрыццё.

М. ГОРСКІ.

ГАРАНТЫЯ ПРАВОЎ

«Удзел Беларускай ССР у барацьбе за захаванне правоў чалавека» — чарговая брашура з серыі, якую выдавецтва «Беларусь» выпускае ў сувязі з 40-годдзем Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Аўтар яе С. Агурцоў паказвае, як наша рэспубліка, з'яўляючыся членам гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі, уносіць дастойны ўклад у барацьбу за правы чалавека, выступае за прыняцце эфектыўных мер па прадухіленню парушэнняў іх у капіталістычных краінах. Звернута ўвага і на тое, як у Беларусі, гэтаксама як і ва ўсім Савецкім Саюзе, пашыраецца дэмакратыя, вырашаюцца пытанні раўнапраўя грамадзян, а таксама нацыянальныя, ствараюцца ўсе ўмовы для ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы.

В. ЗАКРЭЎСКІ.

АДРАСУЕЦЦА ТУРЫСТАМ

Выдавецтва «Беларусь» выпусціла камплект з дзевяці паштовак «Дом-музей I з'езда РСДРП», аўтар-складальнік якога Ж. Міронава. Здымкі, выкананыя В. Бараноўскім, знаёмяць са знешнім выглядам гістарычнага будынка, яго заламі і асобнымі экспанатамі. Выданне адрасуецца найперш гасцям горада-героя Мінска, таму тэкст пададзены на некалькіх мовах.

Е. ДРОМІН.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

Сёння яны — у цэнтры ўвагі. Прымаюць шчырыя віншаванні, адказваюць на пытанні рэпарцёраў... Імгненні славы, цеплыня агульнага прызнання заслужана вянчаюць гады напружанай працы, пошукаў і хваляванняў...

Як вядома, групе творчых работнікаў нашай рэспублікі прысуджаны Дзяржаўныя прэміі СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Драматург А. Дударaў, рэжысёр В. Раеўскі, мастак Б. Герлаван, акцёры А. Дзянісаў, В. Філатаў і В. Манаеў сталі лаўрэатамі за спектакль «Радавыя» ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Высокай узнагародай адзначана творчасць кінарэжысёра В. Дашука, стваральніка цыклаў дакументальных стужак «Я з забітай вёскі» і «У вайны не жаночы твар». Сярод новых лаўрэатаў — кінаакцёр У. Гасцюхін, выканаўца ролі ў мастацкім фільме «Бераг».

Нашы карэспандэнты сустрэліся з лаўрэатамі Дзяржаўных прэмій СССР — А. Дударавым, В. Раеўскім і В. Дашуком.

ПОСПЕХ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

Гавораць лаўрэаты Дзяржаўных прэмій СССР 1985 года

Аляксей ДУДАРАЎ:

— Што адчувае лаўрэат? Вядома ж, радасць, святочны ўздым, жаданне працаваць далей... Але ці не найперш мяне літаральна захлынае найвялікшая ўдзячнасць купалаўцам — ад рабочага сцэны да галоўнага рэжысёра.

«Радавыя» адчынілі перада мной дзверы многіх тэатраў, сярод якіх знакамітыя Малы тэатр Саюза ССР і Вялікі драматычны тэатр імя М. Горкага, Цэнтральны тэатр Савецкай Арміі... Масква, Ленінград, Рыга, Кіеў... З хваляваннем чакаў прэм'ер, шчыра радаваўся акцёрскім і рэжысёрскім удачам. Але паўсюль я быў — цяпер адчуваю гэта дакладна — дэлегатам купалаўцаў. І менавіта яны прадставілі мяне да высокай узнагароды.

Люблю прыйсці на спектакль і з-за куліс паглядзець, як працуюць акцёры. Штораз уражвае балючы нерв, пульсуючы ў кожнага выканаўцы. Выразныя мужчынскія твары, скупасць і дакладнасць рухаў, лядныя постаці — радавыя, «чорнарабочыя» вайны... У такія моманты крыху шкадую, што сам не магу выйсці на сцэну — настолькі прыцягальная творчасць усіх удзельнікаў спектакля.

Не мне меркаваць, ці сказаў я нешта новае пра Вялікую Айчынную ў сваёй п'есе. «Радавыя» — гэта ў першую чаргу мой погляд на мінулую вайну, часткова сплачаны мой доўг памяці, мая адказнасць за дзень заўтрашні.

Купалаўцы пароўну падзялілі са мной і боль, і радасць. Таму я вельмі шчаслівы чалавек.

Валерый РАЕЎСКІ:

— Як ні дзіўна, але супрацоўніцтва з Дударавым адбывалася па загадзе вызначаным «сцэнарыі». Спачатку сумненні, няпэўнасць, потым захапленне працай, творчае задавальненне вынікам, якое рэдка спадарожнічае нашай прафесіі, — увесь гэты ланцужок падзей нагадаў мне колішнюю сустрэчу з я'есай выдатнага беларускага драматурга А. Макаёнка «Трыбунал». Шчаслівае супадзенне! І ўдвая шчаслівае тым, што з'явіўся новы тэатральны пісьменнік, разам з якім тэатр можа спадзявацца на адкрыццё.

Праца над «Радавымі» запомніцца сваёй незвычайнай творчай атмасферай. Я даўно не адчуваў такой бязмежнай акцёрскай веры ў п'есу, мабілізацыі творчых і чалавечых якасцей, еднасці ўсіх, хто ствараў спектакль.

Драматург напісаў надзіва сучасную п'есу. Найперш гэтым трэба растлумачыць гарачы прыём, які наладжвае спектаклю глядач. Дзе б мы ні выступалі, суіснаванне сцэны і залы кранае, узрушае.

Тэатр адзначаны высокай узнагародай. Надзвычай радасная падзея, вялікі гонар. Вельмі хочацца захаваць творчы ўздым, які пануе сёння ў нашым калектыве, — дзеля будучых перамог.

Віктар ДАШУК:

— Дваццаць гадоў мінула з таго часу, як я ўпершыню пераступіў парог аб'яднання «Летапіс». Усе гэтыя гады для мяне былі напоўнены няспынай працай, пошукам новых тэм, канфліктаў, пошукам сваёй дарогі ў кіно. Я зняў больш за паўсотню фільмаў. Не ўсе яны раўназначныя, ды асмельваюся думаць, што стужак «халодных», зробленых абыякавай рукою, у мяне няма.

Асаблівы мой боль — дакументальныя цыклы «Я з забітай вёскі» і «У вайны не жаночы твар», прысвечаныя тэме памяці, тэме пакут, што зведаў наш народ у самую крывавую і страшную з войнаў. Гэтым фільмам я аддаў усе свае намаганні, вопыт, уменне, свае думкі і памкненні. Радасна, што мая праца адзначана сёлета высокай узнагародай — Дзяржаўнай прэміяй СССР. І гэта — пункт адліку, які азначае пачатак нейкага новага этапу ў маім творчым лёсе.

Справа ў тым, што апошнім часам ува мне выспявала жаданне развітацца на нейкі час з дакументальным кіно, паспрабаваць сябе ў іншых сферах мастацтва. У кіно мне часта даводзілася ўсё пачынаць з нуля. Скажам, у аб'яднанне «Летапіс» я прыйшоў пасля заканчэння факультэта журналістыкі, працаваў асістэнтам рэжысёра, спасцігаў азы новай прафесіі. Потым давялося пачынаць ужо ў іншай якасці — рэжысёра. Пазней прыйшоў час адкрываць для сябе новыя грані дакументалістыкі — пачаў пісаць сцэнарыі, асвоіў прафесію аператара. Лічу, што такое пастаяннае самаабнаўленне — неабходны працэс для кожнага творчага чалавека, калі ён не хоча абрасці штампамі, абмежаваць сябе наборам пэўных прыёмаў. Ва ўсякім разе, мне гэта памагала падтрымліваць творчы тонус, спрыяла пастаяннаму пошуку.

Цяпер я зноў пачынаю ўсё спачатку. На гэты раз у ігравым кіно, у якасці аўтара сцэнарыя і рэжысёра фільма «Двое на востраве слёз». Многае ў гэтай справе для мяне нязвыкла і нова, таму, відаць, не варта пераменшваць цяжкасці, з якімі давядзецца сутыкнуцца. Скажам, у дакументальным кіно я прывык да метаду імправізацыі, да таго, што ў працэсе мантажу можна зрабіць тры розныя карціны. «Сцэнарныя ўмовы» ігравога кіно вымагаюць іншага, нязвыклага для мяне метаду работы. Да таго ж, у дакументалістыцы рэжысёр, як правіла, — ці не аднаасобны аўтар карціны, які сканцэнтроўвае ў сабе ўсю паўнату адказнасці за будучы фільм. У ігравым жа кіно ягоная «ўсемагутнасць» драбніцца на вялікае мноства выканаўцаў, якіх трэба захапіць адзіным творчым парываннем. І, нарэшце, я — дэбютант у ігравым кіно, ды не пачатковец у кінематографе. Значыць, патрабаванні да вынікаў маёй «спробы пяра» будуць без аніякіх спасылак на нявопытнасць. Гэта абавязвае да сур'ёзнай, заглыбленай работы. Новы фільм — даследаванне праблематычных, часам хваравітых працэсаў, што ўзнікаюць сёння ў сферы сямейнага жыцця. Гэта расказ пра трагедыю дзяцей, якія застаюцца ў нашым высокаразвітым, гуманным грамадстве без бацькоў... Наш фільм звернуты да вельмі тыповай жыццёвай сітуацыі. І калі кагосьці з будучых гледачоў ён засцеражэ ад безадказных учынкаў, будзем лічыць сваю мастацкую і грамадзянскую задачу выкананай.

Часопісы ў лістападзе

«ПОЛЫМЯ»

Часопіс пачынае друкаваць раман В. Адамчыка «І скажа той, хто народзіцца».

Паэзія прадстаўлена вершамі Ю. Свіркі і Р. Тармолы.

Творы славенскіх пісьменнікаў прапануюцца ў перакладзе У. Рубанава і Н. Гілевіча.

І. Антановіч выступае з артыкулам «Амерыканскі лад жыцця і крызіс культуры».

Да 80-годдзя рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі змешчаны артыкул У. Салашэнкі і М. Сташкевіча «У адкрытых класавых баях».

«Справядлівае лета» — нарыс М. Вайцяшонак.

Пра нашага земляка Р. Муклевіча расказваецца ў нарысе Э. Карніловіча «Начальнік ваенмора».

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкулы «У рэчышчы партыйнасці, народнасці, класавасці» У. Гніламёдава, «Абдумаць спосабы і матэрыял і мэту» Ю. Канэ, «Энергія прозы» Л. Ламекі, «Права на працяг» А. Марціновіча.

Новыя кнігі рэцэнзуюць Л. Савік, Г. Каржанеўская і Р. Смольскі.

Завяршае нумар «Наш каляндар».

«МАЛАДОСЦЬ»

З вершамі выступаюць Ю. Свірка, В. Шніп, В. Тарас, А. Разанаў. Змешчаны таксама ўрывак з паэмы У. Дзюбы — «Доктар Русель».

Проза прадстаўлена аповесцямі «Зелле ад скрухі» В. Шырко і «Сны не вяртаюцца» І. Капыловіча, апавяданнямі «Унучка» М. Зыля і «Ідзі, сын, ідзі...» А. Шлега.

Вершы славенскіх паэтаў пераклаў Н. Гілевіч.

Пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС» друкуецца роздум У. Саламахі «Мы — розныя, мы — родныя...»

Артыкул Н. Цыпіса «Жыць, ствараць, палымнець» прапануецца пад рубрыкай «Моладзь і жыццё».

В. Гапановіч аналізуе маладзёжнае мастацтва Захаду — «Бунт дзеля жыцця».

М. Мінуліч рэцэнзуе кнігу паэзіі П. Макаля «Калыска долі», В. Ліпневіч — зборнік прозы Н. Маеўскай «Такая позняя восень».

Слова пра Я. Скрыгана ў сувязі з 80-годдзем пісьменніка гаворыць Х. Лялько — «Тварыць хараство».

«БЕЛАРУСЬ»

«Рыцар чырвонага трактара» — нарыс І. Есакова пра лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, выпрабавальніка трактароў М. Грузда.

А. Гардзіцкі рэцэнзуе кнігу публіцыстыкі В. Быкава «Праўдай адзінай» — «Памяць патрабуе».

Творы югаслаўскіх паэтаў пераклалі К. Севярынец і І. Чарота.

З новымі вершамі выступае Т. Бондар.

Змешчаны апавяданні У. Навумовіча «Партызанскае братэрства», А. Капусціна «Насустрач халоднаму сонцу», успаміны М. Гурскай «Успамінаючы тыя цяжкія дні...», нататкі М. Вайцяшонак «Вечар, вечарэе», нарыс Э. Ялугіна «Горад майстроў».

Уражаннямі ад наведвання Фінляндыі дзеліцца І. Макаловіч — «У краіне тысячы азёр».

Штрыхі да творчага партрэта радыёрэжысёра С. Гурыч напісала Т. Абакумоўская — «Тэатр слова».

У сувязі з 80-годдзем Я. Скрыгана гаворыць пра яго творчасць С. Андраюк — «Высокае служэнне літаратуры». Адзначаюцца таксама іншыя юбілейныя даты.

Разважанні К. Шэрмана «Востраў памяці» публікуюцца пад рубрыкай «З далёкіх і блізкіх дарог».

«НЕМАН»

Падборка вершаў Г. Пашкова «Слухаю зямлю» ў перакладзе В. Ліпневіча, А. Аўруціна і Г. Марозава адкрывае нумар.

Часопіс знаёміць чытача з вершамі М. Грамыкі. Слова ў сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння яго гаворыць С. Шушкевіч — «Дарогамі Радзімы».

У раздзеле «Проза» — аповесць А. Сульянава «Адна ноч генерала Скарнякова» і працяг рамана І. Пташнікава «Алімпіяда» (аўтарызаваны пераклад В. Кудзінава).

Пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС» публікуюцца артыкул А. Унукава «Струганым уніз...» і нарыс М. Шыбаліса «Усмешка Стаханава».

«Расказы пра танец» — разважанні Ю. Чурко аб народным харэаграфічным мастацтве.

Кнігі рэцэнзуюць Ю. Багданаў, Т. Чабан, А. Марціновіч, А. Аўруцін.

Друкуецца падборка «Хроніка «Нёмана».

Да 80-годдзя рэвалюцыі 1905–1907 гг.

Разгаралася полымя

Кастрычнік 1905 года. Дзесяты месяц першай расійскай рэвалюцыі. Усяго толькі дзесяты, але які гіганцкі якасны зрух: ад мірнага шэсця к царскаму палацу — да Усерасійскай палітычнай стачкі. Злучэнне стыхійнага руху рабочых і сялян з арганізаваным сацыял-дэмакратычным рухам, кіраўніцтва ленінскай партыі — складалі сутнасць і ўнутраную рухаючую спружыну гэтага няўхільнага развіцця рэвалюцыі. Усерасійская палітычная стачка, як падкрэсліваў У. І. Ленін, «ахапіла на гэты раз сапраўды ўсю краіну, аб'яднаўшы ў гераічным уздыме самага прыгнечанага і самага перадавога класа ўсе народы праклятай «імперыі Расійскай».

У радах двухмільённай арміі бастуючых быў 66-тысячны атрад пралетарыяту Беларусі. У яго авангардзе ішлі рабочыя чыгуначнікі як найбольш арганізаваная і класавая сіла. Менавіта дэпо і майстэрні пачалі стачку і сталі апорнымі пунктамі ўсяго руху. Забастоўкі ахапілі 32 населеныя пункты і суправаджаліся, як правіла, шматтысячнымі мітынгамі і дэманстрацыямі. У ходзе кастрычніцкай стачкі значна ўзрасла палітычная свядомасць мас. Ідэя ўзброенага паўстання як адзінага, ва ўмовах царызму, сродку дасягнуць сваёй мэты, паступова асэнсоўвалася працоўнымі.

Такі вынік стаў магчымы дзякуючы кіруючай ролі арганізацый РСДРП у Беларусі, у якіх да таго часу бальшавікі ў барацьбе з меншавікамі і прымірэнцамі занялі дамінуючыя пазіцыі. У ходзе падрыхтоўкі і правядзення стачкі бальшавікі значна актывізавалі арганізацыйную і прапагандысцкую работу. У гэтым кантэксце трэба асабліва адзначыць факт умацавання сувязей Мінскай групы РСДРП з рэдакцыяй газеты «Северо-Западный край», якая прытрымлівалася рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. Газетай былі надрукаваны цалкам альбо ў вытрымках ці ў пераказе некалькі артыкулаў У. І. Леніна, шэраг партыйных дакументаў і матэрыялаў, у тым ліку Праграма РСДРП. З яе старонак прагучаў славуты верш Янкі Купалы «Мужык». Таму зусім невыпадковым трэба лічыць прызнанне начальніка Мінскага жандарскага ўпраўлення, які характарызаваў газету органам «абуджэння грамадства і правядзення ў яго сацыял-дэмакратычнай праграмы». Хаця, безумоўна, яго сцвярджэнне, што ўсе члены рэдакцыі і рабочыя друкарні з'яўляліся членамі РСДРП — яўнае перабольшанне. Відавочна другое: газета «Северо-Западный край» у кастрычніку — снежні стала свайго роду легальным органам Мінскай групы РСДРП.

Падборка дакументаў, якая друкуецца сёння, даволі выразна акрэслівае асноўныя рысы кастрычніцкай стачкі, хоць, зразумела, з-за сваёй фрагментарнасці не раскрывае іх цалкам. Гэта датычыць і такой з'явы, як стварэнне ў выніку рэвалюцыйнай творчасці мас забастовачных камісій і камітэтаў, Саветаў.

Усерасійская кастрычніцкая стачка стварыла рэальную пагрозу існаванню царызму. І самадзяржаўе прыбегла да манеўру: яно выдала маніфест з абяцаннямі свабоды слова, сходаў і з'ездаў, склікання заканадаўчай думы. Працоўныя Мінска аднымі з першых пераканаліся, чаго вартыя дараваныя найвысачэйшай воляй свабоды. Расстрэл 18 кастрычніка на прываказальнай плошчы Мінска 10-тысячнага мітынгу — трагічная, але і гераічная старонка летапісу рэвалюцыйнай барацьбы працоўных Беларусі. Яна прадстаўлена ў ацэнках двух процілеглых лагераў, што наглядна выкрывае сутнасць палітыкі царызму, які намагаўся пад прыкрыццём канстытуцыйнай фразы, ілжывых абяцанняў утапіць рэвалюцыю ў крыві.

Кастрычніцкая стачка ўскалыхнула ўсе слаі працоўных Расійскай імперыі, надала моцны штуршок сялянскаму руху, салдацкім хваляванням. Масавая палітычная стачка ў кастрычніку 1905 года паказала ўсю моц і эфектыўнасць гэтага спецыфічнага пралетарскага сродку барацьбы, стала для рабочага класа школай ідэйна-палітычнага выхавання.

1905 г. верасня 5. — З рапарту мінскага павятовага спраўніка мінскаму губернатару аб арышце асоб, якія абвінавачваюцца ў распаўсюджанні пракламацый і брашур рэвалюцыйнага зместу.

28 мінулага жніўня 3-ма невядомымі маладымі людзьмі, якія ехалі па дарозе, што вядзе з мястэчка Валожын Ашмянскага павета да мястэчка Ракаў, у размешчаных па шляху вёсках Дарогах, Макрычаўшчыне, Сярэднім Сяле і Слабадзе былі раскіданы антыўрадавыя брашуры і пракламацыі. 30-га жніўня ў 10 гадзін вечара затрыманы тыя ж маладыя людзі, сярод іх адна жанчына, вярталіся ўжо з г. Мінска.

Пры аглядзе куфра, які быў у іх, былі знойдзены друкаваныя антыўрадавыя пракламацыі РСДРП: «Цар і лібералы-дэпутаты», «Далоў дзяржаўную думу», брашура: «Сяляне, да вас наша слова», сачыненне Карла Маркса «Наёмная праца і капітал», сачыненне Маркса і Энгельса «Буржуазія, пралетарыят і камунізм», 6-зарадны рэвальвер з 5-цю кулямі, скураная сумка з пустымі гільзамі для патронаў, нож і рознага роду пісьмы і нататкі...

Гэты архіўны здымак уваскрашае гераічныя дні кастрычніка 1905: вызваленне палітычных вязняў з Мінскай турмы.

Праведзенае па гэтай справе дазнанне разам з брашурамі, пракламацыямі, рэвальверам, нажом і іншымі рэчамі прыставам 2 стану перададзена памочніку начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення па Мінскім павеце і данесена пракурору Мінскага акружнога суда і яго памочніку, а затрыманыя 2 верасня адпраўлены ў Мінскую турму...

1905 г. кастрычніка 12. — Тэлеграма начальніка Лібава-Роменскай чыгункі міністру шляхоў зносін аб забастоўцы на ст. Мінск.

Сёння 12 кастрычніка спынены заняткі ва ўсіх службах і аддзелах упраўлення і на тэлеграфе. На ст. Мінск спынены работы ў дэпо і майстэрнях, выпушчана пара з паравозаў. Поезд № 1 далей адпраўлены быць не можа.

Начальнік Лібава-Роменскай дарогі Машкоў.

1905 г. кастрычніка 13. — Данясенне начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення мінскаму губернатару аб падрыхтоўцы дэманстрацыі ў Мінску.

Заўтра вырашана арганізаваць дэманстрацыю ў горадзе. З гэтай мэтай мяркуецца збірацца невялікімі групамі на вуліцах і потым адразу нечакана ўтварыць масу, якая, узняўшы чырвоныя сцягі і страляючы з рэвальвераў, пройдзе па Захар'еўскай вуліцы.

Падпісаў палкоўнік Усясвяцкі.

1905 г. кастрычніка 14. — З данясення мінскага губернатара ў дэпартамент паліцыі аб забастоўцы рабочых Пінска, Баранавіч і Палескіх чыгунак.

...11 кастрычніка на ст. Пінск і Палескіх чыгунак забаставалі рабочыя чыгуначных майстэрань, патрабаваўшы спынення работ на казённым вінным складзе, што і было выканана.

На наступны дзень раніцай паступова спыніўся рух цягнікоў на лініі Бранск—Брэст. Хваляванне, якое пачалося напярэдадні, закончылася ўсеагульнай забастоўкай фабрык, рамеснікаў і прыказчыкаў... Таго ж дня на ст. Лунінец і Баранавічы забаставалі рабочыя чыгуначных дэпо, а на ст. Лунінец, акрамя таго, тэлеграфісты...

Па лініі Палескіх чыгунак і ў г. Пінску забастоўка носіць чыста палітычны характар, на станцыі ж Баранавічы рабочыя прад'явілі патрабаванні аб паляпшэнні эканамічнага становішча.

1905 г. кастрычніка 15. — З адносіны віцебскага губернатара начальніку віцебскага гарнізона аб прысылцы салдат для падаўлення мяркуемай усеагульнай забастоўкі ў г. Віцебску.

Маючы на ўвазе звесткі аб мяркуемай заўтра, 16 кастрычніка, усеагульнай забастоўцы ў г. Віцебску ўсіх рабочых і служачых у гандлёвых і прамысловых установах, з мэтай захавання грамадскага парадку і бяспекі, пакорліва прашу ваша правасхадзіцельства камандзіраваць для садзейнічання мясцовым уладам па паўроце ў памяшканні 1-й і 3-й паліцэйскіх часцей і на пажарны двор і незалежна ад гэтага па 1-му ўзводу для аховы вадакачкі гарадскога водаправода і воданапорных вежаў на Магілёўскім базары і на Ветранай вул...

1905 г. кастрычніка 15. — Тэлеграма мінскага губернатара Курлова генералу Трэпаву аб неабходнасці ўвядзення ўзмоцненай аховы ў сувязі з прадаўжэннем забастоўкі чыгуначнікаў і закрыццём навучальных устаноў.

Забастоўка гандлёвых, прамысловых устаноў закончылася. Чыгуначная працягваецца. Навучальныя ўстановы закрыты. Дырэктарамі атрымана распараджэнне аб звальненні выхаванцаў старшых класаў, якія ўдзельнічалі ў забастоўцы, яны хадайнічаюць аб высылцы іх з Мінска. Яшчэ раз хадайнічаю аб увядзенні ўзмоцненай аховы.

Губернатар Курлоў.

1905 г. кастрычніка 17. — Адносіна мінскага губернатара камандзіру 239-га пяхотнага Окскага палка аб высылцы войскаў для падаўлення хвалявання ў г. Ігумен Мінскай губ.

З прычыны беспарадкаў у г. Ігумене экстрана прашу ваша правасхадзіцельства падпісаць тэлеграму для незамаруджанай адпраўкі паўроты даверанага Вам палка з м. Пухавічы ў г. Ігумен у распараджэнне старшага паліцэйскага чына.

1905 г. кастрычніка 17. — Тэлеграма гарадоцкага павятовага спраўніка віцебскаму губернатару аб прысылцы ў Гарадок войска для падаўлення рэвалюцыйнага руху.

Прашу прыслаць роту салдат. У Гарадку пачаліся беспарадкі, сваімі сіламі справіцца немагчыма.

Спраўнік Шчарбінскі.

1905 г. кастрычніка 17. — Тэлеграма віцебскага губернатара ў дэпартамент паліцыі аб усеагульнай забастоўцы ў г. Віцебску.

Сёння ў Віцебску пачалася ўсеагульная забастоўка. Магазіны зачынены. Пры суправаджэнні патрулём трох затрыманых... вялікі натоўп адбіў арыштаваных. Стрэлам з рэвальвера забіты гарадавы Якаўлеў. Ёсць параненыя ў натоўпе, які рассеяўся. Адзін з параненых у Дзвінску ў суботу памёр, пахаваны без інцыдэнтаў.

Губернатар Гершаў-Арлотаў.

1905 г. кастрычніка 18. — Тэлеграма мінскага губернатара Курлова ў дэпартамент паліцыі аб расстрэле дэманстрацыі ў Мінску.

У 11 гадзін раніцы па азнаямленні з высачэйшым маніфестам, натоўпы пад кіраўніцтвам важакоў хадзілі па горадзе. Сабраўшыся ля гарадской думы, абралі дэпутацыю на чале выконваючага справы гарадскога галавы, пам. прысяжнага паверанага Стэфановіча. З'явіліся да майго дома, патрабуючы прыняць дэпутацыю. 12 чалавек, прынятыя мною, грунтуючыся на высачэйшым маніфесце, патрабавалі вызвалення арыштаваных па маіх абавязковых пастановах, вызвалення ўсіх палітычных арыштантаў і выдалення з горада казакоў, абяцаючы цішыню, спакой горада. Першая просьба дзеля таго, каб пазбегнуць сутычак, была выканана, другое хадайніцтва звернута пракурору, па трэцім абяцаў зняць патрулі, раз'езды. Натоўп накіраваўся да турмы, не здаволіўшыся вызваленнем мною арыштаваных, патрабаваў свабоды ўсім палітычным. Войскі ахоўвалі турму, сутыкненняў не было. Натоўп, павялічыўшыся ў колькасці дзесяці тысяч, рушыў на Лібава-Роменскі вакзал, ішоў з крыкамі «ўра», пад стрэлы рэвальвераў, з чырвонымі сцягамі. Начальнік упраўлення Віндэльман тэлефанаваў, просячы ўказанняў. Перадаў яму па тэлефоне не страляць да апошняй крайнасці, ужыць зброю пры насіллі. Натоўп паводзіў сябе з выклікам, абражаў салдат, імкнуўся вырваць ружжы, пачаў страляць з рэвальвераў, граміць вакзал. Пасля трэцяга папярэджання дадзены залпы. Натоўп рассеяўся. Ёсць забітыя і параненыя. Дазнанне праводзіцца. Прашу ўказанняў па прымяненні высачэйшага маніфеста, атрыманага... тэлеграмай. Дакладваю — можа быць аднаўленне беспарадкаў, якія вымушаны буду задушыць сілаю.

1905 г. кастрычніка 26. — Тэлеграма таварыша міністра ўнутраных спраў Трэпава мінскаму губернатару аб прыняцці мер да спынення магчымых рэвалюцыйных выступленняў.

Атрыманы ўказанні, што рэвалюцыянеры маюць намер выклікаць у Мінску беспарадкі, прапаную вам прыняць папераджальныя меры, у выпадку ўзнікнення беспарадкаў спыніць іх самым рашучым чынам.

1906 г. студзеня 30. — З рапарта начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення аб дзейнасці рэвалюцыйных партый і рэвалюцыйным руху ў Мінску ў 1905 г.

У верасні пачалося ўзмоцненае забеспячэнне (Мінскай групай РСДРП) і зброяй мас, і на сходках меркавалася рыхтавацца да забастоўкі і байкатавання дзяржаўнай думы. Было вырашана... арганізаваць грандыёзную дэманстрацыю з чырвонымі сцягамі і стральбой, а ў выпадку сутыкнення з паліцыяй аказаць ёй узброенае супраціўленне...

У кастрычніку месяцы пачалася агітацыя сярод служачых конна-чыгуначнай дарогі аб арганізацыі забастоўкі, прычым аратарамі выступалі Лукоўскі, Гайліц, Окунь, Чакінскі і Беленькі, а 8-га кастрычніка меркавалася дэманстрацыя...

Пасля падзей 18-га кастрычніка сходкі працягваліся, прычым месцам масавых зборышчаў была зала «Парыж» і будынак службы Лібава-Роменскай чыгункі.

1906 г. красавіка 21. — З данясення начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дэпартамент паліцыі аб рэвалюцыйным руху ў Мінску ў 1905—1906 гг.

У кастрычніку месяцы (1905 г.) з прычыны больш адкрытай дзейнасці рэвалюцыйных арганізацый даволі праяснілася і ўстанавіліся прадстаўнікі сацыял-дэмакратычнай арганізацыі, з якіх кожны прымаў самы актыўны ўдзел у агітацыі чыгуначнай забастоўкі, у прапагандзе ідэй у грамадстве вусна і шляхам пракламацый, прычым органам для ўзбуджэння грамадства і правядзення ў яго сацыял-дэмакратычнай праграмы з'явіўся «Северо-Западный край», які ў поўным саставе рэдакцыі і рабочых складаўся з членаў партыі.

Найбольш відную ролю, як кіраўнікі, іграліі: Казімір Чакінскі, Хаім Беленькі, Фрыдрых Гайліц, Міхаіл Лукоўскі, Віктар Любімаў, Янкель Окунь, Леанід Любімаў, Надзея Міхайлоўская, Мікалай Гурвіч, Мікалай Ленскі...

Асобы гэтыя пры дапамозе аднадумцаў сваіх з асяроддзя саюза чыгуначнікаў праніклі на сходкі рабочых, ...захапілі вядзенне дэбатаў у свае рукі і ад эканамічна-прававых адносін перайшлі на палітычную глебу.

Для сувязі з агульным сацыял-дэмакратычным рухам быў Сяргей Валынскі, які меў у сябе явачную кватэру і быў у сувязі з Казімірам Адамавічам Петрусевічам.

Матэрыялы падрыхтавалі:
навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі партыі
пры ЦК КПБ
А. КАРОЛЬ
і загадчык аддзела
Беларускага дзяржаўнага
гістарычнага архіва
Я. БРАВЕР.

Пятро ВАСЮЧЭНКА

Зменлівыя БЕРАГІ ЧАСУ

Гаворка, распачатая «Літаратурай і мастацтвам», не абмежавалася спрэчкамі вакол модных у дачыненні да літаратуры 70—80-х гадоў тэрмінаў («вясковая», «гарадская», «экалагічная», «анталагічная», «інтэлектуальная», «эксперыментальная» і г. д.). Удзельнікі гаворкі не паддаліся спакусе абсмоктваць прыдуманыя азначэнні і спыніліся на пэўным: сучасная. Сучасная літаратура, літаратура аб сучаснасці. Здаецца, што выказаныя крытыкамі думкі, пры ўсіх адрозненнях, сыходзяцца на адным: тое, што датычыць часу, звязаных з ім мастацкіх з'яў. Не выпадкова такія загалоўкі ў артыкулаў: «Калі паглядзець наперад», «Вітражы памяці», «Час патрабуе». І з аднаго артыкула ў другі вандруе магічнае слова: «вяртанне».

Літаратура рухаецца ў часе, і сама прыслухоўваецца да гэтага руху, і імкнецца яго спасцігнуць, дзеля чаго спыняе імгненні, засяроджваецца на тым, што мінула. І гэта ў век фантастычных хуткасцей значна цяжэй, чым адольваць адлегласці ў прасторы. Апошняе ўмеў яшчэ аўтар «Слова аб паходзе Ігаравым», які бачыў славянскія землі як бы з вышыні, думкай ахопліваў абшар ад полацкай Сафіі да тмутараканскага ідала. А сёння імклівыя электрацягнікі лёгка спраўляюцца з «неадольнай» дыстанцыяй паміж горадам і вёскай. Дзве-тры гадзіны — і ўнаранні гараджанін ужо памахвае касой ля бацькоўскага падворка. Ці не ёсць у гэтым добраахвотным існаванні паміж горадам і вёскай тая гармонія быцця, аб якой марыць вясковая проза?..

Але, акрамя жартаў, у нашай літаратуры з'яўляюцца творы, якія ўпарцяцца перад звыклай класіфікацыяй. Раман «Неруш» В. Казько. Вялікая спакуса далучыць яго да ліку твораў так званай «экалагічнай» тэматыкі, але, акрамя праблем меліярацыі і аховы навакольнага асяроддзя, ёсць жа яшчэ нешта ў творы, ад чаго немагчыма абстрагавацца нібыта ад другараднага. Тут нароўні з рэальнымі вобразамі жывуць фантастычныя—Галоска-галасніца, Жалезны чалавек; гумар суіснуе з эпізодамі трагічнага зместу. Згадваецца вайна. Апавяданне пра канадцаў беларускага паходжання, якія ў якасці замежных турыстаў вярнуліся на родную зямлю, перарастае ў роздум аб вернасці айчыне. Дык што гэта за проза—«вытворчая», «філасофская», «міфалагічная» ці яшчэ якая?

Аналагічнае пытанне напрошваецца з нагоды рамана І. Шамякіна «Вазьму твой боль», у якім таксама няма тэматычнай абмежаванасці. Дзеянне разгортваецца ў часе, паміж двума яго берагамі — цяперашнім і мінулым. З былога паходзяць пытанні не менш надзённыя, чым тыя, што звязаны з сучаснай вытворчасцю, хлебаробскай працай. Зададзены яны свядомасцю героя, Івана Батрака, яго сумленнем партыйца, яго памяццю аб ваенным дзяцінстве.

Свой боль Батрак нясе да людзей, шчыра выказвае перад імі абурэнне тым, што сёй-той з аднавяскоўцаў нібыта здрадзіў памяці, паблажліва ставіцца да зла, якое ў абліччы Шышковіча паўстала з мінулага і гатова ўчапіцца за дзень сённяшні. Ад споведзі героя пачынае разгортвацца ланцужок народжаных болем пытанняў, якія сваім зместам набліжаюцца да агульначалавечых, «вечных», а значыць, тым больш сучасных. Ці поўнай мерай пакараны былы паліцай? Ці не занадта міласэрна абышоўся з ім закон? А калі юрыдычная мера пакарання і была дастатковай, дык што, злачынца ўжо адкупіў сваю віну? Калі так, дык і дараваць яму трэба ўсё? Глядзець, як вылюдак выбірае ў сельмагу ляльку? У яго імя божае на вуснах, вымольвае сабе літасць ва ўсявышняга, чаго добрага і шчыра, дык, значыць, і абысціся з ім літасціва? А калі пазбавіць яго літасці, дык, значыць, шукаць новай яму кары? Якой? Ці верне гэта да жыцця тых, загінуўшых — Батраковых маці і сястру?

«Здаецца, быццам само жыццё начыталася Дастаеўскага і — пераўзышло яго», — прагучала ў гутарцы паміж А. Адамовічам і крытыкам Ю. Каракіным («Литературная газета», 9 мая 1984 года). Незвычайная канцэнтрацыя «дастаеўскіх» пытанняў выклікана, напэўна, складанасцямі сённяшняга жыцця. Трывога чалавецтва дае аб сабе знаць у шэрагу значных твораў. Пытанні нараджаюцца часам, а ў часу два берагі — мінулае і сёння. Тое, што адбываецца сёння, непарыўна злучана з днём учарашнім, бярэ ў ім свае вытокі. Мінулае і сёння — палавінкі аднаго цэлага. Сучасная літаратура і разглядае іх як цэлае, збліжае берагі, не дае ім разысціся. Таму адзін з матываў, на які шчодрае мастацтва сённяшняга дня, — вяртанне. Матыў, аднолькава ўласцівы і «гарадской», і «вясковай», і «экалагічнай», і «інтэлектуальнай» прозе. Найбольш драматычнае з вяртанняў — у вайну.

Мінуў час недарэчных размоў пра немагчымасць адкрыць што-небудзь новае ў прозе аб вайне. Павярхоўны тэзіс аб «стомленасці» ваеннай прозы быў абвергнуты намаганнямі творцаў, якія даказалі, што слова аб мінулай вайне асабліва дзейснае цяпер, калі чалавецтва занепакоена верагоднасцю новай бяды.

Для многіх з вядомых нам пісьменнікаў вяртанне ў ваеннае мінулае зрабілася не толькі абавязкам, але і неабходнасцю. Іх творчае жыццё немагчыма без гэтага звароту да памяці свайго пакалення, якое часткай сваёй свядомасці знаходзіцца яшчэ там, у дні, дзе агонь і кроў, попел спаленых вёсак. Неабходнасць вяртання асабліва востра адчуваюць тыя празаікі, якія выраслі з ваеннага дзяцінства.

Гэтая немагчымасць для «дзяцей вайны» вызваліцца ад цяжару іх памяці была заўважана нашай літаратурай даволі рана, у творы, што па часе свайго напісання ўсё бліжэй да перыяду, якім займаецца ўжо не бягучая крытыка, а літаратуразнаўства. Гэта аповесць-рэквіем Б. Сачанкі «Апошнія і першыя». Апошні з жыхароў вогненнай вёскі Рудні, Ясь, — адзін з першых «дзяцей вайны», пакліканы літаратурай у дарогу да мінулага, да сябе ў ім. Дарослы герой не раз і не два будзе вяртацца ў новую, паўстаўшую з руінаў Рудню, шукаць слядоў былой трагедыі, апытваць старажылаў. Недзе ў тайніках душы будзе тлець дзіцячая і нязбытная надзея на тое, што адшукаюцца, вернуцца з небыцця бацька і маці.

Ужо з іншай мэтай пойдзе па сваіх слядах персанаж пазнейшага твора Б. Сачанкі — Занядбайла. Разгубленасць, непрыкаянасць перад складанай, малазразумелай яму рэчаіснасцю прымушаюць «я-героя» «Запісак...» адважыцца на пошук нечага важнага, колісь страчанага ім на жыццёвых скрыжаваннях.

Крытыка, анатаміруючы вобраз Занядбайлы, у рэшце рэшт, надзяліла яго кляймом звычайнага абывацеля і на гэтым супакоілася. Яно, з аднаго боку, і справядліва: Занядбайла блізкі да людзей — «перакаціполе», да тых антыгерояў, якія густа абжылі прозу апошніх год. Ды ўсё гэта — адзін бок праўды пра Занядбайлу. Другі — у мінулым, ля таго берага, куды ён вяртаецца памяццю. Там, дзе хлопчык-бязбацькавіч блукае па галодных і халодных пасляваенных вёсках, у кампаніі са сляпой жабрачкай, якая штохвіліна ўводзіць у вушы малому свае маральныя ўрокі: «Ні ты, ні я не вінаватыя, што жыццё з намі так абышлося... Доля спрагла нас разам з табою...» Далей — ужо чутае ад «падпольных» герояў Дастаеўскага: усё можна, усё дазволена. І дарослы Занядбайла сёе-тое сабе дазваляе...

Зразумела, абставінамі, асяроддзем усяго не растлумачыш. Споведзь Занядбайлы якраз і наводзіць на думку аб тым, што чалавечая годнасць праяўляецца ва ўменні супрацьстаяць тым абставінам, у выніку якіх расчалавечваецца асоба. У Лецечкі з «Суда ў Слабадзе» В. Казько было куды больш падстаў крыўдаваць на свет, у якім не вынішчана зло, але герой імкнуўся заставацца самім сабою ў дзетдомаўскім брацтве, сярод людзей. І ягоны дзіцячы гнеў абрынуўся толькі на тых нелюдзяў, якія заслужылі жорсткую кару за найгоршае са злачынстваў — здраду свайму народу.

Але ж і Занядбайла не з тых, хто дазваляе сабе пакорліва плысці туды, куды зацягвае яго жыццёвы вір: «Быць таго не можа, каб я не знайшоў сваіх памылак, не знайшоў хоць тых абрыўкаў нітачкі, за якую мне трэба было трымацца, не звязаў тых абрыўкаў зноў у адну нітку, не пайшоў далей роўна, самастойна, добра ведаючы, куды я і чаго іду».

Сёння літаратура ўсё часцей выкрывае сытых, самазадаволеных спажыўцоў. Мешчанін паказваецца не інакш, як у абалонцы рэчаў, без якіх немагчымы ягоны дабрабыт: аўтамабіль, імпартовая мэбля, дача, стэрэамагнітафон і да т. п. Мала ўдзяляецца ўвагі працэсу ператварэння духоўна здаровага чалавека, якімі мы ўсе нараджаемся, у абываценя. Рэдка ўнутранае «я» апошняга прасвечваецца моцным рэнтгенам-рэтраспекцыяй.

Праявы дабра і зла не заўсёды распазнаюцца імгненна, некаторыя этычныя ісціны засвойваюцца гадамі. Мастаку трэба ведаць вытокі з'явы, каб вытлумачыць яе як вынік. І такое дасягаецца адначасным поглядам у мінулае і цяперашняе, злучэннем у цэлае падзей, раздзеленых часам. У «Смаленні вепрука» М. Стральцова з мастацкай віртуознасцю паядноўваюцца берагі часу, што робіць аднолькава важным хуткаплыннае і вечнае, бытавое і быцейнае — усё, што звязана з надзіва тонкай, успрымлівай да ўсялякіх жыццёвых праяў натурай лірычнага героя. «У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук — хударлявы, бледны, шыракароты; парывісты і адначасна ціхмяны, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа, і можна сказаць, што яна была надзелена здольнасцю разумення і хацення дабра, і разумення людзей, але не таго хцівага, саманадзейнага разумення, заручанага з адным днём, а другога, журботнага і трохі безнадзейнага, без выгодаў для сябе: яно благога чалавека прымушала шкадаваць гэтак жа, як і добрага, — хаця б за тое, што ён благі».

Нібыта партрэт усяго пакалення, з якога паходзяць і аб якім пішуць М. Стральцоў, В. Казько, Б. Сачанка, І. Пташнікаў, Я. Сіпакоў... Сваю памяць яны ахвяравалі сённяшняму дню, зрабілі яе часткай рэальнасці. У сваім ваенным дзяцінстве яны адшукалі адказы на сякія-такія пытанні з шэрагу «вечных». Напрыклад, на тое, што паставіла ў тупік бунтара-нігіліста Івана Карамазава: аб «слязінцы дзіцяці».

Дзяцінства, што гаворыць са старонак іх твораў, не можа адмовіцца ад свайго лёсу, ад сусветнай гармоніі, ад будучыні. Бо ведае, якою цаною здабывалася гэтае будучае. Бо сваімі слязамі, а не чыімі яшчэ, заваявала сабе права жыць у шчаслівейшым, мірным свеце. Дзяцінства не можа, як гэта прапаноўваў Карамазаў, адмовіцца і ад пекла для катаў, таму што мінулае сведчыць: у імя дабра трэба супраціўляцца злу.

Празаікі, у ліку якіх і «дзеці вайны», відавочна пашыраюць храналагічныя межы паняцця «сучаснасць» тым, што разглядаюць яе скрозь прызму свайго ведання тае вайны. Будучы ваенны эпас, які настойліва прадказваюць крытыкі, яшчэ шырэй расхіне прасцяг мастацкага часу. Паміж яго берагамі ляжа гісторыя: тое, што было раней, і тое, што будзе.

Ужо сёння пісьменнікі, прытым не з адной генерацыі «сярэдніх», твораць, нібыта адчуваючы прыцягненне будучага эпасу з яго ўсімі магчымымі «да» і «пасля». Гэтым мастацкім прадбачаннем новага споўнена аповесць В. Быкава «Знак бяды».

Чалавечая трагедыя, якая адбывалася на хутары Яхімоўшчына, разыгрывалася болей у часе, чым у прасторы. Куточак зямлі недзе на Полаччыне не прыцягнуў бы ўвагу мастака, калі б на гэтым кавалачку Сусвету не скрыжаваліся чалавечыя лёсы, калі б не праехалася па ім кола гісторыі, пакінуўшы глыбокую каляіну.

След чалавечай бяды, якая здарылася на хутары, існуе ў сённяшнім дні. Некалі разбураная, закінутая сядзіба, якую абыходзіць чалавек і аблятаюць лясныя птушкі. Недзе на ўзроўку, закіданая зямлёй і колішнім лісцем, дрэмле авіябомба. І цяжар пытанняў, прамых і бескампрамісных, як выбух, выкліканых тым, што калісьці тут адбылося. Дзеля іх вырашэння і спатрэбілася вяртанне туды, у яшчэ даваеннае мінулае. Дзеля паўнаты адказу трэба было расказаць і пра тое, як парабкавалі ў пана Адолі яшчэ юныя Сцепаніда і Пятрок, якім шчасцем і якой бядой быў пасля для іх свой уласны кавалачак зямлі... Трэба было пералічыць крывавыя мазалі, набытыя Петраком на тым пагорку, што стаў ягонай Галгофай. Патрэбен быў праўдзівы расказ і пра камбедаўскую дзейнасць Сцепаніды, і пра хаджэнне Петрака ў незнаёмую яму сталіцу, да таварыша Чарвякова, па справядлівасць.

Калі б асноўнае дзеянне «Знака бяды» абмежавалася канстатацыяй «так было», наўрад ці былі б неабходнасцю гэтыя рэтраспекцыі. Але ў простых і ў прастаце сваёй жорсткіх калізіях тоіцца складанае. Прыйшлі на чужое, выжылі са святліцы гаспадароў, абтрэслі яблыньку, стапталі грады, застрэлілі і пасеклі на мяса карову, забілі нямога пастушка Янку...

Рушыцца сусвет. Тое, што было сусветам, хоць і не вельмі ўтульным, але сваім, абжытым, для двух немаладых людзей, якія ўсяго пабачылі за свой век, але такога... Нібы з іншага свету, чужога, ірэальнага, абрынулася жорсткае, несправядлівае, незразумелае. Пераблытаўся час, зрушыліся звыклыя сувязі і прапорцыі. У хаосе вайны перайначылася рэчаіснасць, рэчы і з'явы пачалі вагацца ў сваім сапраўдным змесце, пахіснуліся каштоўнасці. Скрыпка мяняецца на змеявік, Сцепанідзін кабанчык — на авіябомбу. У гэтым перакуленым свеце лягчэй прапасці, чым ацалець, але трэба — выстаяць. Трэба сцвердзіцца ў гэтай калатнечы, упэўніцца, што твае разумение справядлівасці не пахіснулася. «Рэнтгенаскапія» лёсаў Сцепаніды і Петрака выявіла той духоўны стрыжань, які ёсць у абодвух, які гартаваўся гісторыяй, з яе крутымі паваротамі, дзе дабро часам змешвалася з горыччу, як яно і здараецца ў жыцці.

Проза, калі яна аб сучасным і сучасная, у той або іншай меры абапіраецца на гісторыю. Гэта ўжо не кажучы пра творы, у якіх гісторыя проста зрошчваецца з сучаснасцю.

Напрыклад, выключыць якінебудзь часавы пласт з «Чорнага замка Альшанскага» У. Караткевіча значыла б загубіць у творы ягоную душу. Пісьменнік здолеў выявіць тыя счапленні, якімі злучаны ў адзінае розныя гістарычныя эпохі, і падкрэсліў іх агульнасць з мастацкай пераканаўчасцю. У шматпластавай структуры рамана не адчулі сябе чужымі дэтэктыўная гісторыя, гістарычны факт, легенда і архіўны дакумент.

Да ліку найбольш значных адкрыццяў, зробленых мастацтвам нашых дзён, трэба аднесці наступнае: усведамленне ўсёй складанай дыялектыкі пераходу гісторыі ў сучаснасць. Літаратура як ніколі адчувае актуальнасць мінулага. Яна надзвычай чуйная да ўсяго мастацкага вопыту, назапашанага цывілізацыяй, пачынаючы ад сівога міфа, ад казкі, ад касмічна далёкага «Эпасу аб Гільгамешы». Сёння творча пераасэнсоўваюцца міфалогія, фальклор, парабала, прыпавесць, вандруючыя сюжэты — у імя пошуку тых жа «вечных» (а, значыць, і сучасных) ісцін.

Аднак гэтая натуральная і неабходная наша цікавасць да мінуўшчыны эксплуатуецца і

(Заканчэнне на стар. 6).

ЗМЕНЛІВЫЯ БЕРАГІ ЧАСУ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

псеўдалітаратурай, павярхоўнай белетрыстыкай. Псеўдалітаратура таксама даволі лёгка навучылася мадэліраваць тую распаўсюджаную сюжэтную сітуацыю, калі чалавек з'язджае з вёскі ў горад і там пачынае сумаваць па незваротным. Мала хто з празаікаў нават невысокай адоранасці не валодае сёння рамяством апісання побыту. Вось-вось навучацца гуляць у «рэтра», у гісторыю, закручваць схему ў яркую абгортку ўмоўнай вобразнасці.

У той жа час сапраўднай літаратуры, у яе напружаным пошуку вечнага, не трэба палохацца бягучага, змяшлівага, таго, што толькі-толькі пачынае праяўляцца ў нашым быцці. Прабелы ў нашым веданні гісторыі ўжо цяпер даволі паспяхова запаўняюцца літаратурай, цяжэй ёй даецца асваенне другога берага часу. У творах, што прэтэндуюць на філасафічнасць і блізкасць да агульначалавечых праблем, не стае часам болю і трывогі, уласцівых творам нашага, можна, сказаць, земляка Ф. Дастаеўскага і М. Гарэцкага, не стае ці то смеласці, ці то ўмення трывожыць чытача «вечнымі» пытаннямі.

Можна, пачынаючы ад Арыстафана, назваць шэраг майстроў слова, якія, абапіраючыся на бягучае, на палітыку, газетную хроніку, філасофскую палеміку сваіх дзён, тварылі тое, што пазней назавуць класікай. Класіка пішацца і сёння, толькі не наслеў яшчэ час дакладна і пэўна вызначыць: кім і менавіта якія творы. Слова за нашчадкамі, за будучым. І калі будучая літаратура пачне чэрпаць з мінулага, як гэта сёння робіцца сучаснымі мастакамі, то, напэўна ж, нашчадкі ацэняць не толькі тое, што празаікі дваццатага стагоддзя надзвычай цікавіліся гісторыяй, чэрпалі ў ёй сабе натхненне? Акрамя гэтага, павінна ж яшчэ нешта быць у спадчыне, якую пакінуць пісьменнікі 1980-х нашчадкам. Гэтае «нешта» — «дух» эпохі, яе духоўны змест, непарыўна звязаны як з мінулым, так і з бягучым, новым. Гэта ёсць у нашай літаратуры, але яна яшчэ не сплаціла ўвесь свой доўг перад будучым чытачом.

Мастацкаму слову часам не стае аператыўнасці, каб улавіць павевы гэтага новага, якое на вачах ператвараецца ў сталую з'яву, у тэндэнцыю. Куды лягчэй ёй удаецца адфільтраваць вонкавыя прыкметы сучаснасці, так што, чытаючы прозу ў часопісах, знаходзіш часам намёк на падзеі, якія адбываліся зусім нядаўна, ці не ўчора. Цяжэй адчуць тыя псіхалагічныя зрухі, што звязаны са зменай пакаленняў. Тут нямала значаць якія пяць-шэсць год — за гэты час падрастае новая моладзь, ужо не падобная да ранейшай. А літаратура мерае яе ўсё тымі ж меркамі: часам прыпісвае і ёй настальгію па вёсцы, часам прымушае размаўляць на тым жаргоне, які ўжо даўно адышоў у нябыт. Тым часам ужо ў горадзе нарадзілася і вырасла новая генерацыя «дзяцей», у якой свая настальгія, аб чым — літаратура толькі пачынае задумвацца.

У «Доказе ад процілеглага» В. Гігевіча ўражваюць вобразы маленькіх гараджан, чыю разгубленасць і нейкую нават дарослую непрыкаянасць аўтар разгледзеў скрозь абалонку адноснага дабрабыту, у якой яны жывуць, сярод інтэр'ераў добра абстаўленых кватэр, між мэблі, кніг і крышталю. Няма камфорту ў душы Сяргея, сына Эмы Міхайлаўны, двойчы разведзенай маці-адзіночкі, хоць тут, здавалася б, зразумелая прычына: адсутнасць бацькі. Але вось Разорчыкавы дзеці... Разорчыкава ўпэўненасць, сялянская засяроджанасць, з якой ён дакопваецца да сэнсу жыцця, не перадалася чамусьці ім. Хоць, калі разабрацца, Разорчык сам яшчэ не дужа ўсвядоміў, чаго хоча ад уласных дзяцей і што ён хоча для іх. Дзеці ж яшчэ і даволі апатычныя: яны нібыта разбучыліся здзіўляцца, няма быццам бы такога, што разварушыла б іх. Сімптомы такой ненатуральнай для дзяцей «умудронасці» можна назіраць у рэальным жыцці, асабліва сярод гарадскіх дзяцей.

У рамане В. Гігевіча кантакт паміж «бацькамі» і «дзецьмі» выглядае парушаным у нейкім звяне. Але аўтар ідзе, як мы памятаем, ад «процілеглага». Пры гэтым маецца на ўвазе, што ёсць падлеткі, юнакі, якія не развучыліся шукаць, здзіўляцца, любіць, тварыць. Ды пошуку героя ў гэтай маладзейшай генерацыі замінае, пэўна, тая відавочная перашкода, пра якую так слушна сказаў у сваім артыкуле М. Кенька. Празаікі, асабліва з «малодшых», нібыта развучыліся ўжыванню ў вобраз, мастацкаму пераўвасабленню. Іх творы найчасцей нараджаюцца ян вынік актуалізацыі прыватнага вопыту, без асабліва глыбокіх экскурсаў у чужыя лёсы. Хто ж тады занатуе думкі, душэўныя памкненні сучаснага падлетка, не таго, які з 60-х, пра якога мы, бадай, усё ведаем?

Гэты пошук тым больш не просты, што сённяшнія дзеці жывуць у спакайнейшым асяродзі, чым «дзеці вайны», і таму формы гераічнага дзеяння, якія выявіліся ў змаганні з ценямі мінулага ў Колькі Лецечкі, ім недаступныя.

Усцешвае, што спроба адолець прыцягненне «біяграфізму» была ўсё ж зроблена маладым празаікам У. Арловым у аповесці «І вярталіся мы...», надрукаванай у сёмым нумары «Маладосці» за гэты год. Этычная ацэнка ўчынкаў персанажаў — «бацькоў» і «дзяцей» — праводзіцца аўтарам паводле даволі выразна акрэсленай шкалы — вернасці памяці, памяці гістарычнай. Такім чынам на адным з палюсоў аказваецца аматар пірагоў і пампушак з макам Бясперстых у кампаніі з Васькам па мянушцы Казёл, на другім — Раман Галубовіч з кампаніяй дзецюкоў-аднадумцаў, а разам з імі і «вядомы пісьменнік» Васіль Максімавіч.

Гэта ўжо нешта істотнае ў спробе літаратуры адшукаць героя сярод малодшых прадстаўнікоў грамадства — тых, хто не ведае былой вайны, чыё жыццё з самага пачатку праходзіла ў мірны час. Праўда, маладому празаіку не стае пакуль што далікатнасці ў мастацкай рэалізацыі думкі, паўнаты ўвасаблення характараў. Каб падключыць гісторыю да твора аб сучаснасці, трэба важкая сістэма аргументацыі, якая пераканае чытача ў тым, што ўсё гэта — памяць аб даўно прайшоўшым — жыццёва неабходнае сучаснаму чалавеку, моладзі. Такіх аргументаў у творы не знаходзіш.

Герою, Раману Галубовічу, так і не было дадзена слова, калі не лічыць некалькіх вытрымак з ягонага дзённіка, у той час як усе астатнія персанажы, нават Васька-Казёл, уволю карыстаюцца правам унутранага маналогу.

Ды не будзем занадта строга падыходзіць да слова, якое ўсё ж вымаўлена, у той час як старэйшыя за У. Арлова таварышы па пяру не спяшаюцца пакуль што выказаць сваю думку аб «дзецях» нашага часу, з якіх неўзабаве вырастуць новыя «бацькі», вырасце будучае. Не будзем занадта строга падыходзіць да аповесці У. Арлова і таму, што ў «Маладосці» надрукаваны часопісны варыянт.

Літаратура ў нашы дні грунтоўна засвойвае вопыт мінулага, гісторыю, падключаючы іх да радасцей і трывог бягучага дня. Хочацца, каб яна была паслядоўная да канца — праяўляла больш увагі і грамадзянскага клопату аб тым, што на нашых вачах становіцца гісторыяй ці вось-вось ёю стане.

ВІНШУЕМ

Яну СКРЫГАНУ — 80

Заўтра, 16 лістапада, спаўняецца 80 год вядомаму беларускаму пісьменніку Яну Скрыгану. Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР шчыра віншуе яго з юбілеем:

«Дарагі Іван Аляксеевіч!

Шчыра віншуем Вас, натхнёнага майстра беларускай савецкай прозы, выдатнага апавядальніка, у дзень Вашага 80-годдзя!

Нарадзіўшыся ў сялянскай сям'і на Случчыне, Вы праз усё жыццё захавалі непаўторнае хараство цэнтральных гаворак Беларусі, што склалі аснову сучаснай літаратурнай мовы нашага народа. Апантанасць народнай моўнай стыхіяй і вызначае адметны характар Вашага літаратурнага пісьма, якое Вы пачалі ў 1924 годзе, калі пасля вучобы ў сельскагаспадарчым тэхнікуме пайшлі працаваць у рэдакцыю слуцкай акруговай газеты «Вясковы будаўнік». Потым Вы загадвалі нардомам у Расонах, былі супрацоўнікам рэдакцый газеты «Чырвоная Полаччына», дзе і апублікавалі свае першыя апавяданні.

Неўзабаве Вы паступаеце ў Беларускі дзяржаўны універсітэт, становіцеся членам творчых аб'яднанняў «Маладняк», «Літаратурна-мастацкая камуна», і вось ужо 60 з лішнім гадоў трывае Ваша нястомная дзейнасць на ніве літаратуры. Удзел у календыўных выданнях і альманахах, а пасля самастойныя кнігі нарысаў «Шугае сонца», «Недапісаны профіль», кнігі прозы «Затока ў бурах», «Каця Лапянкова», «Сустрэчы» — такі быў Ваш набытак на пачатку творчага шляху.

Плён Вашай творчасці пасляваенных гадоў — кнігі апавяданняў «Наталя», «Няпрошаная сляза», «Скажы адно слова», «Свая аповесць» і «Кругі», зборнікі «Ранішнія росы» і «Некалькі хвілін чужога жыцця». Вы ўмееце зазіраць у глыбокія тайнікі свае памяці, каб заражаць чытача подыхам пражытага Вамі, Краінай Саветаў і беларускай літаратурай часу.

Заўсёды звяртаюць на сябе ўвагу Вашы выступленні ў друку па праблемах літаратурнага майстэрства і асабліва па культуры мовы. Багаты плён маеце Вы і ў галіне мастацкага перакладу, галоўным чынам з рускай мовы (М. Горкі, І. Бунін, Ф. Гладкоў, К. Федзін), з моў многіх братніх рэспублік.

Актыўны ўдзел бераце Вы як камуніст у грамадскім жыцці Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам якога з'яўляецеся ад першага дня яго ўтварэння. Асабліва прыкметная Ваша дзейнасць у выхаванні літаратурнай моладзі.

Значны ўклад Ваш у развіццё беларускай савецкай літаратуры адзначаны прысваеннем Вам пачэснага звання заслужанага работніка культуры Беларускай ССР, якое Вы атрымалі на пасадзе адказнага сакратара Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

За ўдзел у выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Вам прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.

Віншуючы Вас, дарагі Іван Аляксеевіч, з юбілеем, жадаем добрага здароўя, заўсёднай творчай актыўнасці, каб прымнажаць і далей скарбніцу беларускай савецкай літаратуры новымі здабыткамі Вашага нястомнага пяра».

Калектыў штотыднёвіка далучаецца да гэтых цёплых пажаданняў.

ПРАЎДА МОВЫ

Як адзначае У. Юрэвіч, «праца над словам — самы пакутлівы этап творчасці, але і самы высокамаральны ўчынак». Беларуская літаратура дае ўзоры такой сумленнай, высокамаральнай працы, яскравыя прыклады беззаветнага служэння роднаму слову. Выдатныя пісьменнікі В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Цётка, Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч мужна адстойвалі права беларусаў на карыстанне роднай мовай, сваёю творчасцю развівалі і ўзбагачалі літаратурную мову, выказвалі ў беларускім слове спадзяванні народа на лепшую долю. Згадаем славутую прадмову Ф. Багушэвіча да зборніка «Дудка беларуская», палымяны зварот Цёткі да моладзі «Шануйце роднае слова!», прасякнуты болем за роднае слова допіс маладога Якуба Коласа ў газету «Наша Ніва» пад назвай «Беларуская мова ў казённай школе». А выдатны вынік Купалавых вершаў, у якіх моцна гучаць асноўныя матывы: «Магутнае слова, ты, роднае слова!», «Як жыло ты з намі — будзеш вечна жыці, грамадой мільёнаў з светам гаманіці...».

У савецкі час вельмі плённа працавалі дзеля роднага слова Кузьма Чорны і Уладзімір Дубоўка. У апошнія дзесяцігоддзі з'явіліся публікацыі М. Лужаніна, Я. Скрыгана, Р. Шкрабы, В. Быкава, Н. Гілевіча, іншых пісьменнікаў, прысвечаныя мове. Асноватворнае значэнне для беларускіх літаратараў і лінгвістаў маюць меркаванні, думкі, выкладзеныя ў артыкуле Якуба Коласа «Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову».

Пастаноўкай актуальных пытанняў культуры мовы, глыбінёй іх асэнсавання вызначаюцца артыкулы Яна Скрыгана «Думкі аб мове», «Яшчэ трохі аб мове», «Чары слова», «Блізкія сэрцу думкі», «Беглыя запі-

У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ШУКАЦЬ, ЗНАХОДЗІЦЬ, АДКРЫВАЦЬ

З АГУЛЬНАГА СХОДУ ПРАЗАІКАЎ

Напярэдадні XXVII з'езда КПСС, XXX з'езда Кампартыі Беларусі, пісьменніцкіх з'ездаў актывізавалася работа секцый, больш актыўнымі сталі літаратары ў час абмеркавання надзённых пытанняў творчага жыцця. Што гэта сапраўды так, пераканаў і агульны сход празаікаў, на якім было абмеркавана пытанне пра «Адлюстраванне ў сённяшняй прозе актуальных праблем сучаснасці».

Тон гаворкі задаў загадчык рэдакцыі прозы выдавецтва «Мастацкая літаратура» **М. Кусянкоў**, які звярнуўся да разгляду твораў, што з'явіліся ў перыядычным друку, былі выдадзены асобнымі кнігамі ў апошнія пяць гадоў. Гэта якраз час, што прайшоў пасля папярэдніх з'ездаў—і партыйных, і пісьменніцкіх. Ён быў пазначаны найперш такімі цікавымі і значнымі творамі, як «Петраград—Брэст» І. Шамякіна, «Знак бяды» В. Быкава, «Алімпіяда» І. Пташнікава, «Свае і чужынцы» І. Чыгрынава і іншымі, рознымі ў ідэйна-тэматычных і жанрава-стылявых адносінах, але аб'яднаных высокім аўтарскім майстэрствам.

Калі гаварыць аб адлюстраванні ў прозе актуальных праблем сучаснасці, падкрэсліў прамоўца, дык перш за ўсё трэба адказаць на пытанне, якое месца ў літаратуры займае тэма змагання за мір і сацыялізм. Правільней нават будзе гаварыць пра палітычны жанр, хоць гэтае вызначэнне і не ўсе прымаюць. Але ён існуе і пра яго гэтаксама трэба гаварыць як і пра жанр контрпрапагандысцкі. На жаль, пакуль што ў гэтым кірунку з'явілася мала твораў. У якасці прыкладу М. Кусянкоў спаслаўся на аповесці «Дарога ў Хатынь» Б. Сачанкі і «Два Генрыхі» М. Гроднева, апублікаваныя ў «Полымі».

Прамоўца спыніўся на праблеме ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей. Сёння старэйшаму пакаленню, падкрэсліў М. Кусянкоў, трэба адказваць перад сваім сумленнем як бы за два жыцці—за ўласнае і за наступнае. Сённяшні дамініруючы клопат пажылога чалавека пра тое, а што ж будзе пасля з яго дзецьмі і ўнукамі, як ніколі абвастрае яго ўвагу да таго, як жывуць яны, яго дзеці і ўнукі. Падобны пафас адчувальны ў такіх творах, як «Паляванне на апошняга жураўля» А. Жука, «Ноч перад нядзеляю» З. Прыгодзіча, «Прагал» М. Гіля і іншых.

Засяродзіўшы ўвагу на гэтых творах, а таксама на тых, рукапісы якіх аўтарамі прадстаўлены ў выдавецтва «Мастацкая літаратура», М. Кусянкоў выказаў заклапочанасць тым, што ў некаторых творах пасляваенны час паказваецца нейкім абстрактным. Цяжка здагадацца, калі адбываецца дзеянне. У сапраўдных пісьменнікаў такога не бывае. Калі я чытаю раман «Летуценнік» І. Навуменкі, заўважыў М. Кусянкоў, дык трапляю ў атмасферу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Свайму раману «Алімпіяда» І. Пташнікаў нават даў падзагаловак — «Воблакі шасцідзесятых». На шасцідзесятыя гады прыпадае і дзеянне аповесці Т. Бондар «Жывыя жывуць». Яшчэ пазнейшы час адлюстраваны ў аповесцях А. Жука. Менавіта з такіх твораў, з іх сістэмы выводжу я сваё разуменне пасляваеннага часу як сумы вельмі

сы» і інш. Каштоўнасць названых публікацый у тым, што Ян Скрыган, грунтуючыся на пільным, багатым нагляданні і аналізе моўных фактаў, з'яў, адлюстраваных у мастацкіх, публіцыстычных, навуковых тэкстах, у вусным маўленні, улічваючы мовазнаўчы і літаратурны вопыт іншых пісьменнікаў, зрабіў нямала тонкіх, дакладных вывадаў, заўваг адносна ўжывання некаторых слоў і сказаў, даў карысныя парады, рэкамендацыі з абсягу моўнай, мастацкай культуры.

Галоўная думка, якая праходзіць праз усе артыкулы, выказванні: пісьменнік павінен пільнавацца (дамагацца) праўды мовы. І калі Ян Скрыган прапануе нашай увазе фразы накшталт «Тут вытвараецца продаж марак», якія часам трапляюцца на шыльдах, у аб'явах, і — вуснамі героя — абураецца іх штучнасцю, дык абурэнне гэта зразумелае: ён хоча, каб фраза гучала праўдзіва, як яна гучыць у жывой мове народа. Дарэчы, крытэрый «гавораць (ці не гавораць) так людзі» выкарыстоўваецца пісьменнікам пры ацэнцы тых ці іншых ужыванняў вельмі эфектыўна.

Разуменне праўды мовы, паводле Яна Скрыгана, ёмістае, яно ўключае істотныя характарыстыкі слова, сказа, тэксту. Праўда мовы — гэта перш за ўсё яе дакладнасць: «Я прывык за словам бачыць той сэнс, які памятаю з матчынай мовы, з дзяцінства» («Чары слова»).

Слова праўдзівае, калі яно не штучнае, наспех прыдуманае, а жывое, узятае з моўнай скарбонкі народа, калі яно ўжыта ў адпаведнасці з яго лексічнай і граматычнай спалучальнасцю і мае тую стылістычную афарбоўку, «акрасу», якая вымагаецца канкрэтным кантэкстам.

Фактычна ўвесь ілюстрацыйны матэрыял, які прыводзіцца ў артыкулах Яна Скрыгана, пацвярджае думку, што праўда, натуральнасць мовы — адзін з асноўных фактараў, якія прадвызначаюць поспех літаратурнага твора. Пісьменнік умее заўважыць і паказаць мастацкія вартасці твораў і калег-літаратараў, і аўтараў-пачаткоўцаў. Як прыклад, назавём разгляд аповесці А. Кулакоўскага «Да ўсходу сонца». Прасочваючы асаблівасці яе кампазіцыі, выкарыстанне моўна-выяўленчых сродкаў, Ян Скрыган нібы дае ўрок майстэрства, раскрывае «творчы сакрэт Кулакоўскага» («Аповесць пра мужных людзей»).

Удала выбраны таксама прыклады з моўнымі заганамі. Іх каментарый, рэдагаванне — своеасаблівы практыкум культуры мовы. Цяпер, калі выйшаў Тлумачальны слоўнік з 6-ці кніг, ёсць дзе атрымаць патрэбную даведку наконт значэння слоў. Але ў ТСБМ бедна пададзена спалучальнасць слоў. Гэты аспект лексіка-граматычнай характарыстыкі слоў добра выяўлены ў артыкулах Яна Скрыгана. У полі зроку аўтара і чытача — дзесяткі слоў. Прычым не рэдкіх, не вузкага ўжывання, а тых, што маюць высокую частотнасць: валодаць, вырашыць, накіравацца, шлях, стан, імкнуцца, таропка, узняць, узводзіць, трапіць, хораша, клопат, аднойчы, дабрыня і інш. Здавалася б, зразумелыя, «лёгкія» словы... Але ж якраз імі, даводзіць пісьменнік, мы часта не ўмеем карыстацца, ужываем не так, як трэба. Грунтоўна, даходліва — абапіраючыся на моўную практыку народа — Ян Скрыган тлумачыць, якія лінгвістычныя і экстралінгвістычныя фактары неабходна ўлічваць пры ўжыванні слова, звяртае ўвагу на сэнсавыя, эмацыянальна-экспрэсіўныя, стылістычныя адценні слоў, на гучанне. Так, прывёўшы колькі сказаў, у якіх ужыта слова ВЫРАШЫЦЬ, Ян Скрыган у каментарыі да іх адзначае: «Нельга сказаць, каб гэта было няправільна. Сэнс перададзены. Але ж ці хапае гэтага? Ці не абакралі мы сябе, заспакоіўшыся толькі на сэнсе? А дзе ж каларыт мовы, дзе тыя адценні, якія кожнаму выпадку надаюць свой характар? Дзе ж багацце, якое так і пераліваецца ў жывой гаворцы?» («Яшчэ трохі аб мове»).

Пісьменнік прапануе блізказначныя словы, якія могуць замяніць у кожным выпадку дзеяслоў **вырашыў**. Гэта: надумаў, захацеў, сабраўся, насмеліўся, намысліў, намерыўся.

Працуючы над мастацкім творам, трэба імкнуцца да натуральнасці гучання мовы. Для гэтага неабходна браць пад увагу не толькі будову сказа, значэнне і форму слоў, але і іх «акрасу», «фарбы». На думку Яна Скрыгана, вялікі стылявы недахоп твора — «лішкоты ў «харастве», «штучнае «літаратурнае» хараство», «бліскучыя слоўныя выверты». І горш тое, што не ўсе разумеюць небяспеку такой «моўнай хваробы»: «Многім здаецца, што ўзнёслыя, пышныя словы з'яўляюцца адзнакамі высокага хараства. Але гэта няпраўда. Найлепшае хараство ў самай звычайнай прастаце. І ў тым, каб сказанае выглядала свежа» («Ненадрукованыя запавяданні»).

Характар моўнага выказвання мусіць адпавядаць вобразу, які ствараецца пісьменнікам. У адваротным выпадку можа напаткаць няўдача. Ян Скрыган называе аднаго празаіка, якому «лёгка даецца вобраз селяніна, а вобраз рабочага або інтэлігента не ўдаецца, бо тут трэба палітра другая. Гэта ўжо прыклад таго, як нядобра ў літаратурнай мове капіраваць народную, быць у яе ў палоне» («Яшчэ трохі аб мове»). З другога боку, наўрад ці хто паверыць у праўду вобраза, калі селянін будзе гаварыць штучнай, робленай фразай: **«Я не ў стане пайсці** на работу».

Аналіз мастацкіх твораў даў магчымасць Яну Скрыгану сфармуляваць вывад: «Праўда мовы — гэта і праўда вобраза, і праўда душы, і праўда атмасферы» («Яшчэ трохі аб мове»).

Штучная, робленая мова — вялікая загана твора: «Асаблівa псуюць і калечаць мову бяздумныя калькавыя пераклады і так званыя канцылярыты, калі і само слова, і канструкцыя фразы робяцца сілком, насуперак законам мовы» («Чары слова»). Часам «такія бяздумныя пераклады перадаюць не той сэнс ці, яшчэ больш — набываюць адваротны сэнс». А фразы пазбаўляюцца свае натуральнасці і хараства.

Гаворачы пра тое, што ў літаратурнай мове павінна быць народная аснова, дбаючы пра захаванне моўных традыцый, пра ўзбагачэнне літаратурнай мовы з гаворак, Ян Скрыган выказвае клопат, што «трапляюцца ў нас яшчэ і паўзучая спрошчанасць, і архаізмы, і дыялектызмы, карыстанне якімі наўрад ці можна апраўдаць» («Яшчэ трохі аб мове»).

Праўда, рэальнасць мовы патрабуюць, каб улічваліся змены ў мове, каб праблемы моўнай культуры ставіліся ў залежнасць ад узроўню мыслення: «Гэта натуральна: развіваецца грамадская думка, расце культура мыслення, павінна расці і культура слова, сказа, мовы. На жаль, мы вельмі не заўважаем сувязі гэтых паняццяў. Многія работнікі культурных і пісьменніцкіх прафесій вымушаны паступова замаўкаць, сціскацца і зусім творча паміраць толькі таму, што паступова і непрыкметна адсталі ад філасофіі часу, ад культуры мыслення і спосабу перадачы думкі. Культура ва ўсіх выпадках — гэта паглыбленне. Пісьменнік скрозь павінен ісці толькі ўпоравень часу, каб не стаць прымітывам» («Блізкія сэрцу думкі»).

Праўду мовы, нарэшце, трэба разумець і як жыццёва праўдзівы паказ дзейнасці і пачуццяў чалавека. Так паступова, але няўхільна бярэ пісьменнік нас, чытачоў, пад уладу сваёй канцэпцыі мастацкай мовы.

Выпрацаваны пісьменнікам прынцыповы падыход да мовы адыграў сваю станоўчую ролю ў той час, калі ён узначальваў літаратурна-кантрольную рэдакцыю БелСЭ. Ян Скрыган прыгадвае:

«Калі я пусціўся ўжо быў у нажыты адпачынак, а Броўка распачаў дванаццацітомную Беларускую Савецкую Энцыклапедыю, ён сказаў мне:

— Памажы. Ты ж ведаеш, энцыклапедычнага стылю ў нас няма, яго трэба рабіць. Каб ён быў і навуковы, і просты. Эканомны, сціслы — і кожнаму даступны. Каб мова ў нас была не адарвана ад народнай. Абавязкова каб была народная аснова!» («Пра даўняга сябра»).

Шмат зрабіў Ян Скрыган для таго, каб выклад у БелСЭ, які грунтуецца на літаратурнай мове, у разумнай меры ўзбагаціўся з крыніц жывой народнай мовы, каб ён быў навукова дакладны і ў той самы час даступны масаваму чытачу. Гэтая праца пісьменніка адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР.

Вернемся зноў да працытаванага вышэй успаміну Яна Скрыгана. Заўважце, як натуральна, проста, у гутарковай манеры выклаў Пятрусь Броўка сур'ёзную дзелавую прапанову. А як свежа, індывідуальна выкарыстаны агульнаўжывальныя моўныя сродкі ў аўтарскай мове пісьменніка! Ян Скрыган не толькі пазбегнуў штампа **заслужаны адпачынак**, але і выказаў думку глыбей: **нажыты** — гэта не адно заслугі, гэта ўсё жыццё з яго радасцю і пакутай...

Чытаючы апавяданні і аповесці Яна Скрыгана, яго замалёўкі і ўспаміны, не толькі багацееш душою, але і папаўняеш свае моўныя запасы. Вось прыклад. Не заўсёды лёгка знаходзіцца адпаведнік рускага **общение**. Некалі Янка Брыль удала перадаў яго словам **дружба**: «Ад радасці дружбы з ягонай душой (харошае рускае слова **общение!**) я ўжо не перапісваў Горкага ў патаемны самаробны сшытак,— я з асалодай творчай працы перакладаў «Мае універсітэты», з сярэдзіны пазнаючы сакрэты яго слова» («Быць чалавекам»).

А паглядзіце, як непрыкметна і на месцы стала для выражэння такога самага сэнсу слова **кантактаванне** ў Скрыгановай згадцы пра Петруся Броўку: «Для мяне Пятрусь Броўка — гэта цэлае жыццё. Пяцьдзесят чатыры гады таварышавання, веры адзін аднаму, патрэбы ў духоўным кантактаванні» («Пра даўняга сябра»).

Памятаем, перачытваем, вывучаем працы Яна Скрыгана пра родную мову. Некаторым з іх — дваццаць, трыццаць гадоў. Але яны сучасныя, надзённыя, бо ў іх — праўда жыцця, праўда мовы, праўда мастацтва!

Як добра, што побач з намі (наперадзе нас!) ідзе сціплы і мудры Майстар, шчыры і нястомны дарадца.

Алесь КАУРУС.

складаных рэальнасцей, абумоўленых, у прыватнасці, і тым, што мы ўсё далей аддаляемся ад вайны, што падрастаюць пакаленні, якія вайны ўжо не помняць.

У сваім выступленні М. Кусянкоў неаднойчы звяртаўся да артыкулаў, змешчаных у «ЛіМе» пад рубрыкай «Сучаснасць і сучасная літаратура», а таксама да іншых крытычных публікацый у друку. У асноўным згаджаючыся з аўтарамі, у чымсьці палемізуючы. У прыватнасці, прамоўца заўважыў, што крытык В. Івашчанка, гаворачы ў «Немане» пра раман І. Пташнікава «Алімпіяда», павярхоўна паставіўся да вобраза Тані.

Імпануюць М. Кусянкову і маладыя героі з іншых твораў — аповесці «Надзеевіч» Н. Маеўскай і рамана «Футбол на замініраваным полі» Л. Дайнекі. Увогуле ж, падкрэсліў прамоўца, літаратуры сёння патрэбен герой унутрана-дзейснай, аптымістычнай скіраванасці. Гэты аптымізм павінен увайсці, калі можна так сказаць, у склад таго глыбокага псіхалагізму героя, у якім адлюстраваўся б складаны чалавечы драматызм і дыялектызм нашага часу.

Апошнія дакументы нашай партыі, сказаў у заключэнне М. Кусянкоў, новая рэдакцыя Праграмы КПСС арыентуюць пісьменніка на выяўленне складаных праблем жыцця, на сцвярджэнне ўсяго новага, прагрэсіўнага, на барацьбу з адсталым. Сённяшнія рашэнні партыі маюць агульнасацыяльны, філасофскі характар, нават тыя з іх, якія, на першы погляд, здаюцца канкрэтна-эканамічнымі. У сувязі з гэтым ўзрастае і адказнасць літаратуры, і адкрываецца перад пісьменнікамі шырокае поле дзейнасці.

У. Конан, які прадоўжыў гаворку, даў ацэнку маладой прозе, звярнуўшыся да твораў, якія ў апошні час былі змешчаны ў часопісе «Маладосць», аповесцей У. Арлова «І вярталіся мы...», «Сяргей Сяргеевіч» В. Супрунчука, «Цяжкі хлеб» А. Жалязоўскага. Творы гэтыя, у першую чаргу аповесць У. Арлова, прыцягваюць увагу сацыяльна-культурнай, духоўна-этычнай праблематыкай. Цікавым атрымаўся вобраз навуковага супрацоўніка музея Рамана Галубовіча, хоць пазіцыя якога ў нечым і рацыяналістычная, але ў многім апраўданая. Прыемна і тое, што аўтар шукае новыя выяўленчыя сродкі, імкнучыся разнастаіць вобразную палітру твора. І У. Арлоў, і В. Супрунчук, і А. Жалязоўскі імкнуцца паказаць герояў актыўнай жыццёвай пазіцыі, якія смела сцвярджаюць свае жыццёвыя ідэалы. На думку У. Конана, аповесць А. Жалязоўскага ў нечым нават пераклікаецца з творам У. Арлова. Праўда, аўтарам не ўсё ўдаецца ў аднолькавай ступені. Дае знаць аб сабе другаснасць асобных момантаў, заўважаецца пэўная літаратурная рэмінісцэнцыя.

Вострым было выступленне **А. Карпюка**, на думку якога, няма патрэбы займацца высвятленнем таго, пра што пісаць. Сам пісьменнік выбірае тое, да чаго лепш ляжыць яго душа, пра гэта ён і зможа расказаць лепш і глыбей за іншых. Шмат у апошні час гаворыцца і аб мове мастацкіх твораў. І тут, мяркуе А. Карпюк, назіраецца нейкая аднабаковасць, калі сёй-той з крытыкаў ды і самі пісьменнікі празмерна засяроджваюць увагу толькі на моўным майстэрстве, не гаворачы пра твор у цэлым. Але зноў жа—будзе ў пісьменніка душэўная патрэба пісаць, знойдуцца і адпаведныя словы.

Крытыка павінна чуйна прыслухоўвацца да кожнага сапраўднага таленту, бачачы яго адметнасць. На думку А. Карпюка не знаходзяць прынцыповай ацэнкі шмат якія значныя творы. У прыватнасці, ён спаслаўся на раманы «Петраград — Брэст» І. Шамякіна, «Чужая бацькаўшчына» В. Адамчыка, «Алімпіяда» І. Пташнікава. У той жа час у артыкулах і аглядах фігурыруюць адны і тыя ж назвы, прозвішчы адных і тых жа аўтараў. Маўляў, кожны крытык піша пра тое, пра што хоча, называе аўтара, які яму нечым імпануе.

Па-ранейшаму ў нас мала твораў з героем сацыяльна-актыўным, дзелавым, сказаў **В. Хомчанка**. І задача крытыкі своечасова заўважаць кожны твор, у якім выразна бачыцца грамадзянская пазіцыя пісьменніка, назіраецца пільная ўвага да надзённых праблем жыцця і высокае мастакоўскае асэнсаванне іх. Да такіх твораў прамоўца аднёс раман «Алімпіяда» І. Пташнікава, а таксама раман «Матчына хата» Л. Гаўрылкіна, які, на яго думку, тое лепшае, што на сённяшні дзень напісаў аўтар. Маладыя літаратары, працягваў В. Хомчанка, бяруцца за шмат якія творы. Гэта, як быццам і няблага, але трывожыць тое, што, не ведаючы жыцця, ваенных абставін, некаторыя мяркуюць, што пра вайну пісаць лёгка, таму і з'яўляюцца творы, у якіх сустракаюцца недакладнасці ў адлюстраванні ваеннага побыту, рэалій. Прамоўца прывёў вытрымкі з паасобных такіх публікацый.

Пытанням суаднясення праўды мастацкай і праўды жыццёвай было прысвечана выступленне **У. Федасеенкі.**

З крытыкамі, якія ў апошні час разглядалі творчасць В. Гігевіча, не рагадзілася **В. Гапава.** Як мяркуе яна, аўтары рэцэнзій і артыкулаў не заўсёды заўважаюць галоўнае, што характарызуе творчасць гэтага пісьменніка, найперш — адчуванне ім таго новага, што адбываецца ў жыцці, а звяртаюць увагу на другаснае і неістотнае. Гаварыла В. Гапава і пра развіццё мемуарна-эсэістычнага жанру, адзначыўшы як мастакоўскае дасягненне тое, што з'яўляецца з-пад пяра Я. Брыля, у тым ліку і новую кнігу пісьменніка «Сёння і памяць».

Надзённым пытанням літаратурнага жыцця, актывізацыі творчай дзейнасці пісьменнікаў, у цэлым, і крытыкі—у прыватнасці — былі прысвечаны выступленні **Х. Лялько, Ю. Канэ, А. Сідарэвіча.**

Вынікі гаворкі падвёў старшыня бюро секцыі прозы, народны пісьменнік Беларусі **В. Быкаў**, які вёў сход. Зразумела, сказаў ён, кожны пісьменнік піша аб тым, што найбольш яму блізка, дорага, але не варта забываць, што яго здольнасці, талент фарміруюцца самім жыццём, тым сацыяльным асяроддзем, у якім жыве і творыць мастак.

Кожная літаратура хоча мець героя, вартага пераймання, здольнага быць своеасаблівым ідэалам. Але ні ў якім разе нельга забываць, што немагчыма стварыць тое, чаго няма ў сапраўдным жыцці.

Усе мы, працягваў прамоўца, былі сведкамі крушэння многіх, саміх па сабе добрых намераў, якія зместам сваім не былі звязаны з паўсядзённасцю. Задача літаратуры і заключаецца ў тым, каб адлюстроўваць жыццё ва ўсёй яго шматграннасці і складанасці. Праўда, тут павінна быць больш апрарлівай і ўважлівай крытыка. Сёння ж, сказаў В. Быкаў, назіраецца і так, што паасобныя крытыкі паводзіны, меркаванні суадносяць з пазіцыяй самога пісьменніка. Маўляў, які персанаж, такая і пазіцыя аўтара. Але галоўнае, каб характар быў жыццёвым, а калі ён будзе жыццёвым, дык будзе і праўдзівым.

Як паказаў сход, празаікі рэспублікі, разумеючы адказнасць задач, якія стаяць на сучасным этапе перад літаратурай, поўныя рашучасці ствараць творы, вартыя нашага велічнага часу, якія б праўдзіва, глыбока і шматгранна адлюстроўвалі жыццё на розных гістарычных этапах.

Наш кар.

Мікола МАЛЯЎКА

Малюнак

Мара дзіцячая:
У паднябессі—
Выбуху
Страшны клубок,
І пераможна
Яго перакрэсліў
Белым крылом
Галубок.

Бачу,
Мастачка мая
Засынае.
Ціхая ноч
У акне.
А на душы
Неспакойна:
Не знаю,
Заўтра прачнёмся
Ці не.

Радыё ўключыш,
Чытаеш газету—
Сон адбіраюць
Яны:
Цяжка трывожаць
Навіны з-за свету,
Быццам за дзень
Да вайны.

Можа,
Малюнак—
Дзіцячую мару
Спаліць агонь
На сцяне.
Самі згарым
Ад ракетнага ўдару,
Я і дачушка—
У сне.

Думак хвалюючых,
Думак назойлівых
Зноў разматаўся
Клубок.
Ці перакрэсліць
Іх заўтра,
На золку,
Белым крылом
Галубок?

Голуб міру

Неспадзявана сцьмеў блакіт
Ад навіны з эфіру:
Загінула Саманта Сміт—
Маленькі голуб міру.

І крылы за спіной былі,
Ды ноч там, на радзіме,—
Не даляцела да зямлі
І мамы не абдыме.

З душою чыстай, як сляза,
Яна ляцела ў заўтра
І не баялася сказаць
І прэзідэнту праўду
Пра дом наш—
Светлы і ўначы,
Пра клопат наш і мару:
Зямлю ў палёце зберагчы
Ад ядзернага ўдару.

Яна спявала пра любоў
Да краю, дзе ніколі
Не забіваюць галубоў—
Пасільных добрай волі.

Не сцьмее памяці блакіт,
І там з усмешкай шчырай
Ляціць яна,
Саманта Сміт—
Маленькі голуб міру.

Дзіцячая асамблея

На розум бацькоў надзея.
Збіраецца ўсё часцей
Сусветная Асамблея
Зямлян маленькіх—дзяцей.

— Абараніце!—
Звяртаюцца дзеці да нас.
Расце на зямлі, у жыце,
Смяротнай зброі запас.

Падумаю, як дзіўнавата
І страшна мне—
Бацька сам:
Звяртаюцца дзеці да татаў!
Звяртаюцца дзеці да мам!

Як быццам бацькам не дорага
Зямля, дзе працуем і спім,
Як быццам усе мы ворагі
І дзецям, і ўнукам сваім.

— Абараніце!—
Звяртаюцца дзеці да нас.
А ўжо расце і ў блакіце
Смяротнай зброі запас.

На сэрца бацькоў надзея,
І час яе спраўдзіць нам.
Сусветная Асамблея
Дарослых—татаў і мам.

Суд народаў

Гарэў ты у вайну, мой край.
І іх, фашысцкіх верхаводаў,
За ўсе магілы
Пакараў
Не божы суд,
А Суд народаў.

На свеце тым баліць в'етнамцам,
Глядзяць адтуль—у вочы нам:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы—
За В'етнам?»

На свеце тым баліць ліванцам,
Глядзяць адтуль—як праз туман:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы—
За Ліван?»

На свеце тым баліць зямлянам,
Усім забітым—не да сну:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы—
За вайну?»

Яны звяртаюцца да нас,
Жывых, з адной планеты родам—
І мусіць
Мёртвым даць адказ
Не божы суд,
А Суд народаў.

Касманаўты

У чужой старонцы рад і варонцы.

А ім нялёгка недзе
Пры зорках і пры сонцы:
Працуюць людзі ў небе—
Нібы ў чужой старонцы.

Вандроўнікі за светам
Варону ўбачаць—рады.
А ім жа, людзям гэтым,
Няма такой спагады.

Адкрыты імі космас—
Далёкая старонка,
Туды ад нас ніколі
Не даляціць варонка.

Паспагадайце дома,
У думках блаславіце—
Каб ім, зямлянам, добра
Жылося на арбіце.

Сустрэча з лесавозам

На раздарожжы сустрэліся,
Як сябры...
Вось дык госць!
Быццам з далёкай Карэліі
Едзе мая маладосць.
Многа вятроў пранеслася,
Многа сплыло вады.
І на лесавозе цесна
Сосны ляжаць—
Як гады.
Бачыцца мне палянаю
Тое жыццё—
У тайзе:
Сосны людзьмі спілаваны,
Часам—гады...
І вязе,
Можа, самае мілае,
Самае лепшае
Лёс:
Дарагімі ўспамінамі
Гружаны ён, лесавоз.
Сосны ўстаюць над палянаю—
Тыя, што падалі з пня,
Запрашаюць
з каханаю
Заблудзіцца да дня.
Як і я маладыя,
Хлопцы бягуць з лесасек—
І жывыя,
І тыя,
З кім развітаўся навек.
Зачакаліся, мусіць,
Рад і сам, як малы.
Чую, цвярдзеюць мускулы,
Як у тайзе—
Ад пілы...
З лесавозам сустрэліся—
І знікае ён, госць,
Быццам назад, у Карэлію,
З'ехала маладосць.

Хачу пабыць адзін...

Ад людзей,
Ад грукату жалезнага
Збег на некалькі гадзін.
Я хачу падыхаць лесам,
Я хачу пабыць адзін.

Скалыхнуў галіны вецер.
Успамінаў ускалых.
Тых,
Каго няма на свеце,
Бачу ў дрэвах, як жывых.
Падыходзяць, адыходзяць
За яліны,
За кляны—
Быццам дрэвамі ў прыродзе
Зноў становяцца яны.
Успаміны,
Успаміны—
Быццам вецер верхавы,
І мацней шумяць галіны,
Можа, голас іх жывы.
Людзі—дрэвы!
Я не ўдару
Іх—
Яліну,
Клён стары.
А на міг, нібы да твару,
Прытулюся да кары...

Ні ў глушы лясной,
Ні ў полі.
Ні ў гарах, на дне цяснін,
Я, відаць, ужо ніколі
Не змагу пабыць адзін.

Жывіце доўга, дзядзькі!

Над роднай вёскай, у начным блакіце,
На промні месячным іграе сон.
Заснула ўсё... І вы спакойна спіце,
Дзядзькі—Валодзя, Юзік і Лявон.

Спакойна спіце ў неспакойным свеце,
Спакойна спіце—ад трывог наўзбоч.
Як вартавы, пачуўшы шолах недзе,
Я не звяду вачэй у гэту ноч.

Мая радоўка!... Спачывайце ціха,
Дзядзькі—Валодзя, Юзік і Лявон.
Не дам і ёй, бясшумнай павуцінцы,
Заплыць у ваш жывы, гаючы сон.

І ў вас былі бяссонныя радоўкі
Пасля вайны, акрэплі мы пакуль:
Вы ратавалі нас ад галадоўкі,
Як у блакаду—ад агню і куль.

Аб цішыні вы дбалі, як аб хлебе,
Дзядзькі—Валодзя, Юзік і Лявон,
Каб і над намі, у блакітным небе,
На промні месячным іграў ён, сон.

Спакойна спіце!.. Пройдзе ноч, і зноўку
Вы вернецеся самі ў свет трывог.
А я другому перадам радоўку.
Каб ваш спакой, як вартавы, бярог.

Жывіце і далей вось так, па-брацку,
Дзядзькі—Валодзя, Юзік і Лявон.
І не спяшайцеся туды, дзе бацьку
Закалыхаў навек глыбокі сон.

Чарніцы

МАМЕ

Асляпіла грымотная ноч:
Уцякаючы ад навальніцы,
Зачапілася лета
За корч—
І рассыпала ў лесе чарніцы.

Вось дык неруш!
Да восеньскіх дзён
Іх у соснах збіраў,
У ялінах.
Закаціліся ягадкі ў сон,
Засталіся ў маіх успамінах.

Халадае высока—на снег.
Адгрымелі даўно навальніцы.
А прыеду да мамы—
І ў сне
Я, шчаслівы, збіраю чарніцы.

Не ўбывае ён,
Неруш лясны.
І шумяць, і спяваюць галіны—
Гэта дрэвы агучваюць сны,
А прачнуся—мае успаміны.

Смага

Б'е крынічка ў лузе з сілай,
Б'е-віруе,
Б'е-кіпіць...
— Адвярніся,—
Папрасіла,—
Не глядзі, як буду піць.

Я прысніў цябе, здалося.
Над крынічкаю—капеж:
Разліваючы,
З далоняў
Ты халодны кіпень п'еш.

Вочы ясныя смяюцца,
Вусны ўздрыгваюць ледзь-ледзь—
Немагчыма адвярнуцца,
Немагчыма не глядзець...

І прызнаннем я, бязвольны,
Наталіў сваю тугу:
— Ад цябе ў жыцці ніколі
Адвярнуцца не змагу!..

...НА сцэне ён любіў дакладнасць, прафесійнасць, віртуознасць. Неяк ён убачыў, як адзін артыст крутнуў у перапынку рэпетыцыі — без дай патрэбы — сальта.

— Ты ўяўляеш? З выгляду бульдозер, а ў паветры быццам рэактыўна-пнеўматычны! Лёгка, ёмка! Вось такім павінен быць артыст — сапраўдны, прафесійны. Ужо за гэта, хай астатняе не вельмі — варта мець такога ў трупе, каб усе падцягваліся! У акадэмічнай трупе трэба мець адну Плісецкую, адну Александроўскую ці Алу Пугачову, аднаго «кавёрнага», Геракла, Апалона, дзве Сафі Ларэн...

— Абавязкова дзве?

— Ды не... Хай будзе тры. Ды і чатыры не зашкодзіла б. А ў крайнасці, хоць бы адну!

І ён пачаў закладваць пальцы на руцэ — размашыста, як віртуоз-рахункавод на кругляшах:

— Так... Адну Сафі Ларэн. Адну Джаконду. Афрадзіту. Эму Бавары... Стэфанію Міхайлаўну Станюту...

Ён спыніўся, паглядзеў на свой вялікі левы палец, выставіў другі вялікі — правы, страсянуў ім:

— І Галіну Кліменцьеўну Макараву!

Яшчэ раз страсянуў перад сабой абедзвюма рукамі, нібы ўзважыў тое, што на гэтых пальцах атрымалася, і засмяяўся радасна:

— Няблага, а? Ёсць дзве актрысы «на вялікі»! Засталося — дробязь, толькі трэба пастарацца раздабыць, але ніхто мяне не разумее — ні таварыш Міхалюта, ні Луцэнка, ні Раеўскі. Кажуць: ат, як-небудзь. Вы, кажу, абыдзецеся, а глядач? Падумайце пра гледача!

«Праблему» Сафі Ларэн ён узнімаў даволі часта — у тэатры, дома, у кафэ... Аднойчы І. Ф. Міхалюта ў рэшце рэшт пацыху абнадзеіў: запрасілі на прагляд актрысу — маладая, з выглядам, не тое каб зусім Сафі Ларэн, але нішто сабе.

— Абавязкова на прагляд паклічце і мяне, — устрапянуўся Макаёнак вельмі жвава — так, што ўся кампанія зарагатала.

Ён ажно пакрыўдзіўся:

— Вы што? Я па-сур'ёзнаму, без гэтых вашых штучак. Як актрысу!

Разрадзіў няпэўную няёмкасць ціха і спакойна, быццам папраўляючы і нас, і Макаёнка, найаўтарытэтнейшы арбітр у гэтай тэме:

— Ну, калі ўжо як актрысу, то тады паклікаць трэба не цябе, Андрэй...

Андрэй каўтнуў паветра, напружыніў вочы па-байцоўску, і чакаў — «каго»? І ўсе чакалі. А Іван Пятровіч (гэта быў, вядома, ён — Шамякін) вельмі проста, але неаспрэчна ўдакладніў, паказваючы пальцам на сябе:

— Мяне.

Удакладненне вельмі спадабалася — усім. «Пружына» памякчэла, адпусцілася, з агульным рогатам. Андрэй свайму Івану не пярэчыў. А Іван Пятровіч сціпла святкаваў яшчэ адну са сваіх сяброўскіх перамог, не заносячы яе ў рахунак, бо такіх падлікаў — «хто каго» — між імі не вялося.

...Як умеў Андрэй Ягоравіч даваць сапраўдныя ўрокі акцёрскага мастацтва акцёрам, рэжысуры — рэжысёрам, — гэта лепей за мяне напішуць рэжысёры і акцёры. Я і сёння бачу, як ён цяжкавата прыўзнімаецца з сядзення побач з рэжысёрскім столікам, ідзе да сцэны, памагаючы параненым нагам — плячамі, з ледзь прыкметнай пластыкай рукі, якая нібыта крадком, употай імітуе жэсты колішняга сейбіта на веснавой раллі (маскіраваў кульгавасць). Пружынячы ўсім корпусам, адольвае прыступкі, з непазбежнымі кіўкамі галавы на кожнай з іх — як у плыўца, вныркваючы «брасам».

Вынырнуў увесь. На сцэне. Павярнуўся, распрамляе грудзі. «Ну?». І ён адразу — гаспадар. Усе застылі ў прадчуванні...

Ведаю, што ўсе артысты любяць, каб вучыў іх чалавек, які ніколі сам не быў артыстам. Бо былы артыст — разумны ён ці не зусім разумны, здольны ці не здольны — сапсаваны сцэнай. Сапсаваны ў прафесійным плане, бо яго «паказ» абавязкова прапускаецца праз рамяство, якое ім усім знаёмае ў штодзённым карыстанні. Макаёнак «рамяства» не меў. Паказваў — сэрцам. Розумам. Душой. Яго паказ мог ажывіць любую фразу.

...Фраза Юркі з п'есы «Таблетку пад язык»: «У дзіцячым садзіку даўно ведаюць, што навукова-тэхнічная рэвалюцыя захапіла і сельскагаспадарчую сферу дзейнасці чалавека». Фраза, проста скажам, несцэнічная, цяжкая, і яна ў артыста, натуральна, «не ішла»: і так, і гэтак спрабаваў ён, па загаду рэжысёра, а ўсё роўна — «не жуецца, не глытаецца» — і з гневам, і з дакорам... Словы не складаліся ў жывы ланцуг, яны грукацелі, быццам лішнія дэталі ў бляшанцы: чым мацней трасуць яе, тым болей грукату, а механізм стаіць, не варухнецца.

Перавёў дыханне Макаёнак. «Ну?». Абвёў вачыма ўсіх «таблеткаўцаў» на сцэне: «як вам растлумачыць»? Пацёр далонню падбародак, нешта ўжо хацеў сказаць, развёў рукамі, адмахнуўся ад уласных слоў: «Няёмка і не гэтых праяўленняў кожны раз перада мною паўстае не толькі Макаёнак-драматург, але і рэжысёр, артыст, і ўрэшце проста сам Андрэй — жывы!

Работа над спектаклямі ў яго працягвалася і пасля прэм'еры.

Ён любіў **работу сцэны**. У тэатры ведалі, што калі сёння — макаёнкаўская п'еса, ён заўсёды тут. Не звонячы, без папярэджання прыходзіў, альбо пазваніўшы — гэта не мела значэння. З прыяцелем, з госцем альбо толькі сам. Знаходзіў месца ў рэжысёрскай ложы ці ў дырэктарскай — ля краю, у куточку. І глядзеў. Здаралася — не ўвесь спектакль, а толькі тыя сцэны, у якіх не ладзілася нешта.

У спектаклі «Святая прастата» яго заўсёды непакоіла другая дзея — «Сон», і ён прыходзіў часам на яе, пасля антракту. Мог паціху выйсці Уздыбіўся! Такое абурэнне — цераз край. А чым абураны? Не выкажа. Патрэбна думка — «обобщающая мысль». Эмоцыя пануе ў цырку. Калі паветраны гімнаст працуе — ух, як захапляе ўсіх. А — думка? Яна на ім адным сканцэнтравана: ці сарвецца? Мы ў гэтыя хвіліны не падумалі: а што ж у гэты час — у Добрушы, у Рагачове? У тэатры на эмоцыі не выедзеш.

...Сядзелі мы ў яго на кухні, утрох — з І. Шамякіным.

Іван Пятровіч спрабаваў унесці нейкую «перабудову» ў кампазіцыю спектакля «Святая прастата»:

— А можа, ёсць пралік у тым, што публіка настроена на ўспрыманне — спачатку — бытавой гісторыі? Чакае: будзе суд, бо бацька грошай сыну на ягоную растрату, ведама, не дасць. А трэба даць спачатку афармленне друаўтарскі тэкст — задача не вельмі цяжкая, але і малавыразная. У гэтым адсутнічае галоўная прыкмета мастацтва: абагульненне з'яў жыцця ў мастацкі вобраз».

...Аднойчы папрасіў двухтомнік Меерхольда і «Сустрэчы з Меерхольдам». Доўга не званіў. Вяртаючы, маўчаў. А потым растлумачыў:

— Не люблю, калі ў тэатр прыходзяць з пісталетам. Гэта поза. З-за яе ні ў што яму не веру...

...Ён цікаўны быў да новага. Хацеў заўсёды ўбачыць і пачуць — сапраўднае.

— Афішу бачыў? Прыязджае пантаміма. Эксперыментальны тэатр-студыя. «Аптымістычная трагедыя», «Вестсайдская гісторыя» і «Горад на зары». Бяздомныя і непрызнаныя. Хадзем, цікава: пантаміма і — «Аптымістычная»... Лібрэта па Вішнеўскаму.

Пайшлі.

Ён апладзіраваў даўжэй за ўсіх, на выхад апынуліся мы па-за ўсімі, і тады Андрэй Ягоравіч ірвануў праз занавес, паклікаўшы і нас, — да выканаўцаў, за кулісы, віншаваць і дзякаваць.

— Ведаеш, я пазваню ў Маскву. Ты — напішы абавязкова, неадкладна. Трэба, каб былі рэцэнзіі.

Былі яго званкі.

Была рэцэнзія ў «Советской Белоруссии».

Была сустрэча з калектывам, пад фінал гастроляў — па яго падказцы арганізавала БТА, у Доме афіцэраў, у кафэ, пасля апошняга вячэрняга спектакля. Хораша ішла размова. Потым выявілася, што нашы госці хочуць есці, а кухня ўжо зачынена, няма афіцыянтак, і тады Андрэй Ягоравіч рашуча рушыў у буфет. Вяртаўся не адзін, з буфетчыцай. Абое неслі па падносу бутэрбродаў з кілбасой і кетавай ікрой. Пачуліся апладысменты, і мастацкі кіраўнік тэатра-студыі Генадзь Юдзеніч выгукнуў:

— Таварышы, дарэмна кажуць, што адзін — не воін! Калі гэта Макаёнак — воін!

— Я прашу ва ўсіх вас прабачэння, — не прысеўшы, ўзяў слова Андрэй Ягоравіч. — Няёмка атрымалася. Давайце злёгку падсілкуемся, пад каву, потым — да мяне дадому. Запрашаю ўсіх.

А колькі іх было? Не менш за дваццаць пяць ці нават больш за трыццаць.

Жыў тады Андрэй Ягоравіч адзін, быў сам і гаспадар, і гаспадыня. Накарміў усіх. Нагаварыліся. Юдзеніч урачыста кляўся, што абавязкова будзе ставіць Макаёнка.

— Гэта трэба нешта спецыяльна напісаць, я не ўяўляю, — стрымліваў яго напал Андрэй Ягоравіч.

— Ды я... Ды мы!..

Юдзеніч гарачыўся вельмі шчыра. Макаёнак шчыра і спакойна ахалоджваў: не дзеля таго ён іх паклікаў, каб патрапіць на афішу пантамімы, а каб ім, энтузіястам новай, непрызнанай справы, трошачкі было цяплей, — каб Мінск успаміналі добра, каб абрус ягонага стала нагадваў ім гасціннасць беларускую ў вандроўках па краіне.

Ён распытваў у Юдзеніча, адкуль з'явілася задума жанру: паяднаць мастацтва скамарошых дзействаў з сённяшнім мюзіклам, — як ствараўся калектыў. І барвавеў ад прыкрасці, ад сораму і гневу: выявілася, што пачынанне гэтага ансамбля закладвалася не недзе за марамі ды гарамі, а на Беларусі, тут, у нас, і быў ён пэўны час прыпісаны да Мінскай філармоніі, а потым — Гомельскай, мытарылі яго, перакідалі, мэнчылі, стараліся перарабіць «з раяля ў клавесін», а ён не паддаваўся, і рвануў, нарэшце, у Маскву, пад кіраўнічую апеку Міністэрства культуры СССР, адкуль і паявіўся ў Мінску як сталічны гастралёр «Саюзканцэрта».

Макаёнак абураўся:

— Во галавацяпы, во перастрахоўшчыкі, во мітрафанушкі сезонавічы! Мець такое і згубіць...

З таго ансамбля трое ўсё ж прыехалі да нас: В. Бандарэнка і Л. Зайцава ў тэатр імя М. Горкага (з дэбютам у «Трохграшовай оперы»), А. Букін — купалавец (той самы «з выгляду бульдозер», што зачараваў Андрэя Макаёнка рэактыўна-пнеўматычным сальта).

Часам мне падумаецца, прыгадаўшы тую ноч: а колькі іх было, такіх начэй, у Макаёнка?..

Некаму здавалася — шыкуе. Нехта мог сказаць — навошта? Растранжырвае сябе!

Так, ён — транжырыў. Раздаваў. І — працаваў. Такой была пасада ў драматурга Макаёнка.

Георгій КОЛАС

«ПРАБЛЕМА САФІ ЛАРЭН»

Закончыў працу над кнігай успамінаў і эсэ «Аўтографы дзевяты і дзесяты» — пра народнага пісьменніка БССР Андрэя Макаёнка. Прапанаваў «Аўтографы» часопісу «Маладосць».

Сёння да ўвагі чытачоў штотыднёвіка — старонкі новай кнігі. 12 лістапада Макаёнку было б шэсцьдзесят пяць...

АЎТАР.

Адна з апошніх сустрэч драматурга і купалаўцаў... Андрэй МАКАЁНАК разам з народнай артысткай БССР Стэфаніяй СТАНЮТАЙ і актрысай Аленай СІДАРАВАЙ — удзельніцамі спектакля «Верачка».

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

тое»... Быццам вінавацячыся, што даводзіцца тлумачыць зразумелае, нарэшце зноў развёў рукамі, просячы ратунку ў выканаўцы ролі Юркі (таго самага, які павінен гэту фразу вымаўляць):

— У ножным садзіку даўно ўжо ведаюць...

На сцэне грымнулі апладысменты.

Ён вярнуўся зноў за столік, пераборваючы радасць ад таго, што фраза яўна «несцэнічная» зрабілася такой сцэнічнай — менавіта дзякуючы гэтай самай «несцэнічнасці» яе, «няёмкасці» і «вінаватасці» паказанага Макаёнкам Юркі — за яе. Такую фразу аўтар напісаў не з-за таго, што лепшай не знайшоў. Яму была патрэбна менавіта «горшая». Як у Астроўскага, напрыклад, у «Даходным месцы» фразы Жадава ў фінальных маналогах — пра той час, калі ліхвяр і хабарнік будуць баяцца суда грамадскасці больш чым крымінальнага... Ці ў Чэхава, калі ягоныя героі, спасаваўшы перад жорсткасцю жыцця, узнёсласць думак апранаюць у банальныя адзенні «слова не па росту»...

Разумею, што такія аналогіі — не вельмі дасканалыя і, мабыць, не былі б даходлівымі да артыстаў, а паказ Андрэя Макаёнка растлумачыў гэта і без «аналогій». Праўда, у артыста зноў пайшло «не тое». Рэжысёр адчуў, зірнуў на аўтара. А той паблажліва махнуў рукой: няхай...

— Даспее? — шэптам запытаўся нехта.

— Не, не ў гэтым справа, — ён абвёў паветра пальцамі ля скроні, паказаўшы, што калі ў цябе «не толькі садзік», то тады і атрымаецца патрэбнае, а не — дык не...

На некаторых рэпетыцыях у аўтара з артыстамі бывала свята творчага ўзаемаразумення, найвышэйшай радасці, і рэха таго свята ў сённяшніх спектаклях (асабліва ў «Трыбунале») паўтараецца штораз: у Калабку Аўсяннікаў захоўвае «паказы» Макаёнка — спрыт душы, увёртачкі, манеры, інтанацыі... Я чую іх і бачу і ў Паліны, і ў Сырадоева, і ў Зінкі... Ён жыве ў іх, адгукваецца, смяецца, стогне, — праяўляецца. І з за кулісы, не чакаючы фіналу — гутарыў з акцёрам пра ягоны эпізод. Ніколі не злаваў, не лаяў. Нават быццам і не раіў, а прасіў: а што, калі вось так... Ты паспрабуеш?

Пішучы рэцэнзію ў «Советскую культуру» на «Святую прастату», і я таксама кожны раз, калі яна ішла, глядзеў, і вось аднойчы (18.02.1976) мне здалося, што другая дзея «вытанцоўваецца». Макаёнка я ў тэатры не сустрэў і думаў, што яго няма. Назаўтра мне хацелася яго парадаваць:

— Нарэшце ў «Сне» пачаўся «сон» — з'явілася адценне і рэальнасці. Дашкоўская «намацала» патрэбную тональнасць. А знайшла яна выток у першай дзеі — з «мемарандума» сваёй Дачкі Старому: там усе пачаткі!

Ён уважліва ўслухоўваўся і нешта вывяраў.

— Ты думаеш? Дык вось жа, я ёй гаварыў учора, а яна не разумее: чалавек, калі ў жыцці, а не на сцэне... Ён прыходзіць: абурэнне... Але ж — з думкай, з мыслямі! Ён іх выказвае, а штосьці ў гэты час на іх пластуецца, яны — узбагачаюцца, растуць, і калі ён выходзіць, дык выходзіць з імі, жывучы ў іх, а не проста: паявіўся, выліў і пайшоў. Як дарасці ёй вось да гэткага, вышэйшага: «Ты феадал, прыгоннік!»... І што — пасля? А калі ўсе пачнуць падобным чынам — «выплёскваць»? І — Стары? Ягонае ж «семнаццацікапеечнае» абурэнне — **расце** праз новыя і новыя напластаванні: у каго ўзяў, ты ж не зарабіў, ты ўкраў, абрабаваў, ды гэта ж! — што за гэтым?! Рабаўніцтва! Гвалт! Разбой!!! А тут і пралятае самалёт: «Ды гэта ж на абарону супраць вас, такіх вось, вылятаюць у трубу міль-ё-ны!!!».

Яму патрэбен быў акцёр — не выканаўца. Аднадумца.

— Галоўная бяда — іграюць факты. Ціснуць на эмоцыю. А філасофіі з эмоцыі не выціснеш.

Пра тое самае — яшчэ:

— Эмоцыі цудоўна ўмее выявіць сабака — яшчэ як! Я на яго і не зірнуў, прайшоў, а ён — брахаць. гога акта і паведаміць: загінуў прэзідэнт.

Я ўтыцкнуўся з пярэчаннем:

— Ды не! Паведамленне — гэта не ў спектакль, а для маёй рэцэнзіі. А тут адразу ўсё як трэба: семнаццаць капеек пакладзены на зямны шар...

— Гэта не зямны шар. Зямля — роўная, — парываў Іван Пятровіч. Яму не падабалася нязручная, ненатуральнай круцізны, сцэнічная пляцоўка, створаная мастаком Барысам Герлаванам.

Я пачаў прыкідваць: можа, сапраўды — залішне: «Хай бы, можа, «сподак», а не «яйка»...

Тут Андрэй уздыбіўся:

— Ды нам толькі здаецца, што мы на шары. Не на шары мы, а на гранаце, перарэзанай рубцамі, як мерыдыянамі!..

Гром прагрымеў, маланка бліснула — узровень той эмоцыі, якой ён прагне ад артыстаў, ад спектакля.

Герлаванаўскі станок-планета нарадзіўся ў пастаноўцы з аўтарскай рэмаркі: «Прастор такі, што на лініі гарызонта відно: Зямля наша ўсё-такі круглая. І вось на гэтай самай акругласці недзе далёка-далёка...» (наогул ён любіў акругласць ліній, нават мэбля тагачасных простых форм і частых плоскасцей яму не падабалася, між іншым).

Былі пярэчанні: станок нязручны ў мізансцэніроўцы, замінае натуральнаму жыццю артыстаў.

— Заталдычылі: рэальнасць, натуральнасць! Нібыта ў мінулым веку Фет быў «натуральным». МХАТ — не Фет! А што такое — Фет? Усім вядома: «Я пришел к тебе с приветом»? Але ёсць і іншы Фет: «Зеркало в зеркало, с трепетным лепетом я при свечах навела». Фет гэта ці не Фет? А МХАТ — у сцэне «на званіцы» ў «Бронецягніку» — акцёрам было зручна? Не пра тое думаў Станіслаўскі, а пра тое, каб дабрацца да самога бога!

Ён тады штудзіраваў «Пытанні рэжысуры» і ў А. Д. Папова ён аловачкам абвёў абзац: «Жыццёвае праўда-падабенства, бытавая праўда ў распалажэнні чалавечых фігур на сцэне, пры якім акцёрам зручна вымаўляць аўтарскі тэкст — задача не вельмі цяжкая, але і малавыразная. У гэтым адсутнічае галоўная прыкмета мастацтва: абагульненне з'яў жыцця ў мастацкі вобраз».

НАШ КАЛЯНДАР

Споўнілася 85 гадоў з дня нараджэння Міхаіла КРОШНЕРА, заслужанага артыста БССР. Адзін з першых выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па класе кампазіцыі (вучыўся ў прафесара В. Залатарова). М. Крошнер стварыў шэраг камерна-інструментальных і аркестравых сачыненняў, рамансаў, апрацовак беларускіх і яўрэйскіх народных песень. У гісторыю беларускай музычнай культуры ўвайшоў як стваральнік першага нацыянальнага балета — «Салавей» (паводле аповесці З. Бядулі). Загінуў у 1942 годзе.

1 лістапада споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра КРЫЛОВІЧА (1895—1937), аднаго з заснавальнікаў беларускага савецкага тэатра, заслужанага артыста БССР. Нарадзіўся ў вёсцы Крыловічы Дзяржынскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1915 года выступаў на аматарскай сцэне. З 1921 года ў БДТ-1 (тэатр імя Я. Купалы). Сярод роляў, створаных У. Крыловічам на першай беларускай сцэне, — Машэка і Кастусь Каліноўскі (у аднайменных п'есах Е. Міровіча), Крыніцкі («Паўлінка» Я. Купалы), Кручкоў («Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча), Карнейчык («Канец дружбы» К. Крапівы), Вяршынін («Браняпоезд 14-69» У. Іванава), Берест («Платон Крэчат» А. Карнейчука) і іншыя.

10 лістапада — 75 год з дня нараджэння Змітрака АСТАПЕНКІ. Першыя вершы надрукаваў у 1926 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «На ўсход сонца» (1931), «Краіне» (1931), «Абураныя» (1932), «Выбранае» (1957). Пісаў для дзяцей, перакладаў. Загінуў у 1944 г.

11 лістапада споўнілася 110 год з дня нараджэння Альберта ПАЎЛОВІЧА. Нарадзіўся ў Мінску, працаваў бухгалтарам у розных установах.

Літаратурную дзейнасць пачаў у канцы 19 ст. Аўтар зборнікаў вершаў «Снапок» (1910), драмы «Васількі» (1919), вершаў для дзяцей, гумарыстычных твораў, у 1975 г. выйшла «Выбранае».

Памёр 17. 3. 1951 г.

14 лістапада — 85 год з дня нараджэння Нічыпара ЧАРНУШЭВІЧА. У 1917 — 1920 гг. настаўнічаў на Капыльшчыне, у сваіх родных мясцінах. Скончыў гістфак БДУ, працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве, на тэлебачанні. Выйшлі зборнікі вершаў «Дзіва» (1927), «Нясу надзею» (1962), «Гаворка дум» (1966), «Выбраныя вершы» (1975).

Памёр 18. 2. 1967 г.

21 лістапада — 85 гадоў з дня нараджэння народнага артыста БССР Міхаіла ДЗЯНІСАВА. Скончыў Беларускую студыю оперы і балета па класе А. Баначыча. З 1933 па 1958 гг. быў вядучым салістам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Выконваў барытанальныя партыі ў класічных айчынных і заходнееўрапейскіх операх. Стварыў яркія музычна-сцэнічныя вобразы ў спектаклях паводле твораў беларускіх кампазітараў (оперы «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага, «Кастусь Каліноўскі» Д. Лукаса). У канцэртным рэпертуары меў багата беларускіх народных песень.

М. Дзянісаў выкладаў у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Памёр у 1971 годзе.

24 лістапада — 80 гадоў з дня нараджэння народнага артыста БССР прафесара Льва ЛЮБІМАВА. У 1951—64 гг. працаваў галоўным дырыжорам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Пад музычным кіраўніцтвам Л. Любімава былі ажыццёўлены пастаноўкі твораў беларускіх кампазітараў: «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага, «Надзежда Дурава» А. Багатырова, «Яснае світанне» А. Туранкова, «Калючая ружа» Ю. Семяннякі, «Мара» Я. Глебава, «Святло і цені» Г. Вагнера, а таксама спектаклі паводле сусветнай музычна-тэатральнай класікі. Памёр у 1977 годзе.

27 лістапада — 85 гадоў з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, кампазітара і педагога Рыгора ПУКСТА. Нарадзіўся ў Гомелі. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю. Выкладаў у Гомельскім музычным вучылішчы, працаваў на Беларускім радыё. Сярод твораў Р. Пукста — оперы «Машэка», «Марынка» (першая беларуская опера для дзяцей), вакальна-сімфанічныя сачыненні, шэсць сімфоній, камерныя творы, песні, апрацоўкі народных песень, музыка да фільмаў і спектакляў.

Памёр у 1960 годзе.

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

НА ТЭМЫ ТЭАТРАЛЬНЫЯ

Чытач, які цікавіцца тэатрам, амаль ніколі не абмінае нават паасобныя газетныя публікацыі пра любімы від мастацтва. Нават пра не знаёмага для сябе акцёра ці прэм'еру, якую, можа, ніколі не давядзецца пабачыць.

Такі чытач пільна гартае новыя зборнікі крытычных артыкулаў. Такі чытач абавязкова звернецца і да нядаўна выдадзенай кнігі доктара мастацтвазнаўства прафесара Анатоля Сабалеўскага «Сучаснасць і гісторыя».

Гэта — прадумана скампанаваная кніга, менавіта кніга, а не механічная падборка артыкулаў. Тэатральныя імёны, факты, назвы, хрэстаматыйныя і адкрытыя пад час нядаўніх сезонаў, уплецены А. Сабалеўскім у своеасаблівую аналітычна-інфармацыйную канву. Маю на ўвазе «канву», у якой пазнаеш асаблівасці густу, прыхільнасці, літаратурны почырк аўтара. Словам, асобу тэатральнага даследчыка і аператыўнага крытыка, добра вядомага нам і дзякуючы даўняму плённаму супрацоўніцтву з «ЛіМам».

У пачатку кнігі — роздум пра сённяшні дзень купалаўцаў. Крытык згадвае гістарычны вопыт Ф. Ждановіча, Е. Міровіча, К. Саннікава, плённую працу калектыву над творамі К. Крапівы, А. Макаёнка, І. Шамякіна, творчыя заваёвы тэатра пачатку 70-ых гадоў, разглядае нядаўнія работы. Публіцыстычная надзённасць жывіць гэты артыкул: аўтар вылучае праблемы Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, якія не зніклі з парадку дня і сёння. Гэтыя праблемы — не надта гарманічныя «ўзаемаадносіны» тэатра з класікай, дэфіцыт у рэпертуары яркіх твораў пра сучаснасць, недасканалая ансамблевасць пастановак.

Ёсць у кнізе пазнаваўчыя старонкі. Напрыклад, экскурс у гісторыю Акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа ці агляд спектакляў «акадэміі сцэнічнага мастацтва» Украіны — тэатра імя І. Франка, знаёмага нам па гастролях у Мінску. Або расказ пра станаўленне пад кіраўніцтвам рэжысёра і педагога Л. Мазалеўскай Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, пра асобныя акцёрскія біяграфіі і пра найбольш адметныя пастаноўкі ТЮГа апошняга часу (рэжысура І. Папова, М. Шайко, Р. Баравіка). А тое, што ў пастскрыптуме артыкула «Тэатр юнага гледача: праблемы» дадзена інфармацыя пра чарговыя змены ў мастацкім кіраўніцтве тэатра, — красамоўнае пацвярджэнне думкі пра нестабільнасць творчага стану цяперашняга ТЮГа і праблему рэжысуры ў гэтым калектыве.

Непасрэднасцю інтанацыі і — зноўку — «пазнавальнасцю голасу» апавядальніка, імкненнем стварыць аб'ектыўны зрокавы вобраз канкрэтнай пастаноўкі вылучаюцца нататкі А. Сабалеўскага пра мастацтва рэжысуры і творчасць акцёраў, рэцэнзіі на асобныя спектаклі розных тэатраў рэспублікі. (Аўтар засяроджваецца на творах сцэнічнай Леніініяны і на арыгінальных нацыянальных узорах).

Як заўсёды, А. Сабалеўскі пільна сочыць за лёсам беларускай драматургіі на падмостках Масквы, Украіны, Малдавіі... Пашырэнне арэалу той ці іншай п'есы крытык выкарыстоўвае як выпадак прааналізаваць не толькі новы спектакль, а і саму п'есу, выклікаць у чытача роздум пра яе сцэнічную жыццяздольнасць.

Лаканічная, гучная, ёмістая, а, можа, і агульная крыху, назва ў гэтай кніжнай навінкі. Затое безагаворачна, суладна з канкрэтным зместам, прымаеш тры словы, якімі пазначаны асноўныя раздзелы кнігі А.Сабалеўскага: «Калектывы. Спектаклі. Майстры».

С. БЕРАСЦЕНЬ.

А. Сабалеўскі. Сучаснасць і гісторыя. Крытычныя артыкулы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1985.

ШЧАСЦЕ БЫЦЬ ПАТРЭБНЫМ

Шмат напісана пра двойчы Героя Сацыялістычнай Працы, старшыню ордэна Леніна калгас «Аснежыцкі» Пінскага раёна Уладзіміра Антонавіча Ралько, ды кожны раз, калі сустракаеш чарговую публікацыю, прысвечаную гэтаму цудоўнаму чалавеку, патрабавальнаму кіраўніку, перажываеш асаблівае хваляванне, бо ведаеш, што абавязкова даведаешся нешта новае і пра ралькоўскі стыль работы, і пра яго метад гаспадарання на зямлі. Нарыс «Шчасце быць патрэбным» — у гэтым сэнсе не выключэнне. Зразумела, на старонках яго ёсць і тое, што ў адносінах да Ралько па-свойму можна назваць як бы хрэстаматыйным, але прысутнічае і іншае, прапушчанае менавіта праз прызму аўтарскага ўспрымання.

Аўтар нарыса — журналістка Ганна Харытонава, наша зямлячка, якая з пасведчаннем газеты «Сельская жизнь» з'ездзіла краіну літаральна ўдоўж і ўпоперак. Нарысы Г. Харытонавай не толькі змяшчаліся ў саюзным друку, але і неаднаразова выходзілі асобнымі кнігамі, найбольш значныя сярод якіх «Цёплыя росы», «Добры след», «Дарогі да людзей». Дарэчы, прадмову да паасобных зборнікаў напісаў народны паэт Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы Пятрусь Броўка.

Нарыс пра У. Ралько даў назву чарговай кнізе Г. Харытонавай, якая сёлета выйшла ў выдавецтве «Молодая гвардия» з прадмовай Героя Сацыялістычнай Працы Вадзіма Кажэўнікава. Як і ў папярэдніх зборніках, геаграфія жыцця героя Г. Харытонавай вельмі шырокая. З цеплынёй расказвае журналістка і пра людзей роднай яе сэрцу беларускай зямлі. Акрамя нарыса «Шчасце быць патрэбным», змешчаны ў кнізе яшчэ адзін — «Вернасць мары». Герой яго — Уладзімір Богдан, які працуе выкладчыкам у Сенніцкай музычнай школе. Няпростым быў шлях гэтага чалавека да ажыццяўлення мары. На доўгі час яе перакрэсліла вайна, пасля цяжкое раненне. Але У. Богдан дабіўся свайго. Як і ў іншых нарысах, Г. Харытонава шмат увагі ўдзяляе раскрыццю ўнутранага свету свайго героя, паказу таго, што з'яўляецца вызначальным, характэрным у яго жыцці.

А. БАДРОЎ.

Жыў у горадзе Гродна паэт. Ён не напісаў тамоў бездакорна адшліфаваных вершаў, не прывёў да парадку сваёй спадчыны, не паставіў апошнія кропкі. Прайшоў па Гродзеншчыне — сцежкі яго падсвечаны і сёння ціхім святлом яго нагай душы, праменнем бунтарскага сонца. У песні яго многа сонца, гэта дае падставу думаць, што яго найгалоўным літаратурным настаўнікам быў Янка Купала. Сонца сагравала сумныя краявіды роднага кутка, давала сілы, пэўнасці, абуджала надзеі, было верным сябрам яму, селяніну і паэту.

З СЯЛЯНСКІХ НІЎ

Да 80-годдзя з дня нараджэння Міхася ВАСІЛЬКА

Шугае сонца вогнішчам.
Спякота.
Стаю з сярпом ў калоссях
спелых нівы.
Хоць цяжкае жыццё, а жыці
так ахвота...

Бо чую ўжо другой я песні
пералівы...
(«У калоссях спелых нівы», 1936).

Сонца сімвалізавала лепшую долю, перамогу ў змаганні з сацыяльнай і нацыянальнай няроўнасцю.

Сонца ў госці мы запросім —
Месца ў покуце дамо.
(«Сонца ў госці мы запросім», 1928).

Паэт жмурыў на сонцы свае блакітныя вочы, ішоў з адкрытым сэрцам да людзей, якіх ён у сваіх вершах называў братамі — і гэта было не позай. Час быў неспакойны, драматычны, гераічны.

У вёсцы Баброўня, дзе ў сям'і лесніка нарадзіўся Міхась Іосіфавіч Касцевіч пры

КІНО

ТОЙ НЕЗАБЫЎНЫ СОРАК ПЕРШЫ

Працягваецца работа над цыклам «Дзяржаўная граніца»

З васьмі фільмаў цыкла «Дзяржаўная граніца», над якім ужо некалькі гадоў працуе студыя «Беларусьфільм», чатыры выйшлі на ўсесаюзны экран. Мяркуючы па водгуках у прэсе, гледачы з цікавасцю чакаюць працягу гэтай маштабнай і грунтоўнай працы беларускіх кінематаграфістаў.

Сродкамі ігравога кіно, у своеасаблівым сінтэзе дакументальных фактаў і мастацкай фантазіі, нібы ўзнаўляюцца найбольш дынамічныя, драматычныя, нават трагічныя старонкі гісторыі Савецкай дзяржавы. Старонкі, што з амаль храналагічнай паслядоўнасцю, пачынаючы з першых паслякастрычніцкіх дзён, расказваюць пра неспакойныя будні нашай граніцы, пра напружанае жыццё тых, чый патрыятычны клопат і свяшчэнны абавязак — абараняць рубяжы Радзімы.

Неўзабаве будзе завершаны пяты фільм, двухсерыйная стужка «Год сорак першы». Падзеі яго разгортваюцца на беларускай зямлі, на Брэстчыне, на адной з пагранічных застаў. У фільме ўзнаўляецца мінная, але трывожная атмасфера апошніх перадваенных месяцаў і першыя дні, нават гадзіны, Вялікай Айчыннай.

— Сам я прайшоў усю вайну пехацінцам, затым восем гадоў служыў у пагранвойсках, — расказвае аўтар сцэнарыя пісьменнік Алег Смірноў. — Хоць ужо нямала знята фільмаў пра пачатак вайны, мне здаецца, што кіно пакуль усё ж не дасягнула той ступені верагоднасці ў паказе першых дзён вайны, якая ўжо ёсць у савецкай ваеннай прозе.

МУЗЫКА

«ВІЦЕБСК-85»

Адбыўся шосты фестываль «Віцебская восень». Па добрай традыцыі праходзіць ён як усесаюзнае музычнае свята: з розных гарадоў краіны з'язджаюцца ў Віцебск аматары джазавага музіцыравання, вядучыя майстры гэтага мастацтва і пачаткоўцы. У праграмцы сёлетняга фестывалю, выдадзенай пад грыфам «Віцебск-85», прыведзены такія лічбы: з 1979 года ў горадзе на Дзвіне было амаль чатыры дзесяткі фестывальных канцэртаў з удзелам больш за 60 калектываў і асобных выканаўцаў, выступленні якіх наведала больш чым 30 тысяч слухачоў. Цяпер гэтую статыстыку можна дапоўніць, бо сёлетняя «Віцебская восень»—сем насычаных канцэртаў з удзелам ленінградцаў, масквічоў, мінчан, музыкантаў з Вільнюса, Каўна-

адмене прыгону стаяла тры хаты. Там і цяпер невялічкая вёска. Сярод хат і хаціна малодшай сястры паэта Галіфры Іосіфаўны Курыла. Я не магу ўгаварыць знаёмых фотакарэспандэнтаў, каб з'ездзіць і сфатаграфаваць краявіды Баброўні. Міхась Іосіфавіч хадзіў з вёскі ў Скідаль ды і ў Гародню пехатой. «У 1935 годзе пры адным нечаканым налёце паліцыі, пасля павальнага вобыску (шукалі камуністычнай літаратуры) былі забраны рукапісы прыгатаванага да друку майго новага зборніка вершаў. Мяне гналі ноччу ў снежную завею побач з канём па цаліне (паліцаі ехалі ў санках) да Скідзеля».

Адукацыю Міхась Касцевіч атрымаў у горадзе Казлове (Мічурынск), скончыўшы там у 1921 годзе школу 2-й ступені. Там, у бежанстве, у горадзе Мамадыш памерла ад сухотаў маці. Там Міхась спрабаваў пісаць вершы. Але па-сапраўднаму разварушылі яго натхненне прамовы заходнебеларускіх паслоў у польскім сейме. Першае выступленне ў друку пад псеўданімам Міхась Васілёк адбылося 23 лютага 1926 года ў чацвёртым нумары «Маланкі». Найбольш плённы час яго творчасці супадае з найвышэйшым уздымам беларускага вызваленчага руху — усенароднай дзейнасцю Грамады. Васілёк у гэтым руху гартаваўся як актыўны стваральнік гурткоў ТБШ, заслужана здабываў літаратурную вядомасць, шмат друкаваўся ў сатырычным часопісе «Маланка», працаваў у ім некалькі часу на пасадзе сакратара, пакуль паліцыя не адправіла этапам у Баброўню, закрыўшы часопіс. Акрамя «Маланкі», паэт удзельнічаў амаль ва ўсіх віленскіх выданнях — у «Калоссі», «Беларускім летапісе», «Маладой Беларусі», «Беларускай газеце», адзіным дадатку да яе «Літаратурнай старонцы», у «Нашай волі», «Асве», «Нёмане» і іншых. Выступаў з апавяданнямі, якія зусім невядомы сучаснаму чытачу, таму што аўтар пры жыцці не меў магчымасці перавыдаць іх у сувязі з малымі фарматамі яго пажыццёвых зборнікаў.

Песні на словы Міхася Васілька спявала моладзь, асабліва папулярнай была песня «У бой на акупанта». Героямі ягоных вершаў былі заходнебеларускія рэвалюцыянеры, яго таварышы. Адметным з'яўляецца верш «Над магілай камсамольца Самойлы». Паэт прачытаў гэты верш на пахаванні сябра з вёскі Бандары Анатоля Самойлы, закатаванага ў дэфензіве. Аўтар узняў вобраз падпольшчыка да літаратурнага абагульнення — смерць рэвалюцыянера сцвярджае неўміручасць справы, перамогу.

Побач з Міхасём Васільком у літаратуры і грамадскай дзейнасці былі такія цудоўныя літаратары і палітычныя дзеячы, як Максім Танк, Піліп Пестрак, Ігнат Дварчанін, Браніслаў Тарашкевіч, Рыгор Шырма, Васіль Труцька, Якуб Міско, Валянцін Таўлай, Алесь Салагуб, Анатоль Іверс, Янка Брыль, заўчасна трагічна памёршы Міхась Явар. Трэба ўспомніць і мастакоў «Маланкі» Язэпа Драздовіча і Язэпа Горыда, Міколу Васілеўскага. Але Васілёк быў старэйшым за многіх з пералічаных яго сяброў, таму ішоў у разведцы заходнебеларускай літаратуры.

Пасля смерці жонкі Галі Міхася забралі ў польскае войска, адкуль ён трапіў у нямецкі палон. З палону ўцёк у жніўні 1941 года. Дома сядзець не было як — пачалася аблава на асобу і душу паэта. Вопытны падпольшчык уключыўся ў антыфашысцкую барацьбу, быў сувязным, разведчыкам, кіраўніком Скідальскага раённага антыфашысцкага камітэта. Пісаў вершы ў падпольную газету «Красное знамя» пад псеўданімам Язэп Гром. У лес да партызанаў перабраўся пасля таго, як фашысцкая хеўра лютаваць пачала, і некалькі разоў толькі шчаслівыя выпадкі ратавалі ад расстрэлу.

Я гарачым сэрцам мсціўца
і паэта
Здзек і смерць прыняць
у бойцы быў гатоў,
Бо складаў прысягу шчырую
на гэта
Над магіламі замучаных
братоў...
(«У чорны змрок», 1944).

Пасля вайны лірыка Міхася Васілька пасвятлела, набыла болей маладых, бадзёрых інтанацый. Ён быў вельмі папулярным сярод люду, яго запрашалі на сустрэчы, і ён не мог адмовіць. На ўласную творчасць заставалася толькі ноч — праседжваў за сталом ноч напралёт і ішоў на працу ў газету «Гродзенская праўда». Вось ужо дваццаць пяць гадоў, як няма між нас Міхася Васілька — ён памёр ад сардэчнага прыступу 3 верасня 1960 года, — а знаёмыя і сябры гавораць аб ім з такім гарачым захапленнем, з падрабязнымі дэталямі памятаюць яго паляўнічыя прыгоды, яго блазнаванне, любімыя прымаўкі. І ў сям'і Касцевічаў, калі ні зойдзеш, адчуваецца яго прысутнасць — от, некуды выйшаў... І сёстры Надзя і Глаша гавораць аб ім як аб жывым.

Я ганаруся, што Міхась Васілёк быў першым паэтам, якому я паказала верш «Роднае слова». Ён не надрукаваў верша, але і не параніў нясмелую тады вясковую дзяўчыну няўвагай. Не разбіраў па радках маіх першых спроб у паэзіі, але прымаў усур'ёз маю асобу, гэтага мне было досыць. Быў у мяне на вяселлі...

Па песенна-тужлівым рамантычным складзе яго паэзія блізкая да творчасці Уладзіміра Жылкі. У. Жылка па натуры быў эстэтам, інтэлігентам, Міхась Васілёк — селянінам і ў паэзіі. Яго вершы, акрамя крылаў ад натхнення, памяталі пра мазалі на руках касца і аратага. Жартоўна-сатырычны верш «Як я пана перанёс» Міхаіл Ісакоўскі запісаў у час вызваленчага паходу як народны верш і пераклаў на рускую мову.

Творчая спадчына Міхася Васілька не апублікавана. У пасляваенныя гады казённыя рэдактары і выдаўцы націскалі на паэта, а ён паддаваўся і бязлітасна крэмзаў свае цудоўныя радкі са зборнікаў «Шум баравы» (1929) і «З сялянскіх ніў» (1937). Абодва зборнікі выдадзены ў Вільні Рыгорам Шырмай. Паэт замяняў сакаўное гутарковае народнае слова літаратурнымі штампамі, змяняў канцоўкі вершаў. Уладзімір Калеснік аб індывідуальнасці Міхася Васілька піша так: «У чым жа яе сутнасць? Ва ўменні паэта праз любоў да людзей зліваецца з асяроддзем, раствараецца ў ім, даводзіць сябе да пэўнасці, што пачуцці тых людзей, якіх ты любіш, — твае ўласныя пачуцці...» Асабліва яго пачуцці супадалі з настроем моладзі, якая па-ранейшаму ўспрымала, прымала і спявала яго песні, равеснікам моладзі быў паэт ва ўсе гады жыцця.

Заглянь у люстра Нёмана,
Паслухай шэпат хваль.
З якім вясёлым гоманам
Плыве ён сёння ўдаль.
(«Родны край», 1949).

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА.
г. Гродна.

Звычайны мірны дзень у афіцэрскім доме: Вольга (М. Леўтава) і Ірына (В. Сотнікава).

Сярод пагранічнікаў вылучаўся весялун-старшына Лявада (С. Марозаў).

Трывожная гаворка ў падпалкоўніка Свірыдава (Г. Каральков) з генералам Віхровым (В. Корзун).

— Чэрвень сорак першага, — гаворыць заслужаны дзеяч мастацтваў БССР кінарэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, — сапраўды найтрагічная старонка гісторыі нашай краіны. Зераломна ўварваліся на савецкую зямлю фашысцкія захопнікі. Першымі прынялі на сябе здрадлівы варожы ўдар нашы пагранічнікі. І ў адлюстраванні гэтых падзей мяне перш за ўсё цікавілі людзі. Амаль хлапчукі, якія прынялі на сябе той першы ўдар ворага. Прынялі мужна і з годнасцю. Вядома, што ў Чырвонай Арміі на той час ішло пераўзбраенне, наша краіна да вайны не рыхтавалася, гатовай да бою не была. Ды менавіта людзі, маладыя воіны, даказалі сваю стойкасць, гатоўнасць да бою, да ахвяравання жыццём у імя абароны Радзімы. Ніводная з пагранзастаў не пакінула свае пазіцыі без загаду.

Сярод выканаўцаў роляў — пераважна маладыя акцёры. Здымкі вяліся ў мясцінах, дзе разгортваліся рэальныя падзеі сорак першага. Нашай групе вялікую дапамогу ў рабоце аказвалі сённяшнія маладыя пагранічнікі — равеснікі тых, хто некалі прыняў тут на сябе першую атаку гітлераўцаў. Здымкі прадаўжаюцца ў павільёнах «Беларусьфільма». Працуем мы разам з аператарам-пастаноўшчыкам Ігарам Рамішэўскім, з мастаком Вячаславам Кубаравым. У новым годзе мяркуем паказаць фільм тэлегледачам.

А. ДЗМІТРЫЕЎ.
Фота аўтара.

Гарыць застава. Сам-насам з ворагам аказаўся яе камандзір лейтэнант Суханцоў (Д. Мацвееў).

са, Клайпеды, Архангельска, Адэсы, іншых гарадоў краіны.

Упершыню ўдзельнічаў у фестывалі мінскі біг-бэнд пад кіраўніцтвам Браніслава Сарманта (фота 1). Добра вядомая віцябчанам салістка Марына Граноўская з Літвы (2). Рыжанін Івар Галеніекс (3).

Фота Д. АЛЯКСАНДРАВА.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Уладзімір СКАРЫНКІН

Пад зорным небам

Яўгену СІГАРОВУ—паэту, былому камандзіру карабля

Глядзіць загадкавая Вега
З вышынь касмічных
на зямлю.
Я на салярыі стаю,
Нібы на палубе каўчэга.

Здаецца,
што кудысьці ўпарта
Плыву,
ратуюся,
як Ной.
Над Чорным морам,
нада мной—
Начнога неба перфакарта.
Куды плывём
і дзе прычалім,
На ёй запісана,
відаць.
Ды мне—
усведамляю з жалем—
Сузор'яў код не разгадаць.

Тут патрабуецца
астролаг.
Аднак збянтэжыцца і той,
Калі рухомых
штучных зорак
Убачыць столькі над сабой.

А дзесь узорвае ракета
Каметай яркай
змрок начны,
Як напярэдадні вайны
Або перад сканчэннем свету.

Мо застаюцца ўжо секунды
Да катастрофы—
і мяне
Навекі ціша ахіне
Ля дзікіх берагоў Піцунды?

Асыпаў месяц-летуценнік
Абшары залатым руном.
Прыбой
адлічвае імгненні,
Як быццам вечны метраном...

Светлае світанне

Зламала бура дуб стары.
Працяў душу
боль невыносны.
І загайдаліся ў бары
У лютым абурэнні сосны.

Патухла між ялін святло—
І ноч прыйшла, як зацямненне...
Не падхапіла на крыло
Мяне да раніцы натхненне.

Дождж вымыў
змрочныя лясы—
І сонечны
блакітны ранак
Ізноў рассыпаў галасы
Малінавак і берасцянак.

Ізноў заслонай дымавой
Туман ахутаў пералескі.
Аброшаныя лапкі хвой,
Нібы алмазныя падвескі.

Кудысьці з хмарамі сплыло
Маё сляпое абурэнне.
Світанне светлае прыйшло
Зноў да мяне,
як азарэнне...

На Скарынінскім свяце кнігі

Усхваляваны ў Полацк я прыехаў!
Скарына пазіраў на землякоў.
Між камяніц
заблытвалася рэха,
Назад вярталася з былых вякоў.

Сцякала сонца
з ураселых дахаў,
Як я на бераг Палаты ступіў,
Дзе нарадзіўся Палачанін Якаў,
Што поплеч з Неўскім
лютых шведаў біў.

Багатую гісторыю мы маем,
Нярэдка нас
набат на бітвы зваў.
Я горды,
бо ў пабоішчы з Мамаем
Князь полацкі Андрэй
не спасаваў.

Я вельмі ўдзячны
той цяжкой кавалдзе,
Што выкавала грозныя мячы,
Якімі славу здабылі
ў Грунвальдзе
У бойцы з крыжакамі крывічы.

Я чую—
праз вякі!—
званоў Сафійкі
У гонар пераможцаў
перазвон.
Адгэтуль падаліся
ў свет вялікі
Спярша Францыск,
а потым Сімяон.

Сплылі стагоддзі,
як вясною крыгі
Да Рыжскага заліва
па Дзвіне...
Гудзе скарынінскае свята кнігі,
Гучыць,
як покліч продкаў,
ува мне.

На могілках

Стаім
і стоена маўчым
Ля дарагіх бясконца градак.
Не прывялі іх у парадак
Мая матуля і айчым.

Даць рады не змаглі быллю,
Зямлю не падрыхлілі дбайна...
Я маці гаварыў звычайна:
— Прыеду сам—
і прапалю!—

Ды вырваць пырнік і асот
Не паспяваў амаль ніколі.
Прыеду,
гляну—
прапалолі
Старыя самі агарод.

Упершыню, відаць,
не рад
Я шчодрай варажбе зязюлі:
Ужо айчыму і матулі
Не прапалоць ніколі град.

Травее іхні агарод
Ля возера
за чорным плотам.
І лебяда,
і хвошч з асотам
Залезлі ў агарод
праз плот.

І я здымаю плашчык свой,
Асот і пырнік рву рукамі...
Няўжо і шлях сюды
з гадамі
Таксама зарасце травой?

●

Сказалі
— Біяграфію пішы!—
Жыву,
Імкнуся родны край праславіць...
Ёсць толькі біяграфія душы,
На жаль,
Яна не кожнага цікавіць.

Чарнавік

Жыццё маё—
мой чарнавік,
Ва ўсім сугучны з доляю
Я чарнавік на чыставік
Перапісаць не здолею.

Здараецца,
што розум мой
І сэрца памыляюцца.
Слязамі,
нервамі,
крывёй
Памылкі выпраўляюцца.

І ўсё ж я прэч ганю ныццё,
Жыву даўно размашыста
І не баюся,
што жыццё
Пішу адразу начыста.

ВЫСТАЎКІ

У клубе віцебскага завода «Эвістар» зноў працуе выстаўка маладых мастакоў. У новай экспазіцыі прадстаўлены творы выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута Л. Мядзвецкага і У. Бяляўскага, а таксама самадзейнага аўтара У. Баянюка.

Пейзажы і нацюрморты Л. Мядзвецкага выкананы ў гуашы, асаблівасці якой ён добра ведае і ў якой працуе не адзін год. «Сумныя кветкі»—музычна адладжаны твор, у якім камертонам гучыць халодна-зялёны каларыт. Асабліва ярка ў гэтым нацюрморце выступае гармонія настрою і пластычнай арганізацыі кампазіцыі... Складаныя каларыстычныя нюансы, адметная абагульненасць вызначаюць амаль усе творы мастака, сярод якіх «Вечар», «Сумная казка лесу», «Воблакі», «Канец лета», «Роздум». Уражваюць і аўтарскія імправізацыі на тэмы вядомых класічных твораў.

У. Бяляўскі ўпершыню выстаўляе свае творы на суд гледача. Мастак яшчэ толькі ў пачатку творчага шляху, магчыма, таму ў яго пошуках бачыш уплыў твораў вядомых савецкіх жывапісцаў. Часам мастацкія якасці кампазіцыі не нясуць у сабе той філасафічнасці думкі, якая ўкладзена ў назву твора. А такія творы, як «Нацюрморт з рыбай» і вызначаюць лепшыя якасці маладога жывапісца: добрае валоданне колерам, уменне працаваць над формай.

Творы У. Баянюка—не тыповыя для самадзейнай творчасці. Яго серыя чаканных пано «Жыццё» здзіўляе глыбінёй пранікнення ў тэму. Сярод жывапісных твораў найбольш удаўся партрэт сына з цацкай — «Нас абодвух!».

М. ЦЫБУЛЬСКІ.

●

Клуб самадзейных мастакоў «Спадчына» створаны ў Барысаве. Першай справаздачай калектыву стала выстаўка ў фае Дома культуры завода аўтатрактарнага электраабсталявання імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. На ёй прадстаўлены дзесяткі работ. Найбольш цікавая з іх «Партрэт камандзіра» А. Барашава, «Марозны дзень» Г. Ганчаронка, «Вуліцы старога Вільнюса» І. Барадзея, «Піваніі», «Букет бэзу» Н. Ганчаровай і іншыя.

П. БАРОДКА.

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

У ГОНАР ПАЧЫНАЛЬНІКА

Калядны фарс «Камедыянт» Алеся Асташонка пастаўлены народным тэатрам трактаразаводцаў яшчэ на пачатку года. Прэм'ерныя хваляванні, аднак, вярнуліся: вядомы ў рэспубліцы калектыў паказаў сваю работу ў Доме літаратара.

Першыя трывожныя ноты спектакля не абяцаюць фарсавага відовішча. Няма ідыліі ў фальварку Дуніна-Марцінкевіча. Яго старэйшая дачка Каміла за ўдзел у паўстанні 1863 года саслана ў Салікамск. Гаспадара таксама няма — ужо год, як ён у Мінскай турме. Яго жонка і другая дачка, Цэзарына, у чаканні, у прадчуванні нядобрага, у неадступнай трывозе. Раптоўны прыезд з Вільні сына Міраслава. Незнаёмы на ганку. Гоман і тупат каляднікаў, сярод якіх у масцы сам Вінцэнты, — менавіта так ён вяртаецца да родных, каб яшчэ 15 гадоў жыць бязвыезна, пад наглядам паліцыі (яго вызвалілі з-за недахопу доказаў). Гэта хутчэй героіка-рэвалюцыйная драма альбо і зусім дэтэктыў, — падумае заінтрыгаваны глядач.

Што ж, у біяграфіі пачынальніка беларускай драматургіі хапае загадкавых, непрасветленых дасюль момантаў. Гэта асаблівасць, а таксама шматграннасць, паўнакроўнасць асобы пісьменніка даюць падставу менавіта для такой запеўкі. (На запеўку, расцягнутую экспазіцыю падобна ўся першая дзея).

Пра лёс Бацькаўшчыны, пра шляхі яе вызвалення, пра ролю тэатра ў маральным ачышчэнні чалавека разважае Дуніна-Марцінкевіч, вярнуўшыся дамоў. Можа, і зашмат гучных дэкларацый укладзена ў яго вусны, але асобныя з іх гучаць надзіва сучасна. Тыя, прынамсі, што тычацца тэатра. Бо пакуль існуе тэатральнае мастацтва, пакуль крочаць, за руку ўзяўшыся, Мельпамена і Талія, даўль будзе ўзнікаць пытанне аб ролі і месцы тэатра ў народным быцці.

Галоўны герой п'есы, азіраючыся на пройдзены шлях, схільны многае ў ім пераасэнсаваць.

«Памешчык без даходаў, камедыянт без тэатра, бацька без дачкі»,—з'едліва кідае яму станавы прыстаў. Гаспадар адказвае спакойна, з пачуццём вялікай чалавечай годнасці. Менавіта гэта рыса з'яўляецца асноўнай у характары Камедыянта ў выкананні І. Антанюка. На жаль, не ва ўсіх эпізодах артыст бывае пераканальны. Мала верыш, што яго ўсур'ёз абурылі несправядлівыя папрокі Незнаёмага. І тым больш дзіўна гучыць—хай сабе і ў запале сказанае — «Я яго заб'ю!» — у дачыненні да пасланца ад Камілы.

У другой дзеі напружанне растае, як ранішні туман, у свае правы ўступае фарс. Не ўсе персанажы знайшлі ў ім сабе справу. Марыя (Г. Прыма), Цэзарына (Л. Марозава), Міраслаў (Г. Жыгараў) і Незнаёмы (С. Раговіч) разам з намі назіраюць за камічнай сітуацыяй і амаль не прымаюць у ёй удзелу. Уладарыць Камедыянт. Ратуючы Незнаёмага, ён шчодра частуе гарэлкай не ў час завітаўшых «гасцей», падыгрывае ім, усяляк падахвочвае да размовы. Ды нешта завельмі лёгка ён уцягвае іх у сваю гульню Прыстаў (Г. Куцькін) і сакратар (К. Мішын), захмялеўшы, самі рады адкрыцца, паказаць нам сапраўднае, прадажнае нутро. Мы смяёмся. Мы пазнаём у іх са школьнай парты вядомых персанажаў «Пінскай шляхты» Кручкова і Пісулькіна, якія бесцырымонна бяруць хабар, дзяруць, як ліпку, і тых, «каторыя бачылі драку, а не баранілі» і ўсю астатнюю шляхту, «што не бачыла дракі, за тое, што не бачыла».

Сцэна са спектакля «Камедыянт».

Лёгка, натуральна, без камічнага перабору стварае вобраз прыстава Генадзь Куцькін. У ім і ўсведамленне сваёй паліцэйскай значнасці, і прэтэнзія на выхаванасць, і стракатая, сакавітая сумесь дзвюх моў. Мы падчас амаль сімпатызуем яму, бо з-пад грознай маскі «блюсціцеля парадку» позірае просты і адначасна хітраваты твар сялянскага сына. Трэба аддаць належнае і густу рэжысёра: ён не захацеў смяшыць публіку любой цаной. Досыць фрывольная, па-сапраўднаму фарсавая сцэна распранання прыстава не прымушае сцінацца ад сораму. Ні малая, цесная сцэна, ні поўная адсутнасць сцэнаграфіі, ні эклектыка касцюмаў не сапсавалі агульнага ўражання ад спектакля.

У творчым багажы лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі народнага тэатра Палаца культуры МТЗ шмат цікавых пастановак. Сярод іх «Пан Сурынта» У. Галубка, «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча, «Развітанне ў чэрвені» А. Вампілава, «Тры сястры» А. Чэхава, «Жыві і помні» В. Распуціна. Аказаўся да месца ў рэпертуары трактаразаводцаў і спектакль па п'есе А. Асташонка «Камедыянт». Можна толькі вітаць гэтую падзею. Віталі і гледачы Дома літаратара — шчырымі апладысментамі.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

УВАГА: ФОТА-КОНКУРС!

У Беларусі знаходзіцца больш за 8 тысяч помнікаў, абеліскаў, мемарыялаў, мемарыяльных знакаў, створаных у гонар памяці загінуўшых савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, чый подзвіг звязаны з вызваленнем ад ворагаў беларускай зямлі.

Партыйнымі і савецкімі органамі, грамадскімі арганізацыямі многае робіцца, каб захаваць гэтыя свяшчэнныя мясціны, трымаць іх у добраўпарадкаваным стане, шырока выкарыстоўваць у патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні працоўных, асабліва моладзі. З гэтай мэтай прымяняюцца многія традыцыйныя формы работы — шэфства, экспедыцыі, паходы, агляды, месячнікі і тыдні па добраўпарадкаванні помнікаў і навакольных тэрыторый.

У апошнія гады ў нашай рэспубліцы праводзіцца вялікая работа па захаванні помнікаў старажытнасці і выкарыстання іх для сучасных патрэб. На гэтыя мэты толькі за апошнія 10 гадоў Спецыяльнымі навукова-рэстаўрацыйнымі вытворчымі майстэрнямі Міністэрства культуры БССР засвоена 11,7 мільёна рублёў.

З мэтай стварэння фатаграфічных твораў, якія адлюстроўваюць практычныя справы дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый па ажыццяўленні ленінскіх ідэй зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны, прапагандуюць рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа, а таксама манументальныя творы, якія адлюстроўваюць гераічную гісторыю Савецкай дзяржавы, прэзідыум Рэспубліканскага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры прыняў рашэнне аб правядзенні ў перыяд з лістапада 1985 па лістапад 1986 года рэспубліканскага фотаконкурсу аб помніках гісторыі і культуры пад дэвізам «Помніць і захоўваць».

Удзельнікамі конкурсу могуць быць калектывы і асобныя фотааматары, аб'яднаныя ў клубы і гурткі, а таксама фотажурналісты, фотааматары і прафесійныя фатографы.

На конкурс прымаюцца асобныя каляровыя і чорна-белыя фотаздымкі, тэматычныя серыі каляровых або чорна-белых здымкаў, фотанарысы, створаныя не раней 1985 года.

Кожны ўдзельнік можа прысласць не больш 5 фотаработ. Серыі і фотанарысы павінны ўключаць не больш 6 здымкаў.

Усе работы прадстаўляюцца ў 2 экземплярах, мінімальныя памеры адбіткаў: адзін (асноўны) — 24×30 см, адзін кантрольны — 18×24 см. Каляровыя фотаздымкі выконваюцца памерам не менш 18×24см.

На зваротным баку кожнага здымка неабходна ўказаць прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, хатні адрас і месца работы, назву здымка. Фотаздымкі, прысланыя на конкурс, не вяртаюцца, а выкарыстоўваюцца для арганізацыі фотавыставак у пярвічных арганізацыях таварыства, а лепшыя — для рэспубліканскай фотавыстаўкі да V з'езда таварыства.

Фотаздымкі, тэматычныя серыі здымкаў і фотанарысы могуць быць прысвечаны ўсім відам помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Зыходзячы з дэвізу конкурсу, трэба найбольш цікава раскрыць значэнне помнікаў у сучасным сацыяльным і культурным жыцці савецкага народа, паказаць дзейнасць дзяржаўных органаў, Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і яго актыву, іншых грамадскіх арганізацый у справе выяўлення, вывучэння, захавання і прапаганды гісторыка-культурнай спадчыны.

Кансультацыі па пытаннях тэматыкі фотаработ і ўмовах конкурсу можна атрымаць у раённых, абласных, Мінскім гарадскім і Рэспубліканскім саветах таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, таксама ў міжсаюзных дамах самадзейнай творчасці Белсаўпрофа і аблсаўпрофаў.

Апошні тэрмін прадстаўлення фотаработ на рэспубліканскі фотаконкурс 1 лістапада 1986 года на адрас: 220050, г. Мінск, вул. К. Маркса, 20, Рэспубліканскі савет таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Фотаработы, прызнаныя лепшымі па выніках конкурсу, захвочваюцца дыпломамі і прызамі Рэспубліканскага савета таварыства і будуць прадстаўлены на рэспубліканскай фотавыстаўцы.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

Усё пра ГАРАДЫ і ВЁСКІ

З дырэктарам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР С. В. МАРЦЭЛЕВЫМ і намеснікам галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧАМ гутарыць карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

Горад — вялікі ці малы — помніць, шануе сваю гісторыю. Яна, гэтая гісторыя, заўсёды прадмет асаблівага гонару гараджан. Зайдзіце тут у краязнаўчы музей, і першае, што вам адразу кінецца ў вочы — стэнды, дзе ў дакументах, малюнках, здымках прасочаны вехі гісторыі горада — ад сівой даўніны да сённяшняга дня.

А ў вёсцы? Нават самай старажытнай (мо больш старажытнай, чым які горад)? Ці ведаюць яе жыхары, «аднуль і ёсць пайшла яна»? На жаль, даводзіцца канстатаваць, што на гэтае пытанне вы пачуеце, як правіла, толькі адмоўны адказ.

Магчыма, знойдзецца чалавек, які, няўцямна паціснуўшы плячамі, скажа: «Што ж з таго? Ці вясковец не пражыве без той гісторыі?» Пражыве. Фізічна. Але ці можна без шкоды для духоўнага здароўя абысціся без маральнага вопыту тых, хто некалі жыў і працаваў на гэтай зямлі, любіў і абараняў яе, без таго, што неад'емнай часткай уваходзіць у паняцце «малая радзіма».

Пра ўсё гэта гаварылася ў праблемным артыкуле У. Бутрамеева «Ведаць, помніць, захоўваць» і каментарыі да яго пісьменніка Ніла Гілевіча («ЛіМ» № 33, 1985 год), а таксама ў лісце ў рэдакцыю доктара гістарычных навук М. Улашчыка («ЛіМ», № 42, 1985 год).

— Я чуў, Станіслаў Віктаравіч і Аляксандр Лявонцьевіч, што ў планах Інстытута і Энцыклапедыі — выданне фундаментальнай працы «Гарады і вёскі Беларусі»?

С. Марцэлеў:

— Не толькі ў планах — работа над першым томам ідзе поўным ходам. Я хачу падкрэсліць, што дагэтуль у нашай рэспубліцы не было ніводнай капітальнай працы, якая ўтрымлівала б важныя звесткі аб усіх гарадах і іншых населеных пунктах Беларусі (у рэспубліцы 96 гарадоў, 109 гарадскіх і рабочых пасёлкаў, больш як 25 тысяч вёсак). Адсутнасць такога выдання істотна збядняла ўяўленне аб нашай рэспубліцы. І тут вашы аўтары, безумоўна, мелі рацыю. На Украіне, напрыклад, была выдадзена 26-томная гісторыя гарадоў і вёсак. Дарэчы, гэтая праца атрымала Дзяржаўную прэмію СССР.

У нашай рэспубліцы на працягу 1985—1997 гадоў будзе распрацавана комплексная праблема «Гарады і вёскі Беларусі» з тым, каб за гэты час стварыць шасцітомную працу (па колькасці абласцей), у якой даць кароткае навуковае апісанне гісторыі, архітэктурна-планіровачнага рашэння, эканомікі і культуры кожнага населенага пункта, які сёння функцыяніруе. Кожны том будзе багата ілюстраваны картамі, планамі, фотаздымкамі.

А. Петрашкевіч:

— Рыхтуецца гэтая шматтомная праца пад эгідай Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, навуковы кіраўнік аўтарскага калектыву і галоўны рэдактар выдання — член-карэспандэнт АН БССР Станіслаў Віктаравіч Марцэлеў. Але на тытульных лістах усіх шасці тамоў будзе стаяць і грыф Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. У. Броўкі. Выданне «Гарадоў і вёсак Беларусі» будзе ажыццёўлена менавіта Энцыклапедыяй.

— Выдаваць — гэта яшчэ і карпатліва працаваць над рукапісам, даводзіць яго да ладу, да кандыцыі...

А. Петрашкевіч:

— Абавязкова. Мы яшчэ і яшчэ раз праверым усе факты, каб у працу не трапіла памылка. Але ж мы маем магчымасць дапамагчы Інстытуту і вялікім фактычным матэрыялам. Амаль за дваццаць гадоў існавання Энцыклапедыяй назапашана вялізная колькасць разнастайных дакументаў. У нашых фондах 60 тысяч адзінак толькі ілюстрацыйнага матэрыялу.

— У БелСЭ былі дадзены звесткі па многіх населеных пунктах рэспублікі. Праўда, яны выкладзены вельмі сцісла...

А. Петрашкевіч:

— Так. Але за рамкамі публікацый засталося шмат якіх цікавых фактаў. Пры складанні «Гарадоў і вёсак Беларусі» іх можна з поспехам выкарыстаць.

— Станіслаў Віктаравіч, мабыць, і не надта дасведчанаму чалавеку зразумела, што сабраць матэрыял па кожным населеным пункце — нялёгкая задача. Яна патрабуе перш за ўсё, відаць, спецыялістаў, павінна быць, як я разумею, і пэўная методыка збору звестак...

С. Марцэлеў:

— Сапраўды, без методыкі, без акрэсленай мэты можна патануць у сабраных фактах. Я раскажу, з якіх асноўных элементаў будзе складацца апісанне кожнага селішча. Гэта яго гісторыя, эканоміка, архітэктура і планіроўка, і, нарэшце, культура. На кожны населены пункт заведзены пашпарт, у якім запаўняюцца наступныя графы: назва населенага пункта (сучасная і ранейшая), яго месцазнаходжанне з удакладненай тапаграфіяй, арыентацыя адносна шляхоў зносін і буйных гарадоў, колькасць двароў і насельніцтва, кароткая гісторыя селішча ў дакастрычніцкі перыяд (археалагічна-гістарычныя звесткі, умовы і прычыны ўзнікнення, асноўныя этапы гісторыка-эканамічнага і культурнага развіцця), узнікненне назвы населенага пункта.

Гэта, так сказаць, асноўныя магістральныя напрамкі. Але кожны населены пункт вывучаецца больш дэталёва, больш канкрэтна — калі заснаваны, якая зямля, калі быў арганізаваны калгас, колькі ў гаспадарцы спецыялістаў, Герояў Сацыялістычнай Працы, школ, медыцынскіх работнікаў, колькі ўдзельнічала ў Вялікай Айчыннай вайне, не вярнулася з палёў бітвы і г. д.

— Каб усё гэта «падняць», патрэбна нямала людзей...

С. Марцэлеў:

— Для збору і падрыхтоўкі матэрыялаў у нашым інстытуце створана рабочая група з 23 чалавек — гісторыкаў, этнографаў і архітэктараў. Да работы над выданнем прыцягнуты таксама акадэмічныя інстытуты — эканомікі і гісторыі, педінстытут імя Горкага, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія.

— Відаць, немалую дапамогу ў гэтай справе вам могуць аказаць краязнаўчыя музеі.

С. Марцэлеў:

— Так, яны таксама. Вы, мабыць, чулі пра крычаўскага краязнаўцу Міхаіла Фёдаравіча Мельнікава. Вельмі эрудзіраваны чалавек. Пра сваю Крычаўшчыну, наогул, пра Магілёўшчыну ён шмат ведае з таго, што тычыцца гісторыі краю, выдатных падзей, знакамітых людзей.

— Праца над выданнем вядзецца адразу па ўсіх абласцях ці толькі па адной?

С. Марцэлеў:

— Пачалі з Магілёўскай вобласці. І першы том, які выйдзе ў 1988 годзе, будзе прысвечаны менавіта Магілёўшчыне.

— Колькі на Магілёўшчыне сёння вёсак?

С. Марцэлеў:

— Каля чатырох тысяч. Гісторыя некаторых з іх налічвае не адно стагоддзе. Бачыце гэтыя папкі на маім стале — у іх ужо гатовае апісанне не аднаго дзесятка вялікіх і малых населеных пунктаў. Можаце пацікавіцца...

Гартаю рукапісы. На некаторых вока спыняецца надоўга. Вёска Сычкава Бабруйскага раёна. У 1897 годзе тут былі 63 сялянскія гаспадаркі. 25 лютага 1919 года на базе памешчыцкага маёнтка Панюшкавічы створана сельскагаспадарчая камуна. 23 сакавіка 1919 года агульны сход камуны паслаў гарачае прывітанне Уладзіміру Ільічу Леніну... Праўда, цікава? Або вось яшчэ. Вёска Казулічы Кіраўскага раёна. Савецкая ўлада тут была ўстаноўлена ў лістападзе 1917 года. Мясцовыя жыхары аказалі ўпартае супраціўленне белапалякам. Член Рэўваенсавета Заходняга фронту Уншліхт у сваім дакладзе Рэўваенсавету рэспублікі пісаў: «Пры захопе праціўнікам вёскі Казулічы, што за 12 вёрст на поўнач ад Бабруйска, жыхары вёскі ўступілі ў няроўны бой з ворагам, на падтрымку ім была выдзелена рота»... У ліпені 1935 года старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў уручыў мясцоваму калгасу імя Дзяржынскага акт на вечнае карыстанне зямлёй... 82 жыхары вёскі ўдзельнічалі ў Айчыннай вайне, 54 з іх не вярнуліся з фронту.

А вось, чытаю, зусім старажытная вёска — Бяседавічы Хоцімскага раёна. Заснавана ў XIV стагоддзі. Ранейшая назва вёскі — Бесавічы. Савецкая ўлада ўстаноўлена тут у лістападзе 1917 года. 22 кастрычніка 1918 года арганізавана першая на Беларусі камуна, у 1919 — адна з першых у рэспубліцы камсамольскіх арганізацый. У 1925 годзе ў Бяседавічах пабудавана электрастанцыя, якая дала святло не толькі вёсцы, а і Хоцімску.

— Я чытаю ўсё гэта, Станіслаў Віктаравіч, і думаю, якое шчасце, што захаваліся архіўныя дакументы, якія дазваляюць прасачыць блізкую і далёкую гісторыю нашай зямлі.

С. Марцэлеў:

— Ведаеце, большая частка архіваў у час вайны была эвакуіравана і захавалася. Але мы звяртаемся не толькі да архіўных дакументаў. Захавалася нямала апісанняў Беларусі, яе жыхароў, абрадаў, эканомікі, актавых кніг губерань і іншая гісторыка-эканамічная літаратура. Вось і зараз, перада мной, бачыце, старое выданне, дзе я знайшоў нямала цікавейшых фактаў, звязаных з гісторыяй нашай рэспублікі.

Станіслаў Віктаравіч перадае мне важкі том у цвёрдай вокладцы. Чытаю: «Запіскі паўночна-заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства. 1911 год».

Гартаю цяжкія, трошкі пажоўклыя лісты. Увагу прыцягвае артыкул «Знешні быт быхаўскага беларуса». Што і казаць, чытаецца ўсё гэта сёння з усмешкай. «Вырошчваюць гародніну беларусы на градах рыдлёўкай, а бульбу сахой». Або: «Вясной да дня Георгія не ставяць і не рамантуюць агароджу, бо баяцца няўдач і няшчасця ў гаспадарцы». Заўважыўшы маю ўсмешку, Станіслаў Віктаравіч кажа, што ўсе гэтыя факты, якія раскрываюць старыя звычаі, тагачасную сялянскую эканоміку, культуру, знаёмяць з этнаграфіяй, дапамагаюць у рабоце над матэрыяламі выдання.

С. Марцэлеў:

— Паглядзіце вытрымкі з актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерній за другую палову XVI стагоддзя. Вельмі цікава. «Падпіска магілёўскага мешчаніна Івашкі Жака з абавязацельствам не красці, гарэлкі не піць і людзей невінаватых не лаяць». А год вунь які — 1577! Або вось яшчэ: «Заява гарадскога магілёўскага пастуха Васкі Ігнатовіча «Же за паствою его корова Оксёнова здохла».

Гэтыя дэталі, вядома, застануцца па-за рамкамі выдання, але, бачыце, як яны перадаюць каларыт таго часу. Адным словам, праца над «Гарадамі і вёскамі Беларусі» патрабуе вялікай навуковай скрупулёзнасці, разнастайных ведаў.

Мне застаецца падзякаваць за цікавую і змястоўную гутарку.

Інтэрв'ю ўзяў М. ЗАМСКІ.

БЫЦЬ СААЎТАРАМ НАРОДА

Споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння Крыш'яніса Барона (1835—1923), буйнейшага латышскага фалькларыста, пісьменніка, публіцыста, барацьбіта супраць прыгнёту нашчадкаў крыжакоў-феадалаў у Прыбалтыцы, аднаго з выдатных прагрэсіўных дзеячаў латышскага народа.

Яшчэ ў 1857 годзе ён, студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Дэрпцкага універсітэта, заклікае «вучоных і адукаваных латышоў» выяўляць і збіраць помнікі народнай творчасці, «каб гэтая каштоўнейшая памяць нашых продкаў не загінула».

Па прычыне беднасці Крыш'яніс Барон пакідае універсітэт, рэдагуе ў Пецярбурзе першую прагрэсіўную латышскую газету, друкуе свае першыя апавяданні. Пасля працуе хатнім настаўнікам у Варонежскай губерні, потым — выкладчыкам гімназіі ў Маскве.

У 1893 годзе К. Барон пераязджае ў Рыгу. На той час у яго архіве было назапашана 150 тысяч дайнаў—латышскіх народных песень. Праз год выходзяць з друку першыя сшыткі першага тома. І толькі ў 1915 годзе Расійская акадэмія навук, якая ўзяла на сябе публікацыю ўсіх астатніх тамоў, скончыла выданне «Латышскіх дайнаў»: у шасці тамах (8 кніг) надрукавана 217996 тэкстаў.

У 1916 годзе Аспазія і Райніс пісалі фалькларысту:

«...Вы ведаеце, што гэты народ, які 700 гадоў цярпеў самае жорсткае рабства і нечалавечы прыгнёт, цяпер ужо не загіне. Нашу мову могуць прымусіць змоўкнуць ці могуць псаваць яе на чужацкі манер, але ў вушах нашых гучаць сабраныя Вамі песні, і яны адгукнуцца ў нашых сэрцах. Ад нас можна адняць усё, але толькі не нашу любоў».

Гэты багацейшы збор фальклору служыў і прадаўжае служыць многім пакаленням латышскіх пісьменнікаў і мастакоў. На аснове «Латышскіх дайнаў» Крыш'яніса Барона, напрыклад, створаны і многія п'есы самога Яніса Райніса.

Імя Сівавалосага Бацькі, як называлі К. Барона, увекавечана многімі мемарыяльнымі знакамі, яно нададзена многім культурным установам і вуліцам латышскіх гарадоў. Імя вялікага фалькларыста паступова ўваходзіць і ў культурны ўжытак беларусаў. Яшчэ ў 1935 годзе быў падрыхтаваны рукапісны зборнік перакладаў латышскіх дайнаў Пятром Масальскім (1905—1985), урадженцам беларуска-латышскага пагранічча. Але ва ўмовах ульманісаўскай рэакцыі ў буржуазнай Латвіі дайны па-беларуску так і не былі надрукаваны, культурна-асветная дзейнасць беларусаў у Латвіі была спынена. Пераклады П. Масальскага пабачылі свет толькі ў «Далягляда́х» за 1979 год. Незадоўга перад смерцю П. Масальскі зноў звярнуўся да «Латышскіх дайнаў» Крыш'яніса Барона. І вось сёлета ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» здадзены ў друк томік «Дайнаў». Рэдактар перакладаў —В. Сёмуха. Рэцэнзаванне і прадмова — супрацоўніцы Акадэміі навук Латвійскай ССР М. Абалы.

«Сучасныя латышскія фалькларысты лічаць,—піша М. Абала,—што ў латышоў, як і ў многіх іншых народаў, эпічных песень ніколі не было, таму

СТАРОННІ ЎСПАМІНАЎ

АБАВЯЗАК ПАМЯЦІ

ЗДАЕЦЦА, я застаўся адзіны, хто помніць Янку Нёманскага ў яго апошнія тыдні жыцця...

Вясной трыццаць сёмага года я, студэнт-рабфакавец, трапіў у бальніцу. Палата была чалавек на дзесяць. Мае аднапалатнікі былі людзі розных прафесій і заняткаў: выкладчыкі, калгаснікі, інжынеры, студэнты. Знаходзіліся там і два паэты: хворы на белакроўе Янка Туміловіч і малады студэнт педінстытута, які ўжо добра заявіў пра сябе ў перыядычным друку. У час палёгкі, калі адпускаў боль, Туміловіч і студэнт чыталі вершы — і свае, і чужыя, — якіх яны ведалі вельмі багата. Цікавыя, добрыя людзі былі мае аднапалатнікі, шмат чаму я, васемнаццацігадовы хлопец, ад іх навучыўся і пазнаў.

Насельнікі ў палаце мяняліся, адны прыходзілі, другія выходзілі. Аднойчы прывялі мужчыну гадоў за сорак, дзябёлага, з прыемным інтэлігентным тварам. Я яшчэ не ведаў, хто ён, кім працуе, якую мае адукацыю, але ўгадаў адразу ж у ім асобу шчырую, адкрытую і здагадаўся, што ён займае нейкую высокую пасаду. Не, ён, як высокі начальнік, не вызначыў дыстанцыю паміж сабой і намі, не даў зразумець, каб да яго адносіліся згодна з ягоным рангам. Аднак не было ў ім і той штучнай паблажлівасці і вымушанага панібрацтва, якое звычайна выяўляецца ў паводзінах тых высокіх службоўцаў, якія часова апынуліся ў нялёгкіх абставінах. Ён з кожным паздароўкаўся за руку, паціскаючы яе шчырым мяккім поціскам. А калі загаварыў па-беларуску, я вырашыў, што ён выкладчык мовы і літаратуры ў якім-небудзь інстытуце, можа, прафесар-філолаг, і спытаў у яго пра гэта. Ён неяк невыразна, нават як бы саромеючыся, адказаў, што мова і літаратура — яго кроўнае захапленне, але займаецца зусім іншым, далёкім ад літаратуры.

Ён назваўся Пятровічам Іванам Андрэевічам.

Прозвішча гэта мне і іншым нічога не гаварыла.

Пазнаў яго Янка Туміловіч.

«Іван Андрэвіч, — сказаў ён, — вы пісьменнік Янка Нёманскі».

Вось тут я і ўспомніў, што ёсць такі пісьменнік і што творы яго чытаў. Я пахваліўся, што ў мяне дома ёсць кніжка ягоных апавяданняў, і асабліва мне падабаецца «Рамэа і Джульета на Беларусі» і «Над Кроманнію».

Была потым гаворка пра літаратуру, роспыты пра тое, што новае ім напісана, чаму даўно нічога не з'яўляецца з яго твораў у друку.

Палата наша была цесна застаўлена жалезнымі ложкамі, праход у ёй вузкі, і хадзіць па ім маглі толькі па адным і па чарзе. Нёманскі хадзіў па гэтым праходзе больш за ўсіх, склаўшы на грудзях рукі, са скамянелым засяроджаным тварам, заглыблены ў свае цяжкія думы. Ён думаў, канечне, як і ўсе мы, пра тое, ці пашанцуе яму выйсці з гэтай пакуменце, прачытаным Леніным, ёсць правадыровы паметкі.

А потым Нёманскі служыў у Чырвонай Арміі, абараняў заваёвы рэвалюцыі. Вярнуўся на радзіму толькі ў 1922 годзе, і ўсе свае сілы, веды, вопыт аддаў справе сацыялістычнага пераўтварэння рэспублікі. Яго выбралі членам ЦВК БССР, ён займаў розныя адказныя пасады, а ў апошнія гады быў на-

латы дамоў, ці злітуецца над ім лёс, ці паспее ён зрабіць тое, чаго не змог зрабіць раней.

А зрабіў Нёманскі за тыя свае сорак сем гадоў шмат.

Нарадзіўся ён 12 красавіка (паводле нов. ст.) 1890 года ў вёсцы Шчорсы Навагрудскага раёна на Гродзеншчыне ў сялянскай беднай сям'і. Рана ён пазнаў нястачу і працу. Скончыўшы ў Нясвіжы настаўніцкую семінарыю і папрацаваўшы настаўнікам, паступіў у Петраградскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Аднак вучобе перашкодзіла вайна. Яго прызвалі ў армію, дзе пасля школы прапаршчыкаў атрымаў афіцэрскае званне. Паваяваў да Кастрычніцкай рэвалюцыі і зноў вярнуўся да вучобы ва універсітэце. Толькі вучыцца да канца не выпала. Пачалася ягоная актыўная грамадска-культурная і палітычная дзейнасць. Ён становіцца ў Беларускім нацыянальным камітэце сакратаром Культурна-асветнага аддзела, які ўзначальваў тады Браніслаў Тарашкевіч. Займаў і іншыя пасады. Разам з Цішкам Гартным выдаваў беларускую газету «Дзянніца», дзе друкаваліся творы Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Цішкі Гартнага і іншых беларускіх культурных і грамадскіх дзеячаў. Знаходзілі там месца і артыкулы Янкі Нёманскага — так ён іх тады падпісваў.

У ліпені 1918 года на з'ездзе бежанцаў Беларусі Іван Андрэевіч Пятровіч быў выбраны сакратаром з'езда. Пад пасланым Леніну прывітальным адрасам і запрашэннем значыўся і подпіс Пятровіча. На тым да-

меснікам старшыні Дзяржплана БССР.

З 1928 года Нёманскі — акадэмік АН БССР. Як вучоны ён вызначаўся глыбокімі навуковымі працамі па пытаннях эканомікі, гісторыі і культуры Беларусі.

Першыя навуковыя публікацыі Янкі Нёманскага з'явіліся ў дваццаць другім годзе, і потым на працягу некалькі гадоў яго творы друкаваліся ў часопісах. Выйшлі і зборнікі апавяданняў.

Пасля трыццатага года ён як пісьменнік змоўк, нідзе не друкаваўся і не перавыдаваўся. Нёманскі гэта растлумачыў тым, што не было для літаратуры часу—яго забіралі служба і навука. І яшчэ пра адну прычыну свайго маўчання сказаў нам: «Вельмі нездаровая і небяспечная валтузня адбываецца ў нашай літаратуры. Я не хацеў займець долю многіх пісьменнікаў (ён іх назваў). Дзе яны цяпер? Які іх лёс?»

Выказаўся вельмі рэзка пра тых, хто ў свой час кіраваў літаратурным працэсам і нападаў на Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага. «Тое, што гэтыя аглабельшчыкі-вульгарызатары білі бязлітасна сумленныя таленты, гэта, бясспрэчна, бяда. Але ж яшчэ большай бядой было тое, што такое біцё, беспадстаўнае абвінавачванне ў розных грахах прымушала многія таленты прыстасоўвацца і паддавацца іх камандам і ўказцы, і страчвалі многае, з-пад іх пяра выходзілі бляклыя падзёнкі. Бандыт Бэндэ (Іван Андрэевіч яго толькі так і называў), ацэньваючы творчасць Купалы, сцвярджаў, што самае лепшае, што той напісаў, гэта паэма «Над ракою Арэсай», і фактычна закрэсліваў зробленае ім раней».

Цёпла і ўсхвалявана Іван Андрэевіч расказаў пра сваю дружбу з Цішкам Гартным, Янкам Купалам, Якубам Коласам. Вельмі высока цаніў Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Дубоўку, шкадаваў, што яны пазбаўлены магчымасці ўдзельнічаць у літаратурным жыцці. Гэтых і іншых пісьменнікаў характарызаваў коратка: «Добрыя людзі, асобы».

Часам Іван Андрэевіч сціскаўся, падоўгу ляжаў, моўчкі гледзячы ў акенца, і тады яго стараліся не турбаваць. Аднойчы ён здзівіў мяне нечаканарэзкай зменай настрою. Ляжаў вось так, маўчаў, потым рыўком устаў і моцна ўголас прачытаў: «О Беларусь, мая шыпшына, зялёны ліст, чырвоны цвет! У ветры дзікім віхры не загінеш, чарнобылем не зарасцеш!»

«Гэта вы цяпер сачынілі?»— спытаў я.

«Гэта верш Уладзіміра Дубоўкі».

Пра Дубоўку я чуў і сёе-тое з ягоных вершаў чытаў, а гэты не ведаў. «Такі паэт маўчыць,— з горыччу сказаў пра яго Іван Андрэевіч. — І ці загаворыць калі?»

Ён расказваў пра розныя выпадкі са свайго жыцця, пра свой край, пра Нясвіжскую семінарыю.

«Помню невялікі лясок недалёка ад маіх Шчорсаў. Колькі там было баравікоў! І якое гэта хараство хадзіць з кошыкам і збіраць грыбы. Я перад кожным баравіком на калені станавіўся. Станеш, сцізорыкам чыркнеш па карэньчыку, возьмеш у руку і любуешся».

«Калі хто з вас не вадзіў коней на начлег, той многае страціў у сваім дзяцінстве. Ноч, вогнішча палае, бясконцая гаворка, смех... Світанак, туман на лузе... Устанеш, ідзеш да коней, каб гнаць у вёску, а з туману толькі твая галава тырчыць... Ты быццам плывеш у гэтым тумане». Ён расказваў гэта з радасцю, як бы вярнуўшыся зноў у сваё дзяцінства, на той начлег.

«Я камандзірам быў у грамадзянскую. Ваяваў на поўначы. Неяк з белагвардзейскіх трафеяў я выбраў сабе англійскія жоўтыя чаравікі з крагамі. Абуў — шыкоўна, няма ні ў каго такога абутку ў батальёне. У нейкай вёсцы на начлег спыніліся, па хатах разышліся. Разуўся я і заснуў. А ўночы страляніна ўсчалася. Ускочыў і ніяк не магу зладзіць з тымі крагамі. Схапіў іх пад паху і бягом на вуліцу. Потым на боты тыя крагі памяняў».

«Неяк у палон узялі белых салдат. Адзін палонны падбягае да мяне як да камандзіра і вітае: «Здравія жалаю, ваша благародзь! Не пазнаёце мяне? Разам германцаў білі». Пазнаў, салдат той у маёй роце служыў. Добры салдат быў. «Што ж ты, — кажу яму, — бядняк, а за буржуяў ваюеш?» — «Дык я ж у чатырнаццатым прысягу на вернасць ацечеству прыняў. Як жа я магу здрадзіць прысязе?» Прыйшлося з ім правесці палітгутарку. Тыя палонныя потым у нашу армію ўступілі».

Часта расказваў пра сваіх дзяцей. «Як яны там, мае родныя? Хоць бы не хварэлі. І каб вывучыліся, калі са мной што кепскае здарыцца», — сказаў і ўздыхнуў цяжка, і было відаць, што гэтыя ўспаміны для яго вельмі горкія.

Пра сына гаварыў: «Вельмі любіць чытаць. Раман Паўленкі «На Усходзе» (кніга была тады вельмі папулярная. — **В. Х.**) некалькі разоў прачытаў і напісаў у выдавецтва, каб яе перавыдалі вялікім тыражом».

Хваліўся сваёй бібліятэкай, што яна ў яго багатая, толькі прыйшлося сёе-тое з яе павыкідваць, бо «аўтары тых кніг не нашымі людзьмі прызнаны».

Янку Туміловічу і паэту-студэнту казаў: «Хлопцы, не лянуйцеся, сачыняйце. Паэты ж могуць тварыць і не за пісьмовым сталом».

Хлопцы і сачынялі, чыталі потым тыя свае вершы. І як дасведчана, з тонкім густам, узважваючы кожнае слова, радок, рыфму, рабіў аналіз Іван Андрэевіч праслуханых вершаў! У вершах студэнта, помню, былі такія радкі: «Тут Мефістофель, стары чорт, папаў у містыкі палон». Верш называўся «У старой бібліятэцы».

«Гэта ўжо занадта, — сказаў ён пра гэтыя радкі. — Чорт у палоне містыкі? Чорт і ёсць сама містыка».

«Ах, мне б зараз за свой стол! — неяк усклікнуў ён. — І ад усяго адключыцца, і толькі пісаць, пісаць... А задум у мяне багата—раман, аповесць. Думаю, што ў недалёкім будучым зменяцца многія абставіны і ацэнкі ў нашым жыцці, тады і вазьмуся за раман».

Нёманскага часта бралі на працэдуры, розныя кансіліумы, рыхтавалі да аперацыі. Вяртаўся ён адтуль то прыгнечана-змрочны, то ажыўлена-вясёлы.

што кароткія песні болей адпавядалі іх укладу жыцця і гістарычным абставінам, калі старажытныя плямёны на працягу стагоддзяў жылі адасоблена...»

45 гадоў збіраў і сістэматызаваў «народны архіў» Крыш'яніс Барон. А на сённяшні дзень дайнаў запісана больш як 1 мільён 200 тысяч. «Таму прынята гаварыць,—зазначае М. Абала,—што ў кожнага латыша свая песня».

Адзначаючы 150-гадовы юбілей сааўтара паэтычных бурштынак народа, мы рады, што ў сваёй мове можна адчуць узнёслую і пяшчотную душу песні-суседнішы:

У дзяўчат за пазухай
Белыя буханачкі;
Не на ежу, не на продаж,—
Малайцоў пацвельваць.

●

Татка вінны, а не мамка,
Што хаджу, спяваючы:
На калыску жэрдку высек,
Дзе салоўкі шчоўкалі.

С. ПАПАР.

Аднойчы пасля такога вяртання сказаў:

«Пагаварылі, распыталі, думаю, што хутка выпішуць».

«Тады і возьмецеся за раман?» — спытаў я.

Ён заўсміхаўся: «За гэтыя тыдні ў палаце колькі сюжэтаў прыйшло ў галаву! Колькі вобразаў! Абавязкова засяду пісаць».

Вельмі ўжо верыў ён у шчаслівы канец і кожны дзень чакаў, што яго вось-вось выпішуць, і ён удыхне не бальнічнае, а вольнае паветра і зноў акунецца ў сваю работу, адказную, клопатную, так патрэбную краіне.

«Я яшчэ не скончыў распрацоўку перспектыўнага планавання прамысловасці рэспублікі, — бедаваў ён, — і перад акадэміяй у даўгу». Вучоны, дзяржаўны і культурны дзеяч, чалавек з высокімі думкамі, ён жыў і там, у палаце, справамі Дзяржплана, расказваў, якая багатая будучыня чакае рэспубліку ў бліжэйшыя гады, быў перакананы, што ў Беларусі знойдуць і соль, і нафту, і яшчэ шмат якія выкапні.

У маёй памяці Іван Андрэевіч так і застаўся мужным, упэўненым у справядлівасці і розуме партыі, верным і адданым яе сынам, верыў у самае лепшае, што нас усіх чакала. З яго эрудыцыяй, вопытам, культурай яму пад сілу было намнога большае, чым займаўся дагэтуль. Ён быў самародкам, талентам. Быў асобай!

Ён зайшоў да нас у белай кашулі, і я помню яго толькі ў ёй. Было лета, потым яно скончылася, а Янка Нёманскі, здаецца, усё насіў і насіў тую ж самую белую кашулю. А, можа, яму яе мянялі на бальнічную, таксама белую?

Усе мы верылі ў выздараўленне. Аднак не ўсіх нас напаткаў шчаслівы лёс. Янка Туміловіч памёр ад белакроўя. Памерлі і яшчэ некалькі з тых аднапалатнікаў.

Не здзейсніліся спадзяванні і Янкі Нёманскага. Не вярнуўся ён да свайго пісьмовага стала. Застаўся там назаўсёды. Лёс да яго быў неміласэрны. 29 кастрычніка адбылася аперацыя, а на другі дзень яго не стала. Нічога ён не паспеў зрабіць з таго, пра што думаў, планаваў, пра што марыў.

Летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла ў свет кніга яго прозы — усё, што ўдалося сабраць. Трэба сказаць вялікае дзякуй укладальніцы гэтай кнігі Лідзіі Савік, якая напісала і вельмі грунтоўную, прачулую прадмову. Раман, аповесць, апавяданні, сабраныя ў кнізе, сведчаць, што мы мелі ў асобе Янкі Нёманскага пісьменніка таленавітага, цікавага, якому, на жаль, не давялося па-сапраўднаму раскрыць свой талент.

Васіль ХОМЧАНКА.

Варлен Леанідавіч БЕЧЫК

13 лістапада г. г. на 47-м годзе жыцця, пасля цяжкай хваробы памёр вядомы беларускі крытык і літаратуразнаўца, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура», член КПСС Варлен Леанідавіч Бечык.

В. Л. Бечык нарадзіўся 25 чэрвеня 1939 года ў Астрашыцкім Гарадку Мінскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Плісскай сярэдняй школе Смалявіцкага раёна. Скончыў аспірантуру пры БДУ імя У. І. Леніна, працаваў у рэдакцыях газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Неман». З 1972 года—навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР, з 1981 года і да апошніх дзён жыцця—намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кандыдат філалагічных навук.

Свае першыя крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы Варлен Бечык апублікаваў у 1959 годзе. Яны адразу ж звярнулі на сябе ўвагу глыбінёй думкі, шырынёй погляду, выверанасцю і дакладнасцю ідэйных і эстэтычных ацэнак. Беларуская літаратура, перш за ўсё паэзія, у асобе Варлена Бечыка набыла свайго адданага працаўніка і палымянага прапагандыста. Новае, таленавітае, цёплае слова сказаў В. Бечык пра творчасць Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Хадыкі, А. Дудара, П. Броўкі, П. Панчанкі, М. Танка, В. Быкава, М. Лужаніна, А. Пысіна, пра многіх сваіх равеснікаў. З-пад яго пяра выйшлі кнігі: «Свет жывы і блізкі» (1974), «Шлях да акіяна. Кніга пра паэзію Аркадзя Куляшова» (1981), «Прад высокаю красою» (1984).

Ён быў адным з аўтараў «Истории белорусской советской литературы», укладальнікам, аўтарам прадмовы і каментарыяў да аднатомніка «Аркадий Кулешов», выбранага У. Маякоўскага, пераклаў на беларускую мову раман казахскага пісьменніка І. Есенберліна «Небяспечная пераправа».

Варлен Бечык — прадстаўнік пакалення, апаленага вайной, які назаўсёды ў жыцці і творчасці захаваў удзячную памяць пра подзвіг савецкага салдата-вызваліцеля. Ён быў чалавекам шырокай эрудыцыі, рэдкай абаяльнасці, служыў літаратурнай справе шчыра і беззапаветна.

Светлая памяць пра В. Л. Бечыка—таленавітага пісьменніка-камуніста, самаадданага працаўніка, добразычлівага і чулага таварыша назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто ведаў яго і працаваў з ім.

А. Т. Кузьмін, Н. М. Мазай, І. І. Антановіч, С. Я. Паўлаў, М. І. Дзялец, К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва), І. А. Брыль, В. У. Быкаў, П. Е. Панчанка, Я. І. Скурко (Максім Танк), І. П. Шамякін, А. М. Адамовіч, Р. І. Барадулін, Г. М. Бураўкін, А. І. Вярцінскі, Л. І. Гаўрылкін, Н. С. Гілевіч, А. С. Грачанікаў, А. А. Жук, С. І. Законнікаў, В. В. Зуёнак, В. А. Каваленка, В. Ф. Карамазаў, К. Ц. Кірэенка, Ц. В. Крысько (Васіль Вітка), А. П. Кудравец, А. А. Лужанін-Каратай (Максім Лужанін), І. Я. Навуменка, Н. Е. Пашкевіч, Б. І. Сачанка, І. Г. Чыгрынаў, М. Ф. Дубянецкі, С. А. Андраюк, В. С. Палтаран.

ЖУРБОТНАЕ СЛОВА

Не стала яшчэ аднаго паэта на зямлі беларускай мовы, на гонях роднай культуры. Так, так, менавіта — Паэта. Студэнт, настаўнік, працаўнік прэсы, навуковец, выдавец — толькі жыцейскія пасады Паэта, які жыў паэзіяй, шчырэў у імя паэзіі, спрыяў развіццю і прызнанню паэзіі, і згарэў заўчасна, каб жыла наша паэзія.

Ён не друкаваў сваіх вершаў, афіцыйна называўся крытыкам, але мысліў паэтычна, свет успрымаў вачыма паэта. Яму рупіла даказаць, пераканаць сплжыўца паэтычнага слова — недаверлівага чытача, што наша родная паэзія ў сваіх лепшых узорах можа на роўных гаварыць з любой паэзіяй краіны. Беларускае паэтычнае слова чулася яму ў кантэксце ўсесаюзнай і сусветнай паэзіі.

Самы дасведчаны, самы апантаны, самы пераканаўчы знаўца паэзіі вонкава выглядаў непрытульна, засценліва, натуральна далікатна. Перад ім было страшнавата і сорамна чытаць вершы, настолькі ўважліва і пранікнёна слухаў іх, аж рабілася вусцішна. Паэту любога ўзросту мог працытаваць па памяці ягоныя ж вершы, напомніць, што і дзе гаварылася пра аўтара, падтрымліваючы думку ці палемізуючы.

Ён быў добры, але не дабрадзей, якому ўсё аднолькава, абы не турбавалі. Не злічыць усіх спрэчак, баёў супроць глянцавітай шэрасці, прыблізнай умоўнасці, супроць лагоднай і навукова-агрэсіўнай графаманіі. Па абавязку сумлення і па абавязку службы ён убіраў у сябе гэтулькі выдаткаў літаратурнай прадукцыі, каб лягчэй дыхалася сапраўднай паэзіі. Інтэлігент у другім пакаленні, дзіця ваенных пакут і пасляваенных нястач, спрачаўся заўсёды паважліва, доказна, высакародна.

Калі ён браўся укладаць які зборнік ці напісаць прадмову, дык рабіў гэта настолькі сумленна, настолькі самаадданa, што пасля яго нельга было, як любіў некалі казаць Уладзімір Караткевіч, і коску з месца зрушыць.

Ён заўсёды гарнуўся да паэтаў, а паэты ўдзячна гарнуліся да яго. Са студэнцкіх гадоў. З 1961 года, напрыклад, стаіць у памяці вечар паэзіі ў Плісскай сярэдняй школе на Смалявіччыне, дзе выкладаў беларускую і рускую мовы малады настаўнік, свежы выпускнік БДУ імя У. І. Леніна Варлен Леанідавіч Бечык. Сымон Блатун, Міхась Стральцоў і я вясёлай электрычкай ехалі да торфапрадпрыемства «Чырвоны сцяг», дзе сустракаў нас як падлётак-падлетак наш ужо вядомы ў самай паважнай прэсе крытык. Пасля было шмат вечароў паэзіі на розных, як цяпер прынята гаварыць, узроўнях, але той вечар у Смалявіцкай школе запомніўся надоўга і шчырай гаворкай, і спелымі яблыкамі ў няўтульным пакойчыку маладога спецыяліста. Калі б ні ехаў гэтым маршрутам электрычкі, убачыўшы станцыйку «Чырвоны сцяг», адразу прыгадваю маладую душэўнасць аднагодкаў.

І потым былі сустрэчы, былі гутаркі, была трапяткасць адчування святла спагады, якое ішло ад самага паэтычнага коытыка, што годна сведчыў глыбіню думкі на самых высокіх форумах. У выдавецтве «Мастацкая літаратура», дзе Варлен Леанідавіч Бечык як намеснік галоўнага рэдактара вёў паэтычны паток, было прыемна і пазнавальна-адукацыйна сустракацца па рабоце з найдушэўным чалавекам, уражваючыся і здзіўляючыся і памяці ягонай, і ведам ягоным, і запасу духоўнай энергіі і юнацкасці светаўспрымання. Не ўказваў, а падказваў, не крэсліў рукапісы, а на лацканах папкі рабіў паметкі старонак, дзе нешта трэба было паправіць, удакладніць, скасаваць. Не забываўся нічога.

Яго высока цанілі і цэняць Рыгор Бярозкін і Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка і Генадзь Бураўкін. Кніга пра паэзію Аркадзя Куляшова ўбачыла свет пры жыцці Варлена Леанідавіча. Апошнім клопатам была кніга пра выдатнага паэта нашых дзён Пімена Панчанку.

Гэта ж зусім нядаўна заходзіў у нашу рэдакцыю Варлен Леанідавіч. Перад бальніцай развітваўся не надоўга з усімі намі, няўпэўнены і неяк вінавата ссутулены. Хоць вінаваты ён толькі застаўся перад адной вечнасцю і то не дужа. Вінаватыя мы ўсе, што не ўбераглі, не ўратавалі, на адны плечы ўзгрузіўшы непамерна цяжкую ношку.«Свет жывы і блізкі» застаўся ў даўгу перад чыстай душой.

Вершам, прысвечаным памяці нашага Варлена Бечыка, і дазволю сабе закончыць журботнае слова:

Шчодрая смерць
Дазваляе жывому
За хвіліну маўчання
Цяжка ўзважыць наноў
Марнасць мар,
Дзён ахвярнасць,
Нязбытлівасць сноў,
Думку здалёку
Вярнуўшы дадому.

Скваапная смерць
Выбірае спакону
Прыгажосць з прыгажосці,
Дабрыню з дабрыні,
І жудасна робіцца
Чалавечай ражні
Ад лютасці скону,
Ад позірну кону.

Злосная смерць
Не нацешыцца з сілы,
Б'юцца жалем аб века
Камякі, медзякі,
А не могуць нічым
Адкупіцца вякі
Ад нахабна-халоднай магілы.

Рыгор БАРАДУЛІН.

ЯК АГОЛЕНЫ НЕРВ

Табе ўжо — анічога, ані слова не скажаш, дружа мой Варлен. Ужо толькі — пра цябе, сабе і іншым...

Чаму смерць так бязлітасна забірае лепшых тваіх работнікаў, жыццё? Вось і яго яна забрала гэтак нечакана і гэтак недаравальна заўчасна. Яго, хто так шчодра быў адораны такім яркім, такім адметным талентам, такім чуйным слыхам і такім пільным зрокам, такім адмысловым адчуваннем і разуменнем паэзіі жыцця і паэзіі слова.

Як аголены нерв адчувае самы непрыкметны, самы асцярожны дотык, так і яго тонкая мастакоўская душа імгненна, на адлегласці адчувала водар сапраўднай паэзіі і людзь улоўны тлен фальшу. І жылі ў ягонай душы высокая сумленнасць і непарушная прынцыповасць, і ніколі не ішла яна на кампрамісы, калі справа тычылася лёсу ці паасобных з'яў нашай паэзіі, і была яна чыстай і насцеж расчыненай на чалавечую дружбу і прыязнасць.

Ён сам увесь быў, як той аголены нерв, і жыў з адкрытым сэрцам, і яно, добрае, спагадлівае, чулае, вельмі датклівае і лёгка ранімае, заўжды адгукалася на чужую радасць і балюча сціналася ад чужога болю, крыўды, гора.

Асірацела наша крытыка і асірацела наша паэзія, страціўшы свайго самага глыбокага, пранікнёнага, сумленнага, аўтарытэтнага і непадкупнага, улюбёнага даследчыка, вытлумачальніка, сувязнога між ёй і чытачом.

Асірацеў і я. У мяне быў таварыш, надзейны сябар. Цяпер яго — няма. Цяжка ў гэта паверыць. Нават у самым страшным сне не магло і прысніцца, што давядзецца стаяць ля яго труны...

Даруй нам усім, дарагі наш Варлен Леанідавіч, што мала аберагалі цябе і не зберaглі, і бывай.

Мікола ГІЛЬ.

Саюз пісьменнікаў БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці пісьменніка, намесніка галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» БЕЧЫКА Варлена Леанідавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў выдавецтва «Мастацкая літаратура» глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці намесніка галоўнага рэдактара, члена рэдакцыйна-выдавецкага савета, пісьменніка Варлена Леанідавіча БЕЧЫКА і выказвае спачуванне сям'і, родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» глыбока смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю былога супрацоўніка газеты, вядомага беларускага крытыка і літаратуразнаўцы, намесніка галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» Варлена БЕЧЫКА.

Калектыў штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы рэдакцыі НАДУМОВІЧ Зінаідзе Кандратаўне ў сувязі з вялікім горам—заўчаснай смерцю МУЖА.

СЛОВА РАЗВІТАННЯ

Памёр Аляксандр Аляксандравіч Даброцін—вядомы акцёр, рэжысёр, педагог.

А. А. Даброцін доўгі час працаваў у тэатрах РСФСР, у 1958 годзе яму была нададзена ганаровая годнасць заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР.

У 1966 годзе А. А. Даброцін быў запрошаны ў Дзяржаўны рускі тэатр БССР імя М. Горкага. На гэтай сцэне ў 1967 годзе ён працаваў над вобразам У. І. Леніна ў спектаклі «Шостае ліпеня» М. Шатрова. На працягу чатырох гадоў А. А. Даброцін узначальваў мастацкае кіраўніцтва Рускага тэатра БССР. У якасці галоўнага рэжысёра ажыццявіў пастаноўкі спектакляў «Любоў Яравая» К. Транёва, «Ворагі» М. Горкага, «Дурнічка» Лопэ дэ Вэга, «Вандроўнік без багажу» Ж. Ануя і іншых. Працаваць з ім было надзвычай цікава, ён добразычліва ставіўся да акцёраў, заўжды верыў у іх поспех.

Шмат сіл А. А. Даброцін аддаў педагагічнай дзейнасці, выхоўваючы моладзь у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце і Мінскім інстытуце культуры.

За поспехі ў развіцці тэатральнага мастацтва, выкладчыцкую дзейнасць А. А. Даброцін ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Усе, каму пашчасціла жыць і працаваць з А. А. Даброціным—таленавітым, прынцыповым, чулым да часу мастаком і добрым, аптымістычным чалавекам, — назаўжды захаваюць светлую памяць пра яго.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

ВЫСТАЎКІ

ДАКРАНАННЕ... ДА ЗНАЁМАГА

ЗВЫЧАЙНА, калі на выстаўцы сустракаеш работы ў нечым знаёмыя, мастацка - эстэтычнае задавальненне атрымліваеш толькі ў тым выпадку, калі яны даюць мажлівасць прасачыць эвалюцыю творчага шляху аўтара, адчуць, як адбывалася фарміраванне і развіццё яго таленту. І абавязкова хочаш убачыць нешта новае, інакш уявіць індывідуальнасць творцы будзе значна цяжэй, ён паўстане асобай па-свойму статычнай, раскрыццё даравання якой як бы стрымалася. На гэтай жа выстаўцы таксама ўсё даўно бачанае, тым не менш адчуванне такое, што з работамі сустракаешся ўпершыню. А ўсё таму, што экспазіцыя гэтая не звычайная, а III Рэспубліканская выстаўка кніжнай графікі.

Крыху пра выстаўку ў агульных словах. У экспазіцыі больш чым 300 работ, выкананых як вядомымі беларускімі графікамі, так і творчай моладдзю ў апошнія пяць гадоў. Акрамя таго, прадстаўлены і самі выданні, якія за гэты час сталі лаўрэатамі рэспубліканскіх, міжрэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў «Мастацтва кнігі». Поспехі ж у гэтым кірунку відавочныя. Толькі ў 1984 годзе на ўсесаюзным конкурсе дзевяць выданняў з нашай рэспублікі атрымалі высокія ўзнагароды. Знамянальна і тое, што ўзрасло афармленьскае мастацтва, паліграфічнае выкананне не толькі мастацкай і дзіцячай кнігі, але і грамадска-палітычнай, навукова - папулярнай літаратуры.

Аб гэтым, у прыватнасці, яскрава сведчыць «Маніфест Камуністычнай партыі», выпушчаны выдавецтвам «Беларусь». Над афармленнем выдатнага помніка марксізму працаваў адзін з самых цікавых беларускіх графікаў В. Шаранговіч. Шэсць аўталітаграфій, якія ўвайшлі ў экспазіцыю, не проста ілюстрацыі да твора, а ўдалая спроба аўтара даць менавіта сваё прачытанне «Маніфеста...», паспрабаваць глянуць на яго з вышыні сённяшняга дня, адчуўшы і ўбачыўшы адначасова шлях, пройдзены партыяй Леніна.

В. АЛЕКСАНДРОВІЧ. «Алімпіяда» І. Пташнікава.

Ю. ЗАЙЦАЎ. «Пяшчота» Г. Бураўкіна.

В. ШАРАНГОВІЧ. «Маніфест Камуністычнай партыі».

Заканамерна, што лісты часова ахопліваюць не адно дзесяцігоддзе. З іх відаць, як партыя, шукаючы дарогу да сэрца народа, у розныя гады ўзбройвалася тэарэтычна, памятаючы, што марксізм — не дагматычнае вучэнне, а вучэнне, цесна звязанае з паўсядзённасцю, з надзённымі задачамі рабочага руху. На адным з лістоў суседнічаюць партрэты сапраўдных гістарычных асоб і тых безыменных прадстаўнікоў рабочага класа, якія ў масе сваёй і складалі сам народ, галоўную рухаючую сілу гісторыі. У сюжэтную канву твора ўдала ўведзены не толькі тэкст самога «Маніфеста...», але і газеты, што неслі рэвалюцыйнаму пралетарыяту праўду аб жыцці.

Почырк аўтараў лістоў пазнаеш адразу не таму, што з многімі работамі ўжо знаёмы па кнігах. Правільней, не толькі таму, бо смела можна гаварыць аб беларускай школе графікі, у якой стала працуюць многія вопытныя майстры, якія ярка раскрываюць сваю індывідуальнасць, дасягнулі немалых поспехаў. Як, напрыклад, А. Кашкурэвіч, знаёміцца з творамі якога адно задавальненне. Выкарыстоўваючы розную тэхніку, мастак у кожным выпадку не паўтарае сябе і адначасова застаецца верным, аднойчы абранаму прынцыпу—бачыць у кніжнай ілюстрацыі найперш твор высокага мастацтва. Каляровыя акварэлі да кнігі П. Броўкі «Донька-Даніэль» уражваюць і дасканалай тэхнікай выканання, і добрым веданнем абставін самога часу. Што тычыцца графічных лістоў да «Карнікаў» А. Адамовіча, дык цяжка ўявіць выданне гэтага твора ў іншым графічна - мастацкім афармленні, настолькі ўяўленне пра «Карнікаў» сфарміравалася з імем А. Кашкурэвіча.

Гэтаксама аповесць В. Быкава «Знак бяды» сёння асацыіруецца з імем Ю. Герасіменкі - Жызнеўскага — у яго афармленні кніга пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Безумоўна, да гэтага выдатнага твора савецкай шматнацыянальнай літаратуры мастакі будуць звяртацца не аднойчы, і ўсё ж вопыт Ю. Герасіменкі - Жызнеўскага яны не змогуць не прымаць пад увагу. І каб не паўтарацца, і каб узняцца значна вышэй у асэнсаванні складанага, шмат у чым супярэчлівага свету быкаўскіх герояў.

Прыемна парадаваў і аматараў мастацтва, і аматараў літаратуры В. Александровіч, калі з яго ілюстрацыямі ў «Мастацкай літаратуры» выйшаў раман І. Пташнікава «Алімпіяда».

Прыцягваюць увагу лісты Г. Паплаўскага да «Слова пра паход Ігаравы» і яго афармленне кнігі Р. Тагора «Сад песень». Смела ўжываецца ў купалаўскія вобразы М. Басалыга — кніга «Выбранае» Янкі Купалы. Мускулістасць прозы І. Чыгрынава, яе глыбокі псіхалагізм падкрэсліваюць ілюстрацыі У. Савіча да рамана «Свае і чужынцы». А Ю. Зайцаў і М. Селяшчук сваімі творамі аспрэчваюць думку тых, хто мяркуе, што паэтычныя кнігі аформіць на высокім мастакоўскім узроўні амаль немагчыма, паколькі цяжка спасцігнуць сродкамі выяўленчага мастацтва ўмоўнасць паэзіі. Пацвярджэнне таму — кнігі «Пяшчота» Г. Бураўкіна— яе афармію Ю. Зайцаў і «Усміхніся мне» Я. Сіпакова — графічныя лісты М. Селешчука.

Асабліва маляўнічыя ілюстрацыі да кніг для дзяцей і юнацтва. Яно зразумела. Для маленькіх і юных чытачоў важна стварыць пры ўсім іншым і своеасаблівую відовішчнасць пры афармленні пэўных твораў. Найперш казак, вясёлых і дасціпных вершаў. «Ехаў казачнік Бай» Максіма Танка (мастак Ю. Зайцаў), «З рога ўсяго многа» (мастак У. Савіч), «Касмалёт» М. Ганчарова (мастак В. Славук), а таксама «Маўглі» Р. Кіплінга (мастак Н. Паплаўская), «Шыльдбюргеры» (мастак М. Казлоў) і іншыя кнігі не толькі чытаюцца, але, як кажуць, і глядзяцца, а для дзяцей гэта немалаважна. Па-сапраўднаму маляўнічы атрымаўся і аўтарскі зборнік А. Лось «Дзесяць дзён у Баку», у якім вядомая мастачка адначасова выступае і як празаік.

На выстаўцы таксама шырока прадстаўлена творчасць маладых мастакоў У. Малахава, Н. Суставай, С. Стальмашонка, Л. Зяневіча і іншых.

А. ТАНІН.

НА ЭКРАНЕ

З 18 па 24 лістапада 1985 года

18 лістапада, 17.35
ЛАЎРЭАТЫ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭЛЕКОНКУРСУ «ЗЯМЛЯ МАЯ».
Ансамбль песні і танца «ПРЫПЯЦЬ» Тураўскага гарадскога Дома культуры.

20 лістапада, 19.50
«ПАГАВОРЫМ ПРА ОПЕРУ».
У перадачы прымуць удзел музычны кіраўнік і дырыжор, народны артыст РСФСР Г. Праваторaў, рэжысёр, народны артыст БССР С. Штэйн, мастак Э. Гейдэбрэхт, выканаўцы галоўных партый народны артыст СССР А. Саўчанка, заслужаныя артысты рэспублікі Н. Казлова і У. Энкадзіёсаў, якія падзеляцца сваімі думкамі і разважаннямі аб новай пастаноўцы тэатра — оперы С. Пракоф'ева «Вайна і мір».

22 лістапада. 12.45
«СЛОВА—ПАЭЗІІ».
Свае новыя вершы чытае П. Макаль.

22 лістапада, 13.05
«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».
Вы ўбачыце плакаты маладога беларускага мастака У. Васюка. Вядучы —мастацтвазнавец В. Буйвал.

23 лістапада, 11.15
«СПАДЧЫНА».
Будзе расказана пра старажытныя беларускія рукапісы, якія захоўваюцца ў Ленінградскай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына. Вядзе перадачу навуковы супрацоўнік бібліятэкі М. Нікалаеў.

23 лістапада. 16.15
ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС «РАДЗІМІЧЫ».
Перадача з Гомеля.

23 лістапада, 17.05
«АДКРЫЦЦЁ ФЕСТЫВАЛЮ МАСТАЦТВАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ».
Выступае Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Ленінградскай філармоніі. Прагучаць творы Чайкоўскага, Брамса, Пракоф'ева.
Дырыжор—народны артыст РСФСР А. Дзмітрыеў.

23 лістапада, 18.00
ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ».
Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР. У праграме творы Гершвіна, Бернстайна. Дырыжор — І. Галаўчын.

23 лістапада, 18.50
«НАВІНКІ КНІГАРНІ».
Вядучая—паэтэса В. Аколава.

23 лістапада, 19.50
СПЯВАЕ САЛІСТ БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІІ Ф. СЕВАСЦЬЯНАЎ.
Вы пачуеце старадаўнія рускія рамансы.

24 лістапада, 13.35
«У СЯМ'І АДЗІНАЙ».
Пра літаратурныя сувязі Беларусі з Чэчэна-Інгушэціяй і Дагестанам расскажуць пісьменнікі Р. Ахматава, Ш. Арсанукаеў, А. Абубакар, Р. Барадулін.

У «КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА»

М. ВОРАНАЎ. Чалавек-рэха. Аповесці, апавяданні. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1985.—2 р. 30 к.

В. ЗУЕНАК. Досвіткавыя птушкі. Вершы і паэмы. Пераклад з беларускай. М., «Молодая гвардия», 1985. — 35 к.

ДА АПОШНЯГА ДЫХАННЯ. Вершы савецкіх паэтаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На рускай мове. М., «Правда», 1985. — 1 р. 60 к.

І. КАПЫЛОВІЧ. Над Прыпяццю-ракой. Апавяданні. Пераклад з беларускай. М., «Молодая гвардия», 1985. — 75 к.

А. КУЛЯШОЎ. Начное сонца. Раман. На рускай мове. Мн., «Юнацтва», 1985. — 65 к.

А. РЫБАК. Апошняя камандзіроўка. Аповесць, апавяданні. Пераклад з беларускай. М., «Советский писатель», 1985. —1 р.

А. СУЛЬЯНАЎ. Хаджэнне за сёмае неба. Аповесці і апавяданні. На рускай мове. Мн., «Мастацкая літаратура», 1985. — 1 р. 40 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04510 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра і выяўленчага мастацтва — 33-21-53, аддзела музыкі і кіно —33-21-53, аддзела культуры —33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.